Беларускі дзяржаўны універсітэт
ГА “Беларускае Геаграфічнае Таварыства”

# ЛЕТАПІС БЕЛАРУСКАГА ГЕАГРАФІЧНАГА ТАВАРЫСТВА

да 50-годдзя Беларускага геаграфічнага таварыства
і 70-годдзя геаграфічнага факультэта БДУ

Складальнікі: Аношка В.С.
Палюх Г.А.

Мінск
2004

Рэцэнзенты: доктар геаграфічных навук, прафесар В.П.Якушка
кандыдат геаграфічных навук, дацэнт Ф.С.Фешчанка

## Предисловие

Настоящая работа посвящена одному из самых значительных и интересных событий в географической науке Республики – деятельности Белорусского географического общества (БГО). История БГО относительно короткая. Официально оно сформировалось в 1954 г. Но вместе с тем, эта история очень длинная, так как начинается с середины XIX века с момента образования Императорского Русского Географического общества. За этот период имена ученых-белорусов: Черского, Дыбовского, Врончено, Ходько и др. приобрели известность во всем мире. Их последователи продолжают развивать географию в наши дни.

В представленной на рецензию рукописи, подробно рассматривается деятельность общества за последние 50 лет. Официально БГО до 1962 года являлось филиалом Географического общества Союза ССР.

Специальным постановлением оно получило самостоятельность под названием: Географическое общество БССР при Академии наук БССР. В период с 1954 по 1962 годы Географическим обществом руководили ученые с мировым именем: академик И.С.Лупинович, академик К.И.Лукашев. В тех нелегких условиях географы Беларуси сумели подготовить и издать монографии, научные сборники, провести серьезные научные симпозиумы и конференции с участием крупных ученых из разных регионов СССР.

Профессор В.А.Дементьев – председатель Географического общества и сменивший его на этом посту д.г.н., профессор В.А.Жучкевич сумели объединить большую группу ученых географического факультета и других вузов. Уже на первом съезде Географического общества БССР (ГО БССР) в 1975 г. был принят Устав общества, разработан его Статус, построена подробная программа деятельности. По прежнему деятельность ГО была тесно связана с Всесоюзным географическим обществом. Уже в 1976 г. в Минске состоялся Международный научный семинар по региональным экономическим проблемам с участием известных ученых Ю.Г.Саушкина, А.Т.Хрущева и др. В 1967 г. большую известность получил II симпозиум по истории озер, и в этом же году первая топонимическая конференция. Члены общества принимали активное участие в создании 12-ти томной Белорусской энциклопедии в качестве авторов статей, членов редколлегий, научных консультантов.

II съезд БГО состоялся в г.Минске в 1978 г. К этому времени были организованы отделы общества в Могилеве, Гомеле, Бресте, Гродно. В актив работы общества вошли сборники трудов, защиты диссертации. В 1983 г. в Гомеле состоялся III съезд ГО БССР. Первым президентом был избран В.С.Аношко. В 1984 г. отмечалось 30-летие со дня образования общества. После третьего съезда был утвержден новый Совет, создан ряд комиссий по профессиональной ориентации, внесены дополнения в Устав общества. В Минске и Ленинграде поднимается вопрос о создании Института географии при АН БССР, разрабатываются мероприятия, связанные с 150-летием И.Д.Черского. Активно участвуют члены общества в лекционной деятельности. В связи с успешными с разработками проблем мелиоративной географии

географы Белоруссии вошли в состав Комитета по мелиоративной географии при Ученом совете ГО СССР.

IV съезд ГО БССР состоялся в 1989 году на базе Брестского отдела, на котором в высокой должности президента единогласно избирается В.С.Аношко. Разрабатывается новый Устав. Трудно перечислить все направления в деятельности общества в эти годы: участие в Союзных съездах, открытие мемориала на родине Черского, расширение экологических работ, организация научных чтений, посвященных Г.И.Горецкому, И.С.Лупиновичу, К.И.Лукашеву; начало школьных географических олимпиад, проведение вместе с факультетом конференций молодых ученых и студенческих научных конференций

V съезд ГО в 1994 году совпал с 60-летием географического факультета БГУ Президентом общества вновь избирается В.С.Аношко, получивший высокую оценку своей работы на этом посту.

VI съезд в 1999 году состоялся на базе Могилевского отдела под девизом: "Геаграфія на парозе XXI стагоддзя". Президентом на альтернативной основе избирается В.С.Аношко. В принятом постановлении съезда поставлены весьма серьезные задачи государственного масштаба, а также проблемы, связанные с подготовкой к 50-летию общества 70-летию географического факультета БГУ. Как и раньше, поставленные задачи разрабатывались коллективно, но при непосредственном участии президента. Особого внимания заслуживает «Обращение географической общественности к Министерству образования РБ» в 2003г. В прекрасном и от всего сердца написанном обращении доказывается значение школьной географии для сохранения экологического равновесия, для формирования современной идеологии, мировоззрения и воспитания патриотизма. Беларусь этого заслуживает и мы с гордостью отмечаем, что ученики наших школ занимают высокие места на международных олимпиадах по географии. К сожалению, так и не создан Институт географии в НАН Беларуси.

Большие задачи стоят перед БГО в связи с его представительством в Международном географическом союзе (МГС).

В заключении необходимо отметить масштабность мероприятий выполняемых в течение 50 лет Белорусским географическим обществом и добрым словом вспомнить бескорыстных энтузиастов прошлого, поздравить нынешних географов и пожелать им дальнейших успехов. Хочу еще добавить, что представленная на рецензию «Летопись» потребовала от авторов большого труда и знаний. Нет сомнения, что выполненная работа представляет большой научный и познавательный интерес.

Доктор географических наук, профессор,
Заслуженный деятель науки, Лауреат государственной премии РБ,
Почетный член ГО СССР и БГО, член БГО с 1954 года
Ольга Филипповна Якушко.

## Старонкі дзейнасці Беларускага геаграфічнага таварыства

Беларусь доўгі час (1795-1918 гг.) уваходзіўшы ў склад Расійскай імперыі, прытрымлівалася усіх расійскіх правілаў грамадскага жыцця, у тым ліку і шляхам удзелу ў грамадскіх аб'яднаннях. Адным з такіх аб'яднанняў было Рускае геаграфічнае таварыства, створанае 18 жніўня 1845 г. па ініцыятыве адмірала Ф.І.Літке, акадэміка К.М.Бэра, адмірала Ф.П.Врангеля. Сярод першых 17 членаў-арганізатараў былі вядомыя вучоныя: астраном - акадэмік В.Я.Струве, географ, прафесар К.І. Арсеньеў, геолаг-акадэмік Р.П.Гельмерсен, акадэмік У.І.Даль, геадэзіст, уражэнец Магілёўскай губерні М.П.Врончанка і інш. М.П.Врончанка ўвайшоў у склад першага Савета, выбранага з 38 чалавек. Ён нарадзіўся ў м.Копысь Магілёўскай губерні ў 1801г., закончыў Магілёўскую гімназію, вучыўся ў Маскоўскім і Дзерптскім універсітэтах. Займаўся тапаграфічнымі здымкамі на тэрыторыі Беларусі, Малдавіі, Балгарыі, Румыніі, Турцыі, склаў карту Малой Азіі.

Назва Таварыства некалькі разоў мянялася: 1845-1850 гг. – Рускае Геаграфічнае таварыства, 1850-1917гг. – Імператарскае Рускае Геаграфічнае таварыства, 1917-1926 гг. – Рускае Геаграфічнае таварыства, 1926-1938 гг. – Дзяржаўнае Геаграфічнае таварыства, 1938-1991 гг. – Усесаюзнае геаграфічнае таварыства (УГТ), альбо ГТ СССР.

У 1867 г. быў створаны Паўночна-Заходні аддзел ІРГТ з цэнтрам у г.Вільня. Тэрытарыяльна аддзел уключаў Беларусь. Гэта быў адзін з першых аддзелаў ІРГТ (пасля Сібірскага ў г.Іркуцку і Каўказскага ў г.Тыфлісе). Паўночна-Заходні аддзел праіснаваў да 1876 г. У 1910 г. аддзел аднавіў сваю работу. Аднак яна была перапынена сусветнай вайной. Існаваў друкаваны орган “Записки Северо-Западного отдела Имперского Русского географического общества” пад рэдакцыяй беларускага гісторыка Дз.І.Даўгялы. У 1910-1914 гг. выйшлі чатыры кніжкі запісак. Нашчадкамі аддзела з’явіліся Геаграфічныя таварыствы: БССР (арганізавана ў 1954 г.) і Літоўскай ССР (арганізавана ў 1957 г.).

На працягу ўсёй гісторыі развіцця геаграфічнага таварыства беларускія географы прымалі ўдзел у яго арганізацыйнай і навуковай дзейнасці. Дастаткова назваць такія вядомыя прозвішчы, як Я.Д.Чэрскі, І.І.Ходзька, Б.І.Дыбоўскі, А.Л.Чаканоўскі, А.І. і Б.А.Вількіцкія, А.Ф.Флёраў, В.В.Прончышчаў, І.І. Жылінскі, Я.У.Апокаў, А.А.Смоліч. Напрыклад, І.І.Ходзька ўжо ў 1847 г. па ўзгадненню з РГТ пачаў трыангуляцыйную работу ў Закаўказзі, вынікі якой далажыў на пасяджэнні Савета 3 жніўня 1850г. У 1868 г. ён узнагароджваецца Вялікім залатым медалём ІРГТ.

Я.Д.Чэрскі, Б.І.Дыбоўскі, В.Гадлеўскі, М.Віткоўскі працавалі ў Сібірскім аддзеле Геаграфічнага таварыства. Пачынаючы з 60-х гадоў, яны ўдзельнічалі ў даследаваннях Сібіры, воз.Байкал, Саян. За свае працы яны неаднаразова ўзнагароджваліся залатымі і сярэбранымі медалямі ІРГТ.

Геаграфічнае таварыства аказвала вялікую метадычную дапамогу экспедыцыйным даследаванням тэрыторыі Еўрапейскай Расіі, у тым ліку Беларусі. Напрыклад, пра вынікі працы Заходняй экспедыцыі па асушэнню балот Палесся яе кіраўнік, член ІРГТ І.І.Жылінскі дакладваў на сумесных паседжан-

нях аддзелаў фізічнай і матэматычнай геаграфіі ў 1875, 1876 і 1894 гг. Неаднаразова слухаліся справаздачы А.Ф.Флёрава аб даследаваннях балот.

Кіраўнікамі Геаграфічнага таварыства (да 1917 г.) былі асобы царскай фаміліі. Першым старшынёй Таварыства (1845-1892 гг.) быў сын Мікалая І вялікі князь Канстанцін Мікалаевіч. З 1892 да 1917 гг. старшынёй быў вялікі князь Мікалай Міхайлавіч. Практычна працай Таварыства кіравалі віцэ-старшыні. Званні старшыня і віцэ-старшыня таварыства захоўваліся да 1945г., калі яны былі заменены на “Прэзідэнт” і “Віцэ-прэзідэнт”. Віцэ-старшынямі таварыства былі: Ф.П.Літке (1845-1850, 1857-1873 гг.), М.М. Мураўёў (1850-1857), П.П.Сямёнаў (1873-1914), Ю.М. Шакальскі (1914-1931). 11 марта 1917 г. злажыў з сябе паўнамоцтвы старшыні геаграфічнага таварыства вялікі князь Мікалай Міхайлавіч Раманаў. Савет таварыства на гэту пасаду зацвердзіў Ю.М.Шакальскага. Пасля старшынямі таварыства былі: М.І.Вавілаў (1931-1940), Л.С.Берг (1940-1950), Я.М.Паўлоўскі (1952-1964), С.А.Калеснік (1964-1977), А.Ф.Трошнікаў (1978-1991).

Да 1917 г. геаграфічныя з’езды не праводзіліся, іх падмянялі з’езды даследчыкаў прыроды і ўрачоў. Першы Усесаюзны геаграфічны з’езд адбыўся ў 1933 г. у г.Ленінградзе, другі геаграфічны, які лічыцца першым з’ездам ГТ СССР, адбыўся таксама ў Ленінградзе ў 1947 г. Другі з’езд ГТ СССР – у 1955 г. (Масква), трэці – 1960 (Кіеў), чацвёрты – 1964 (Масква), пяты – 1970 (Ленінград), шосты – 1975 (Тбілісі), сёмы – 1980 (Фрунзе), восьмы – 1985 (Кіеў), дзевяты – 1990 (Казань), дзесяты з’езд РГТ – 1995 (Санкт – Пецярбург), адзінадцаты з’езд РГТ – 2000г.(Архангельск). Ва ўсіх з’ездах прымалі ўдзел беларускія географы.

У першыя гады пасля 1917 г. геаграфічнае таварыства працягвала працаваць у прывычным рэжыме. Паступова таварыству прыдаецца роля плануючай і кіруючай грамадскай арганізацыі зыходзячы з плану пабудовы сацыялізму. Пачынаецца ідэалагізацыя ўсіх праводзімых таварыствам мерапрыемстваў, павялічваецца цэнтралізацыя ўлады і кіруючая роля кампартыі. Асабліва гэта характэрна для 30-х гадоў 20-га стагоддзя.

У пасляваенны час пачалі больш актыўна стварацца тэрытарыяльныя аддзелы і філіялы геаграфічнага таварыства. Актывізавалася дзейнасць географаў на месцах, павялічылася колькасць жадаючых уступіць у геаграфічнае таварыства, аб чым сведчаць наступныя дакументы.

**Выписка**
**из протокола № 4 заседания Президиума Географического Общества Союза ССР от 9 февраля 1954 г.**

**Слушали:** Рассмотрение заявлений о приеме в действительные члены Общества.

**Постановили:** 1. Рекомендовать Ученому Совету Общества принять в действительные члены по Белоруссии: Бейлинсона Якова Иосифовича, Возначука Леонида Николаевича, Гинзбурга Генуса Абрамовича, Ерашову Нину Владимировну, Криводубского Ивана Павловича, Козлову Анну Ивановну,

Конюхова Николая Александровича, Крищановича Виктора Яковлевича, Малинина Сергея Николаевича, Мартинкевича Феликса Станиславовича, Петрову Зинаиду Михайловну, Попова Анатолия Николаевича, Рогозина Неофита Ермолаевича, Романовского Николая Тарасовича, Соболева Евгения Яковлевича, Трухана Ивана Ивановича, Фещенко Федора Сергеевича, Шкляра Абрама Хаимовича и Якушко Ольгу Филипповну.

2. Рекомендовать Ученому Совету Филиала БССР принять членами - соревнователями Бобок Тамару Николаевну, Барыкину Эвелину Емельяновну, Букину Аллу Александровну, Вырко Елену Владимировну, Жук Зинаиду Яковлевну, Карпову Людмилу Борисовну, Кореняко Клавдию Александровну, Клицунова Анатолия Сергеевича, Королеву Анастасию Леоновну, Назаренко Веру Петровну, Науменко Владимира Яковлевича, Нашкевич Нину Степановну, Павчину Лидию Иосифовну, Пыжову Валентину Александровну, Польского Спартака Александровича, Ровенко Лауру Григорьевну, Сафонову Майю Сергеевну, Силич Наталию Михайловну, Твердохвалову Людмилу Александровну, Угрюмову Тамару Васильевну, Хомича Александра Александровича, Чертко Николая Константиновича, Чигиреву Римму Михайловну.

Подлинный за надлежащими подписями
Выписка верна (подпись)

У 1954 г. на пасяджэнні Вучонага савета ГТ СССР была прынята пастанова аб адкрыцці Геаграфічнага таварыства Беларускай ССР - філіяла Геаграфічнага таварыства СССР:



ГЕОГРАФИЧЕСКОЕ ОБЩЕСТВО СССР

Ленинград, Центр, пер. Гривцова, 10
для телеграмм: Ленинград, География

Телефон 15-55-76

№ 793

17 декабря 1974 г.

ВЫПИСКА ИЗ ПРОТОКОЛА № 3

ЗАСЕДАНИЯ ПРЕЗИДИУМА ГЕОГРАФИЧЕСКОГО ОБЩЕСТВА СССР
26 января 1954 г.

2. СЛУШАЛИ: Информацию Уполномоченного Географического общества Союза ССР В.Н.Новицкого по организации Белорусского Географического общества – филиала Географического общества СССР

ПОСТАНОВИЛИ: I. Утвердить инициативную группу в составе 5 человек: проф.И.С.Лупинович, канд.географических наук, доцента В.А.Дементьева, канд.географических наук Ф.С.Мартинкович, доцента В.А.Новицкого и канд.географических наук, доцента И.И.Трухан и возложить на нее функции организационного Комитета по созданию Географического общества БССР;

2. Войти с ходатайством в Совет Министров и ЦК об установлении дотации и штатов вновь организованному Географическому Обществу БССР;

3. Просить библиотеку Общества подобрать по одному комплекту всех изданий Географического общества для организации библиотеки Географического общества БССР;

4. За организацию Географического общества БССР вынести благодарность В.А.Новицкому.

п/п п.п. Председатель, чл.корр.АН СССР – С.В.Калесник
секретарь – Е.Н.Ильина

п/п

Верно: Ученый секретарь Географического общества СССР – Л.И.Сенчура

Заказ 134 Тип. газеты «Советский моряк»

Адначасова вырашаліся і пытанні, падкрэсліваючыя самастойнасць утворанага Геаграфічнага таварыства Беларускай ССР.

ГЕОГРАФИЧЕСКОЕ ОБЩЕСТВО СОЮЗА ССР
ПРИ АКАДЕМИИ НАУК СССР

Ленинград, 1, Демидов пер., 8-а,
или главный почтамт, п. я. № 324
для телеграмм: Ленинград География

Тел. 5-02-64, 5-55-76

R № 196/0 9 апреля 1954 г.

# ВЫПИСКА

из протокола № 28 заседания Ученого Совета Географического Общества Союза ССР от 19 марта 1954 года.

в/Об организации Белорусского Географического общества - филиала Географического общества Союза ССР.

Рассмотрев представление уполномоченного Президиума Географического общества В.А.Новицкого по созданию Белорусского филиала Географического общества СССР и просьбу ЦК КП Белоруссии № 3-НК, от 13/1-1954г. о создании Географического Общества Белорусской ССР - филиала Географического общества СССР и утверждение его Оргкомитета - Ученый Совет Общества постановляет:

1. В соответствии с §4 п"а" устава Географического общества Союза ССР утвердить Географическое общество Белорусской ССР - филиал Географического общества СССР с местом пребывания в г.Минске.

2. Утвердить Организационный Комитет Географического общества Белоруссии- филиала Географического общества Союза ССР в составе:
Вице-президента АН БССР проф.И.С.Лупиновича /председатель/, канд.г.н. доц. В.А.Новицкого / зам. председателя/, канд.г.н. доц.В.А.Дементьева, канд. г.н. Ф.С.Мартинкевич/ секретарь/ и канд.г.н. доцента И.И.Трухана.

3. Просить Организационный Комитет Географического общества БССР - филиала Географического общества СССР в течение апреля-мая 1954г. провести организационно-выборное собрание членов Общества. Протокол общего собрания членов Общества выслать в Президиум Географического общества Союза ССР для утверждения:

4. Обязать зав.библиотекой Общества Т.А.Ситникову подобрать один экземпляр всех изданий / кроме бронированных/ Общества и выслать Белорусскому филиалу для комплектования библиотеки.

5. Просить Президиум Академии Наук Белорусской ССР оказывать всемерную организационную и материальную помощь Географическому обществу БССР.

6. Просить ЦК КП Белоруссии и Совет Министров Белорусской ССР оказывать необходимую организационную и материальную помощь вновь созданному Географическому обществу Белорусской ССР.

П.п.Председатель С.В.Калесник

Секретарь Воронов

Выписка верна: [подпись]

Такім чынам, фактычна днём нараджэння Беларускага Геаграфічнага таварыства з'яўляецца 19 сакавіка 1954 г.

Вучоны Савет ГТ СССР пачаў перадаваць часткова свае паўнамоцтвы Арганізацыйнаму камітэту Геаграфічнага таварыства БССР.

Письмо из Географического Общества Союза СССР
за № 196/0 от 9 апреля 1954 г.

**ПРЕДСЕДАТЕЛЮ ОРГКОМИТЕТА ГЕОГРАФИЧЕСКОГО ОБЩЕСТВА БЕЛОРУССИИ**

**Проф. И.С.Лупиновичу**

Направляем Вам для руководства выписку из протокола заседания Ученого совета Общества от 19/III-54 г., 19 учетных карточек и членских билетов, на принятых в члены Общества по Белорусскому Географическому Обществу……

……В соответствии с указанным решением Ученого совета Общества – просим Вас провести выборы Ученого совета, его Президиума и Ревизионной комиссии.

После выборов руководящих органов Белорусского Географического Общества Вам надлежит заказать на месте угловой штамп и печать по установленному образцу /образец прилагается/.

Протокол выборного собрания представить в Президиум Географического Общества.

Инструктивный материал по выборам руководящих органов местных организаций Географического Общества Союза ССР в свое время был выслан В.А.Новицкому.

Зам.Ученого Секретаря /подпись/
/Е.Е.Воронов/

Сярод першых правадзейных членаў ГТ СССР ад Беларусі былі прозвішчы географаў, якія потым сталі знакамітымі вучонымі і зрабілі вялікі ўклад у развіццё беларускай геаграфічнай навукі Ф.С.Марцінкевіч, В.А. Дзяменцьеў, Н.Е.Рагозін, М.Т.Раманоўскі, Л.М.Вазнячук, А.Х.Шкляр, О.П.Якушка і інш.







Прапанова Савета ГТ СССР была з задавальненнем успрынята географамі Беларусі. Вырашана было правесці агульны сход географаў Беларусі. Сход урачыста адкрыў прадстаўнік Ленінграда член Прэзідыума ГТ СССР праф. О.А.Канстанцінаў. Гэта адбылося 19 сакавіка 1954 г. у памяшканні геаграфічнага факультэта Белдзяржуніверсістэта. На агульным сходзе выбралі Вучоны савет ГТ БССР па прапанаванай схеме, аднак у асобах атрымаліся некаторыя змены. Старшынёй Вучонага Савета Беларускага Геаграфічнага таварыства быў абраны акадэмік І.С.Лупіновіч, яго намеснікам дац.В.А.Дзяменцеў, членамі савета: Ф.С.Марцінкевіч, А.М.Папоў, І.І.Трухан і Р.Р.Шэнберг; вучоным сакратаром абраны У.А.Навіцкі. У склад Рэвізійнай камісіі ўвайшлі В.Я.Крышчановіч, М.Л.Палонскі, А.Х.Шкляр.

Рашэнне агульнага сходу беларускіх географаў было зацверджана Вучоным Саветам ГТ СССР 25 верасня 1954 г.

## ВЫПИСКА

из протокола № 30 заседания Ученого Совета географического Общества Союза ССР от 25 сентября 1954 г.

**Слушали:** Утверждение вновь избранного Совета и Ревизионной Комиссии Белорусского Географического общества – филиала Географического общества Союз ССР.

**Постановили:** Утвердить вновь избранный Совет филиала в составе: И.С.Лупинович /председатель/, В.А.Дементьев /Заместитель председателя/,

В.А.Новицкий /Ученый секретарь/ и членов: Ф.С.Мартинкевич, А.Н.Попов, И.И.Трухан и Г.Г.Шенберг.

Право первой подписи на денежно-финансовых документах предоставить И.С.Лупиновичу и В.А.Дементьеву и право второй подписи В.А.Новицкому.

Утвердить вновь избранную Ревизионную Комиссию в составе: В.Я.Крищанович, М.Л.Полонский и А.Е.Шкляр.

П.п. Председатель С.В.Калесник
Секретарь Е.Н.Ильина

Выписка верна: /подпись/

Такім чынам, першым старшынёй Беларускага Геаграфічнага таварыства стаў вядомы вучоны акадэмік АН Беларусі, Віцэ-прэзідэнт АН Беларусі Іван Сцяпанавіч Лупіновіч.

Б. № 2

**БЕЛОРУССКИЙ ФИЛИАЛ**
**Географического Общества Союза ССР**
**г. Минск, Академия наук**

В Ученый Совет Географического Общества БССР

**З А Я В Л Е Н И Е**

Прошу принять меня в действительные члены Географического Общества БССР.

«15» апреля 1957 г. *Подпись*

**Рекомендуют:**

1) ______________ (ф., и., о.) ______________ (подпись)

2) ______________ (ф., и., о.) ______________ (подпись)

**УЧЕТНАЯ КАРТОЧКА**

1. Фамилия Лупинович
2. Имя и отчество Иван Степанович
3. Год и место рождения 1900 м. Шацк, Пуховичского района, Минской обл. БССР
4. Национальность белорус
5. Партийность, партийный стаж, № партбилета член КПСС март 1941 г.
6. Образование (что и когда окончил) высшее, в 1924 Бел. Гос. институт сельского и лесного х-ва
7. Ученая степень и звание доктор с.х. наук, профессор, Академик АН БССР
8. Научная специальность почвоведение
9. Место работы (название учреждения полностью) и должность 1. Бел. Гос. Университет зав. каф. геологии и почвоведения 2. Институт почвоведения М. С.Х. БССР ~~зав.~~ науч. рук. лаб. торфяно-болотных почв

Уліковая картка, запоўненая асабістай рукой Івана Сцяпанавіча Лупіновіча.



І.С.Лупіновіч нарадзіўся ў 1900 г. у мястэчку Шацк Ігуменскага павета Мінскай губерні. Скончыў Беларускі дзяржаўны інстытут сельскай і лясной гаспадаркі (1924 г.). Працаваў у землеўпарадкавальных арганізацыях Беларусі і Расіі. У 1934-1938 гг. загадаваў кафедрай агульнага земляробства Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. З 1938 па 1947 гады працаваў у Савеце вытворчых сіл СССР. Пасля запрашэння ў Мінск працаваў віцэ-прэзідэнтам АН БССР, Прэзідэнтам Акадэміі сельскагаспадарчых навук, загадчыкам кафедры глебазнаўства БДУ.

Дзякуючы намаганням Вучонага савета Беларускага геаграфічнага таварыства ў 1954 г. выйшаў з друку навуковы зборнік «Ученые записки. Серия геолого-географическая», дзе ўсе артыкулы напісаны членамі БГТ.

У першыя гады асноўная ўвага Вучонага савета была накіравана на арганізацыйныя пытанні на павелічэнне колькасці членаў ГТ, на тэрытарыяльнае пашырэнне яго дзейнасці. З гэтымі задачамі Вучоны савет ГТ БССР паспяхова справіўся, аб чым сведчыць і пастанова агульнага справаздачнага сходу, які адбыўся 17 мая 1957 г.

У рабоце схода ўдзельнічалі члены ГТ БССР, шмат гасцей, прадстаўнікоў розных устаноў і арганізацый Беларусі. Дэлегатамі з правам галасавання былі 23 чалавекі: Лукашоў К.І., Рагозін Н.Е., Урусаў В.В., Леўшынаў А.О., Рудкоўская С.С., Андрушчанка А.Н., Трухан І.І., Раманоўскі М.Т., Стэцко В.В., Жучкевіч В.А., Булаўка А.Г., Марцінкевіч Ф.С., Гладкі В.У., Гінзбург Г.А., Іппа М.М. Якушка В.П., Шкляр А.Х., Акінчыц А.С., Собалеў Я.Я., Собалева В.С., Цыбулька А.Е., Дзяменццеў В.А. і прадстаўнік Прэзідыума ГТ СССР Маржоў Б.А. Сход заслухаў справаздачу аб дзейнасці старшыні Савета ГТ і Рэвізійнай камісіі ГТ БССР. Улічваючы тое, што акадэмік І.С.Лупіновіч у 1957 г. стаў Прэзідэнтам толькі што створанай Акадэміі сельскагаспадарчых навук Беларусі і яго асабістую просьбу, сход вырашыў не ўключаць І.С.Лупіновіча ў склад навуковага савета ГТ БССР. У выніку абмеркавання і тайнага галасавання новым старшынёй ГТ БССР абраны акадэмік АН Беларусі, доктар геолага-мінералагічных навук, заслужаны дзеяч навукі БССР Канстанцін Ігнатавіч Лукашоў.



К.І.Лукашоў нарадзіўся у 1906 г. у в.Гарадзец Быхаўскага павета Магілёўскай губерніі. Скончыў Ленінградскі універсітет (1931 г.), дзе і працаваў загадчыкам кафедры грунтазнаўства, дэканам, а потым (1938-1939 гг.) рэктарам гэтага універсітэта. З 1939 па 1944 г. К.І.Лукашоў працаваў у Наркамаце замежнага гандлю СССР і шмат зрабіў для забяспячэння Савецкай Арміі ў час Вялікай Айчыннай вайны. У пасляваенны час працаваў загадчыкам кафедры фізічнай геаграфіі замежных краін МДУ. У 1952-1956 гг. К.І. Лукашоў быў рэктарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, а потым віцэ-прэзідэнтам АН Беларусі і дырэктарам Інстытута геахіміі і геафізікі АН Беларусі.

К.І. Лукашоў – заснавальнік генетычнага накірунку ў грунтазнаўстве, распрацаваў геахімічную класіфікацыю кары выветрывання, метады гехімічных прагнозаў карысных выкапняў.

У склад Савета БГТ, абранага на гэтым сходзе, увайшлі: К.І.Лукашоў (старшыня), В.А.Дзяменцьеў (намеснік старшыні), В.А.Жучкевіч, Ф.С.Марцінкевіч, В.В.Урусаў, М.Н.Іпа, А.Х.Шкляр (вучоны сакратар), А.Г.Булаўка. Рэвізійная камісія: І.І.Трухан, У.А. Навіцкі, У.І. Гладкі.



8 № 213

ГЕОГРАФИЧЕСКОЕ ОБЩЕСТВО СОЮЗА ССР
г. Ленинград, Демидов пер., д 8-а

В Ученый Совет Географического Общества Союза ССР

**ЗАЯВЛЕНИЕ**

Прошу принять меня в действительные члены Географического Общества Союза ССР.

„15" мая 1957 г. *Подпись*

Рекомендуют:

1) Роговин Н.С. (ф. и. о.) [подпись] (подпись)

2) Шкляр А.Х. (ф. и. о.) [подпись] (подпись)

УЧЕТНАЯ КАРТОЧКА

1. Фамилия Жучкевич
2. Имя и отчество Вадим Андреевич
3. Год и место рождения 1915, г. Лоев Гомельской обл. БССР
4. Национальность белорус
5. Партийность, партийный стаж, № партбилета член КПСС
6. Образование (что и когда окончил) высшее, Ленинградский университет, аспирантуру ЛГУ 1933 г. 1938
7. Ученая степень и звание канд. географических наук
8. Научная специальность преподаватель вуза, каф. физической географии
9. Место работы (название учреждения писать полностью) и должность Министерство Просвещения Белорусской ССР, нач. отд. вузов

Уліковая картка, запоўненая асабістай рукой Жучкевіча Вадзіма Андрэевіча.
.

Савет і Рэвізійная камісія былі зацверджаны Вучоным Саветам ГТ СССР 7 лютага 1958 г.

**В Ы П И С К А**

Из протокола заседания Ученого совета Географического общества Союза ССР от 7 февраля 1958 г.

**Слушали:** Утверждение вновь избранного Совета и Ревизионной Комиссии Белорусского филиала Географического общества СССР.

**Постановили:**

1. Утвердить вновь избранный Ученый совет Белорусского филиала Географического общества СССР в следующем составе: Лукашев Константин Игнатьевич /председатель/, Дементьев Василий Алексеевич /зам.председателя/, Мартинкевич Ф.С., Урусов В.В., А.Х. Шкляр /ученый секретарь/, А.Г. Булавко, М.М. Иппа, В.А. Жучкевич.
2. Утвердить Ревизионную комиссию в составе: В.А. Новицкого, И.И.Трухана, У.І. Гладкого.
3. Право первой подписи на денежно-финансовых документах отдела предоставить К.И. Лукашеву, право второй подписи казначею (секретарю) отдела А.Х. Шкляру.

Подлинный за надлежащими подписями
Выписка верна.



№230

ГЕОГРАФИЧЕСКОЕ ОБЩЕСТВО СОЮЗА ССР

г. Ленинград, Демидов пер., д. 8-а

В Ученый Совет Географического Общества Союза ССР

ЗАЯВЛЕНИЕ

Прошу принять меня в действительные члены Географического Общества Союза ССР.

„12“ ноября 1953 г. Подпись [signature]

Рекомендуют:

1) Новицкий В.А. (ф. и. о.) [signature] (подпись)

2) В.А.Дементьев (ф. и. о.) [signature] (подпись)

УЧЕТНАЯ КАРТОЧКА

1. Фамилия Мартинкевич
2. Имя и отчество Феликс Станиславович
3. Год и место рождения 1920 БССР, Минская обл., Дзержинский р-н, дер. Мощена
4. Национальность белорус
5. Партийность, партийный стаж, № партбилета член КПСС с 1944 г. № 6791292
6. Образование (что и когда окончил) Белорусский Государственный Университет им. В.И. Ленина в 1946 г.
7. Ученая степень и звание кандидат географических наук, старший научный сотрудник.
8. Научная специальность экономическая география СССР
9. Место работы (название учреждения писать полностью) и должность Институт экономики Академии наук Белорусской ССР, заведующий сектором экономической географии.

Былі створаны секцыі: фізічнай геаграфіі (кіраўнік В.А.Дзяменцеў), эканамічнай геаграфіі (кіраўнік Ф.С.Марцінкевіч), краязнаўства і турызма (кіраўнік В.А.Жучкевіч), феналагічная (кіраўнік А.Х.Шкляр). Бягучыя справы таварыства вяліся тэхнічным сакратаром Ф.С.Фешчанка. Былі аформлены ўліковыя карткі членаў БГТ, выданы членскія білеты. Складаліся

планы работы Савета, агульных сходаў і пасяджэнняў секцый. Асабліва вялікая ўвага ў рабоце Савета БГТ удзялялася прапагандзе геаграфічных ведаў сярод насельніцтва. З гэтай мэтай надрукавана і разаслана ва ўсе раёны, сельсаветы і школы Беларусі лістоўка.



**УВАЖАЕМЫЕ ТОВАРИЩИ!**

ПРИ АКАДЕМИИ НАУК БССР

**СУЩЕСТВУЕТ**

**БЕЛОРУССКИЙ ФИЛИАЛ ГЕОГРАФИЧЕСКОГО ОБЩЕСТВА СССР.**

**ПРИ ОБЩЕСТВЕ ОРГАНИЗОВАНЫ ТРИ СЕКЦИИ:**

ФИЗИЧЕСКОЙ ГЕОГРАФИИ, ЭКОНОМИЧЕСКОЙ ГЕОГРАФИИ И КРАЕВЕДЕНИЯ И ТУРИЗМА.

**Одной из важнейших задач Общества является изучение родного края и популяризация среди широких кругов населения успехов хозяйственного развития нашей республики, а также ее природных особенностей, географических открытий и новых исследований.**

В целях ознакомления с деятельностью Географического Общества, а также печатания интересных сообщений, Совет Общества решил приступить с 1958 года к изданию специального информационного бюллетеня. Бюллетень рассчитан на широкие круги советских читателей—работников различных отраслей народного хозяйства, преподавателей высших и средних учебных заведений, студентов и аспирантов, охотников, туристов и т. д. В бюллетене будут помещаться краткие сообщения о географии отдельных районов республики, различных климатических явлениях, открытиях полезных ископаемых, появлении и культивировании новых животных и растений, о строительстве промышленных предприятий, о достижениях сельского хозяйства и др.

Совет Географического Общества обращается ко всем любителям природы и краеведения и в особенности к преподавателям географии, естествознания и работникам музеев популяризировать его цели и задачи собирать материал по географии республики. Свои сообщения и вопросы просим прислать по адресу: Минск, Академия наук, Совету Географического Общества.

**Одновременно сообщаем, что членами общества могут быть товарищи, которые принимают активное участие в работе одной из его секций и успешно пропагандируют географическую науку среди населения.**

Заявления на предмет принятия в члены Географического Общества просьба присылать по вышеуказанному адресу.

*Совет Географического Общества*,

**Июнь, 1957 г.**

АТ 09239. Тип. АН БССР. Тир. 3000 экз. Зак. 1449.

Пры Мінскім Палацы піянераў і школьнікаў пачаў працаваць геаграфічны лекторый.



Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

*Воспитание патриотизма начинается с углубленного познания своей Родины.*
*(М. И. КАЛИНИН).*

ГЕОГРАФИЧЕСКОЕ ОБЩЕСТВО БССР
МИНСКИЙ ДВОРЕЦ ПИОНЕРОВ

**ГЕОГРАФИЧЕСКИЙ ЛЕКТОРИЙ**
**учащихся старших классов**

*1956—57 учебный год*

У 1957 г. былі праведзены 4 пасяджэнні Савета БГТ, на якіх разглядаліся наступныя пытанні:

1. Інфармацыя акад. К.І.Лукашова “Аб міжнародным кангрэсе па чацвярцічнай геалогіі ў Іспаніі”.
2. Аб выданні “Бюлетэня Геаграфічнага таварыства”.
3. Інфармацыя А.Х.Шкляра “Аб Усесаюзным сходзе фенолагаў” і справаздачы секцый і камісій і інш.

Савет БГТ звярнуўся у Прэзідыум АН БССР з пытаннем выдання свайго “Бюлетэня”, на што быў атрыманы дазвол.

Упершыню былі выраблены пячатка і штамп БГТ, падрыхтаваны ўліковыя карткі членаў БГТ, форма якіх захавалася да сёняшняга дня.

Па ініцыятыве Савета ГТ БССР у 1957 г. пачалася работа па арганізацыі Магілёўскага аддзела ГТ. З гэтай мэтай члены В.А. Дзяменцьеў і А.Х.Шкляр правялі ў Магілёўскім педінстытуце арганізацыйны сход выкладчыкаў геаграфіі і прыродазнаўства з інфармацыяй аб задачах аддзела таварыства і яго перспектывах, канчатковае афармленне аддзела было вырашана завяршыць у першым квартале 1958 г.

У 1957 г. на пасяджэннях секцыі фізічнай геаграфіі абмяркоўваліся аўтарскія арыгіналы карт для Атласа БССР, абмяркоўваліся рукапісы кніг: А.Х. Шкляра “Ці змяняецца клімат Зямлі”, К.І. Лукашова “Геахімічныя працэсы міграцыі і канцэнтрацыі элементаў у біясферы”, “Стан вывучэння чацвярцічных адкладаў у БССР” (суаўтар М.М.Цапенка і інш.), В.А. Дзяменцьеў, А.Х. Шкляр, В.П. Якушка “Турысцкія маршруты па БССР”. Абмяркоўваўся чарговы нумар “Ученых записок” (серия географическая).

На секцыі эканамічнай геаграфіі разглядаліся пытанні складання эканамічных карт для Атласа БССР (Ф.С. Марцінкевіч, Я.Я.Собалеў, Я.Г.Гуцаў,

М.Т.Раманоўскі, І.І.Трухан і інш.), рукапіс манаграфій "Беларуская ССР" (25 др. аркушаў), "Мінск" (5 др. аркушаў) і інш.

Работа секцыі краязнаўства і турызма працавала ў непасрэдным кантакце з установамі адпаведнага профілю Мінска і БССР. Ф.С.Фешчанка быў кіраўніком сектара краязнаўства і турызма Рэспубліканскага Савета піянерскай арганізацыі пры ЦК ЛКСМБ, вёў дзіцячы сектар па турызму пры Рэспубліканскім камітэце фізкультуры і спорта. Распрацаваны метадычныя дапаможнікі па правядзенню турысцкай работы ў школах.

У савеце БГТ было шмат праблем, у першую чаргу арганізацыйнага характара. Аб чым можна меркаваць з наступнага пісьма на імя віцэ-прэзідэнта Акадэміі навук БССР.

Вице-президенту Академии Наук Белорусской ССР
**академику Лукашеву К.И.**

Белорусский филиал Географического общества СССР для обеспечения своей организационной, научной и издательской деятельности нуждается в:

1. Штатной единице-младшего научного сотрудника (он же редактор бюллетеня и постоянный секретарь общества).
2. В систематическом денежном субсидировании в размере 27 тысяч рублей, в том числе: а) для издания географического бюллетеня общества -20 тыс.рублей; б) для оплаты научных командировок и исследований – 6 тыс.рублей; в) почтовые расходы и материалы – 1 тыс. рублей.
3. В отдельной комнате для проведения текущей организационной работы и библиотеки филиала общества.

Совет Белорусского филиала Географического общества СССР просит АН БССР выделить ему указанные штатную единицу, денежные средства и помещение.

З/пред. Совета Белорусского филиала
Географического общества СССР /подпись/ В.А.Дементьев
Ученый секретарь Совета общества /подпись/ А.Е.Шкляр

7 октября 1957 г.

У 1958 г. выйшаў з друку зборнік навуковых прац «Труды географического факультета», вып. І, дзе ўсе артыкулы напісаны членамі ГТ БССР.

1958 год стаў годам значнага росту аўтарытэта і адпаведна колькасці членаў ГТ. Гэта год першага Атласа БССР, які быў падрыхтаваны па ініцыятыве ГТ, а ў склад рэдакцыйнага савета ўваходзілі члены ГТ: К.І. Лукашоў, І.С. Лупіновіч, І.Д. Юркевіч, С.М. Малінін, В.В.Урусаў. Яны былі кіраўнікамі асобных разделаў Атласа, кансультантам на фізгеаграфічных картах быў В.А.Дзяменцеў. Усяго членамі ГТ БССР складзена больш за 50 карт, выконвалася работа па рэдагаванню Атласа (А.В. Ляўшынаў, І.С. Рут-

коўская, А.С. Свірскі). Гэта быў першы комплексны рэгіянальны Атлас, выдадзены у СССР пасля вайны. Працягвалася работа па стварэнню феналагічнай сеткі на тэрыторыі Беларусі.

Савет ГТ БССР пасля абмеркавання кніг К.І.Лукашова “Літалогія і геахімія кары выветрывання” (20 др.арк.) і І.С.Лупіновіча “Тарфяна-балотныя глебы і іх выкарыстанне” (20 др.арк.) прадставіў іх на вышуканне Ленінскай прэміі за 1959 г.

У секцыі эканамічнай геаграфіі большасць навуковых прац і дакладаў былі прысвечаны вынікам эканамічнага развіцця БССР за 40 гадоў. Выйшла з друку вялікая манаграфічная праца С.М.Малініна і інш. ”Народная гаспадарка Беларускай ССР за 40 гадоў”. М. Т. Раманоўскі і У. А. Навіцкі чыталі лекцыі на тэму “Беларуская ССР за 40 гадоў” у Польскай Народнай Рэспубліцы і Народнай Рэспубліцы Балгарыі. Членамі секцыі прачытана больш за 30 лекцый у працоўных калектывах Мінска і БССР.

У 1959 г. работа Савета ГТ БССР была накiравана на падрыхтоўку навуковага зборніка “Вопросы географии Белоруссии” Минск, 1960 г. –216 с. (13,5 др.арк.). Гэта быў першы друкаваны орган Беларускага геаграфічнага таварыства. У склад рэдакцыйнай калегіі ўваходзілі акад. АН БССР праф.К.І.Лукашоў (галоўны рэдактар), дац. В.А.Дзяменцьеў (намеснік галоўнага рэдактара), акад. АН БССР І.С.Лупіновіч, акад.АН БССР праф.І.Д.Юркевіч, к.г.н. Ф.С.Марцінкевіч, дац.А.Х.Шкляр, дац. М.М.Іпа. Адказны рэдактар зборніка Л.М. Вазнячук, адказны сакратар Ф.С.Фешчанка. Сярод аўтараў навуковых артыкулаў: В.А.Дзяменцьеў (Асноўныя рысы рэльефа і геамарфалагічныя раёны Беларусі), А.Р. Булаўка (Змяненне рэжыму выпарэння і сцёка ў Беларускім Палессі пад уздеяннем асушэння балот), А.Х.Шкляр (Узаемасувязь кліматычных умоў Беларусі і гідралагічнага рэжыму Балтыйскага мора), У.У.Стэцко (Некаторыя вынікі вывучэння лесавых парод Беларусі), Ф.С.Фешчанка (Развіццё і размяшчэнне малочнай прамысловасці Беларусі), Ф.С.Марцінкевіч (Спецыялізацыя сельскай гаспадаркі Беларускага Палесья), В.А.Жучкевіч (Да пытання аб развіцці школьнай геаграфіі ў БССР з 1919 па 1959 гг.) і інш., усяго 22 артыкулы. Да канца 1959г. зборнік быў цалкам гатовы і надрукаваны ў пачатку 1960 г.

У пачатку 1959 г. Саветам ГТ быў зацверджаны Магілёўскі аддзел - першы абласны аддзел у гісторыі ГТ. У аддзеле было каля 30 правадзейных членаў БГТ, якія працавалі ў 2 секцыях: 1) фізічнай і вучэбнай геаграфіі (старшыня М.С. Ратабыльскі), 2) эканамічнай геаграфіі (старшыня І. Г. Перакостаў). Найбольш актыўна і пладатворна працавалі: М.І.Нешатаеў (старшыня аддзела), П.А. Лярскі (вучоны сакратар), М.С.Ратабыльскі, Г.А.Вінкевіч, В.Н.Еўціхевіч, П.І.Сакалоў. Пачынаецца работа па арганізацыі Брэсцкага і Гродзенскага аддзелаў БГТ.

У 1959 г. па ініцыятыве Вучонага савета ГТ БССР і пры непасрэдным удзеле В.А. Дзяменцьева пачаў працаваць геаграфічны лекторый для настаўнікаў геаграфіі. Распрацаваны і зацверджаны макет “Атласа сельскай гаспадаркі БССР” (адказны - член ГТ БССР А.О.Ляўшынаў).

Абмяркоўваліся на Савеце і выйшлі з друку кнігі вучэбна-даведачнага характару “Гарады і вёскі Беларусі” (14,0 др.арк., аўтары В.А.Жучкевіч, А.Я.Малышаў, Н.Е.Рагозін) і “Прырода Беларусі”(22,0 др.арк., аўтары В.А.Дзяменцьеў, А.Х.Шкляр, В.П.Якушка).

У тым жа 1959 г. па просьбе кіраўніка арганізацыйнай групы па стварэнню Гісторыка-краязнаўчага музея (сёння Дзяржаўны музей Беларусі) С.З.Сапешкі Савет ГТ БССР далучыўся да складання плана музея і распрацоўцы экспазіцыі аддзела “Прырода Беларусі”. Члены ГТ БССР В.А.Дзяменцьеў, А.Х.Шкляр, В.П.Якушка і інш. разам з супрацоўнікамі будучага музея пачалі работу па адбору неабходных экспанатаў.

1959 г. стаў пачаткам актыўнай дзейнасці беларускіх географаў на міжнароднай арэне. І.І.Трухан удзельнічаў у пасяджэннях ААН (Нью-Йорк) і ЮНЕСКА ( г.Парыж), Н.Е.Рагозін прыняў удзел у Першым пасяджэнні географаў Сібіры і Далёкага Усходу (Іркуцк, верасень, 1959г.), В.А. Дзяменцьеў выступіў з дакладам на канферэнцыі па ландшафтазнаўству (г.Рыга, жнівень, 1959 г.). Даклад В.А.Дзяменцьева “Вопыт вывучэння ландшафтаў поўначы Беларусі” выклікаў вялікую цікавасць і быў надрукаваны ў Вучоных запісках Латвійскага дзяржаўнага універсітэта ім.П.Стучкі (т.XXXVII, геаграфічныя навукі, IV, №29, 1960г.).

1960 г. пачаўся падрыхтоўкай да трэцяга з’езда ГТ СССР, які адбыўся 30.01.-07.02.1960 г. у г.Кіеве. На агульным сходзе членаў ГТ БССР 20.01.1960 г. дэлегатамі на з’езд былі аднагалосна абраны В.А.Дзяменцьеў і А.Х.Шкляр ад г.Мінска і М.І.Нешатаеў ад Магілёўскага аддзела ГТ БССР.

Згодна Статута ГТ БССР, які дзейнічаў у той час, Савет таварыства выбіраўся на 3 гады. Савет быў выбраны 17 мая 1957 г., а справаздачу аб сваёй дзейнасці ён зрабіў на агульным сходзе ў кастрычніку 1960 г. Затрымка з правядзеннем з’езда была выклікана тым, што Савет ГТ БССР пастанавіў правесці справаздачу пасля IV з’езда ГТ СССР і выхаду з друку першага зборніка прац членаў ГТ БССР “Вопросы географии Белоруссии”.

У 1960 г. на агульных сходах членаў ГТ БССР былі заслуханы справаздачы аб удзеле у Міжнародных канференцыях беларускіх географаў Н.Е.Рагозіна (Іркуцк), В.А.Дзяменцьева (Рыга). Вынікі работы III з’езда ГТ СССР далажыў В.А. Дзяменцьеў 18 сакавіка 1960 г. Аб удзеле у Міжнародным Кангрэсе географаў у Стакгольме расказаў І.І.Трухан (15 снежня 1960 г.), аб геаграфіі Албаніі В.А.Дзяменцьеў (15 снежня 1960 г.) і інш.

У красавіку 1960 г. ГТ БССР атрымала пісьмо ад Амерыканскага Геаграфічнага таварыства і 1 экз. часопіса “Савецкая геаграфія: Агляд і пераклад”, выдадзенага гэтым таварыствам пад рэдакцыяй Тэадора Шабада. У адказ у бібліятэку Амерыканскага таварыства быў выслан ы першы зборнік ГТ БССР “Пытанні геаграфіі Беларусі”. Гэта быў пачатак кантактаў паміж Беларускім і Амерыканскім геаграфічнымі таварыствамі. Член ГТ БССР М.М.Цапенка прыняла ўдзел у Міжнароднай канферэнцыі па праблемах чацвярцічнай геалогіі і геамарфалогіі (Варшава ).

У 1960 г. на базе ГТ БССР быў створаны геаграфічны лекторый, які потым увайшоў у склад Грамадскага ўніверсітэта навуковых ведаў для

настаўнікаў на правах факультэта. Першым дэканам яго стаў нам. старшыні БГТ В.А.Дзяменцьеў.

18 сакавіка 1960 г. на пасяджэнні Вучонага савета разглядалася пытанне аб арганізацыі аддзела геаграфіі пры Прэзідыуме АН БССР. Вырашылі гэта пытанне абмяркаваць больш грунтоўна на агульным справаздачна-выбарчым сходзе.

Савет ГТ БССР прыняў удзел у падрыхтоўцы і святкаванні 60-годдзя першага прэзідента БГТ акадэміка І.С.Лупіновіча.

***Пригласительный***
**БИЛЕТ**

*УВАЖАЕМЫЙ ТОВАРИЩ*

______________________________

МИНИСТЕРСТВО СЕЛЬСКОГО ХОЗЯЙСТВА БССР,
ПРЕЗИДИУМ И ПАРТИЙНОЕ БЮРО
АКАДЕМИИ СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННЫХ НАУК,
ПРЕЗИДИУМ АКАДЕМИИ НАУК БССР
ПРИГЛАШАЮТ ВАС ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ
В ТОРЖЕСТВЕННОМ СОБРАНИИ,
П О С В Я Щ Е Н Н О М
**60-летию СО ДНЯ РОЖДЕНИЯ**
И 37-летию НАУЧНОЙ, ПЕДАГОГИЧЕСКОЙ
И ОБЩЕСТВЕННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ
ПРЕЗИДЕНТА АСХН
АКАДЕМИКА,
ДОКТОРА СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННЫХ НАУК,
ПРОФЕССОРА, ЗАСЛУЖЕННОГО ДЕЯТЕЛЯ НАУКИ БССР

**И в а н а С т е п а н о в и ч а**
**Л У П И Н О В И Ч А**

Собрание состоится 8 октября 1960 года в 12 часов дня
В Конференц-зале Академии наук БССР
( Минск, проспект им. Сталина, 108).

**ПРОГРАММА**

1. ВСТУПИТЕЛЬНОЕ СЛОВО МИНИСТРА СЕЛЬСКОГО ХОЗЯЙСТВА БССР М.Н.ЛУЦЕНКО.
2. ДОКЛАД О НАУЧНО-ПРОИЗВОДСТВЕННОЙ, ПЕДАГОГИЧЕСКОЙ И ОБЩЕСТВЕННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ АКАДЕМИКА И.С.ЛУПИНОВИЧА.

Докладчик – академик С.Г. Скоропанов.

3. ПРИВЕТСТВИЯ.

Агульны справаздачна-выбарчы сход членаў ГТ БССР адбыўся 14 лістапада 1960 г. Справаздачу аб дзейнасці савета за 1957-1960 гг. зачытаў вучоны сакратар Савета А.Х.Шкляр.На сходзе старшынёй Савета ГТ БССР абраны Ц.С.Гарбуноў.

Гарбуноў Цімафей Сазонавіч нарадзіўся 24.07.1904г. у в. Санікі Лепельскага павета Віцебскай губ., гісторык, акадэмік АН БССР (1959).Скончыў БДУ (1936), Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КП(б) (1948). У 1919 – 1924 гг. працаваў на лесапільні, ільнопрадзільнай фабрыцы "Дзвіна" у г.Віцебску. Вёў культурна-асветніцкую, журналісцкую, камсамольскую работу. Карэспандэнт "Правды" (1933-37), галоўны рэдактар Дзяржаўнага выдавецтва БССР (1937-39), рэдактар газеты "Звязда"(1939-41). У 1941-47 і 1950-60 сакратар ЦК КПБ, член Бюро ЦК КПБ. У Вялікую Айчынную вайну на палітрабоце ў Чырвонай Арміі, адзін з арганізатараў партызанскага руху на Беларусі. У 1942-45 гг.член прэзідыума Усеславянскага камітэта і рэдактар часопіса "Наука и жизнь". У 1960-67 акадэмік-сакратар аддзялення грамадскіх навук і член Прэзідыума АН БССР. Вёў выкладчыцкую і навукова-даследчыцкую работу, аўтар і рэдактар прац па гісторыі Беларусі.

У склад Савета ўвайшлі: Гарбуноў Ц.С., Дзяменцьеў В.А., Марцінкевіч Ф.С., Жучкевіч В.А., Собалеў В.Я., Мядзведзеў В.Ф., Фешчанка Ф.С., Навіцкі У.А.

На першым пасяджэнні Савета абавязкі размеркаваліся такім чынам: старшыня – Гарбуноў Ц.С.; нам.старшыні, кіраўнік секцыі фізічнай геаграфіі Дзяменцьеў В.А.; кіраўнік секцыі эканамічнай геаграфіі Марцінкевіч Ф.С.; кіраўнік секцыі краязнаўства і турызму Жучкевіч В.А.; вучоны сакратар Собалеў Я.Я.; члены Савета – Мядзведзеў В.Ф.; Фешчанка Ф.С.; Навіцкі У.А. У склад рэвізійнай каміссіі абраны: І.І..Трухан (старшыня), В.П.Якушка, У.І.Гладкі. Сход прыняў зварот да Прэзідыума АН БССР аб адкрыцці ў сістэме акадэміі аддзела геаграфіі, які пазней мог бы пераўтварыцца ў Інстытут геаграфіі АН БССР.

Па ініцыятыве і пры непасрэдным удзеле членаў Савета ГТ БССР выйшаў з друку зборнік "Фізічная і эканамічная геаграфія БССР". Было вырашана распачаць работу па складанню другога выпуска зборніка "Пытанні геаграфіі Беларусі", які па розных прычынах, выйшаў з друку толькі ў 1970 г.

У 1961 г. выйшлі з друку кнігі Ф.С.Марцінкевіча "Размяшчэнне і спецыялізацыя сельскай гаспадаркі БССР" (14 др.арк.), В.Ф.Мядзведзева "Спецыялізацыя ў сельскагаспадарчай вытворчасці" (10 др.арк.). Пачалася работа над серыяй эканоміка-геаграфічных прац па абласцях рэспублікі: Віцебская – (С.М.Мельнічук), Магілёўская – (В.П.Барадзіна), Брэсцкая – (А.С.Акінчыц), Мінская – (Н.Е.Рагозін, В.Я.Крышчановіч), Гродзенская – (М.Т. Раманоўскі), Гомельская – (І.І.Трухан). Савет ГТ БССР рэкамендаваў да друку кнігу А.С.Махнача і Л.М.Вазнячука "Геалагічнае мінулае Беларусі", якая выйшла у гэтым жа годзе. Неаднаразова абмяркоўваўся і прапанаваны

да друку падручнік для ВНУ "Геаграфія БССР" (В.А.Дзяменцьеў, А.Х.Шкляр, В.П.Якушка і інш.).

У міжнародных канферэнцыях прынялі ўдзел: па ландшафтнаму картаграфаванню (Масква, 1961) В.А.Дзяменцьеў; па раянаванню СССР (Масква, 1961) – В.П.Якушка, па сельскай гаспадарцы (Берлін,1961) – І.С.Лупіновіч, па геаграфіі Балгарыі (Сафія, 1961) – Ц.С.Гарбуноў, па феналагічных назіраннях (Ленінград, 1961) – А.Х.Шкляр, па пытаннях геаграфіі насельніцтва Прыбалтыкі і Беларусі (Ленінград, 1961) – В.А.Жучкевіч.

У 1961 г.старэйшы член ГТ БССР Н.Е. Рагозін абараніў дысертацыю на званне доктара эканамічных навук.

На лютаўскім пасяджэнні Савета ГТ БССР было вырашана правесці падрыхтоўчую работу па адкрыццю Брэсцкага, Віцебскага, Гродзенскага аддзелаў ГТ БССР

1962 г. для ГТ БССР быў адметны тым, што амаль на кожным пасяджэнні Савета, агульнага сходу, аддзяленняў і аддзелаў разглядаліся рукапісы кніг. Вышлі з друку кнігі членаў ГТ БССР: А.Х.Шкляр "Клімат Беларусі і сельская гаспадарка" (32 др. арк.); "Хрэстаматыя па геаграфіі БССР" пад рэд. В.П.Якушкі (16 др.арк.), В.А.Дзяменцьеў, А.Н.Андрушчанка "Гісторыя геаграфіі" (7,5 др.арк.), В.А.Жучкевіч, В.П.Якушка "Геаграфія Беларускай ССР"(падручнік для сярэдняй школы, 5 др. арк.), Д.М.Карулін "Геалогія і карысныя выкапні БССР" (12 др.арк.).

У 1962 г. Беларускі філіял Геаграфічнага таварыства СССР атрымаў самастойнасць і стаў называцца «Геаграфічнае таварыства БССР пры Акадэміі навук БССР».

30 студзеня 1963 г. справаздача аб рабоце Вучонага савета Геаграфічнага таварыства БССР за 1961-1962 гг.слухалася на пасяджэнні Бюро аддзела грамадскіх навук АН БССР (дакладчык – вуч. сакратар Савета БГТ Я.Я. Собалеў) і была прызнана здавальняючай. Акадэмікам – сакратаром аддзялення і старшынёй Савета БГТ быў у той час акадэмік Т.С.Гарбуноў.

ВЫПИСКА ИЗ ПРОТОКОЛА № 2
заседания Бюро Отделения общественных наук
АН БССР

от 31 января 1963 года.

12. Отчет о работе Белорусского филиала Всесоюзного Географического общества за 1961-1962 гг. /Докладчик – канд. географ. наук Соболев/.

Постановили: Отчет о работе Белорусского филиала Всесоюзного Географического общества за 1961-1962 гг. у т в е р д и т ь.

АКАДЕМИК-СЕКРЕТАРЬ
ОТДЕЛЕНИЯ ОБЩЕСТВЕННЫХ НАУК
АН БССР

/подпись/
\Академик АН БССР Т.С.Горбунов/

УЧЕНЫЙ СЕКРЕТАРЬ ОТДЕЛЕНИЯ
/подпись/
/Д.И.СЕРКО/.

15 сакавіка 1963 г. адбыўся справаздачна-выбарчы сход членаў ГТ БССР. Справаздачу за 1961-1962 гг. зрабіў вучоны сакратар таварыства Я.Я.Собалеў. Справаздача атрымала шмат крытычных заўваг ад членаў сходу, асабліва вострая крытыка (В.Г.Заўрыеў, І.І.Трухан і інш.) была накіравана ў адрас старшыні Вучонага савета Ц.С.Гарбунова, які нават не з'явіўся на гэты сход.

На справаздачна-выбарчым сходзе быў абраны новы старшыня Савета ГТ – В.А.Дзяменцьеў.



**БЕЛОРУССКИЙ ФИЛИАЛ**
**Географического Общества Союза ССР**
г. Минск, Академия наук

В Ученый Совет Географического Общества БССР

## ЗАЯВЛЕНИЕ

Прошу принять меня в действительные члены Географического Общества БССР.

«19» марта 1954 г. *Подпись* [подпись]

**Рекомендуют:**

1) Член Геогр. о-ва с 1936 года (ф., и., о.) (подпись)

2) (г. Ленинград) (ф., и., о.) (подпись)

## УЧЕТНАЯ КАРТОЧКА

1. Фамилия Дементьев
2. Имя и отчество Василий Алексеевич
3. Год и место рождения 1908. с. Судбище Новосильского р-на Орловской обл.
4. Национальность русский
5. Партийность, партийный стаж, № партбилета б/п
6. Образование (что и когда окончил) 1930 г. – географич. ф-т БГУ по спец. физич. географии и геоморфологии
7. Ученая степень и звание Канд. географич. наук, профессор
8. Научная специальность физическая география, геоморфология
9. Место работы (название учреждения полностью) и должность Белорусский гос. университет зав. кафедрой физич. географии СССР

Дзяменцьеў Васіль Алексеевіч (нарадзіўся 22.03.(04.04.)1908 г.у в.Судбішчы Навасільскага пав. Тульскай губерні, к.г.н. (1938), праф. БДУ (1961). Скончыў геаграфічны факультэт Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта (1930). Даследаваў Заходнюю Сібір, Палярны Урал. Аўтар сістэмы фізіка-геаграфічнага і геамарфалагічнага раянавання БССР, прац па ландшафтах Беларусі, па праблемах Беларускага Палесся, гісторыі геаграфіі. Удзельнічаў ў складанні Атласа БССР, у распрацоўцы праекта і яго ландшафтнага абгрунтавання для прыгараднай зоны г.Мінска. Заг.кафедры фізічнай геаграфіі СССР БДУ (1956-1974). Асноўныя творы: Схематическая карта рельефа центральной части Западно-Сибирской низменности // Известия Государственного географического общества. 1937. Т.69, в.5; (разам з А.Х. Шклярам і В.П.Якушка) Прырода Беларусі. Мн., 1959; Система физико-географических районов Белоруссии //Физическая и экономическая география. Мн., 1960; (разам з А.Н.Андрушчанкам) История географии. Ч.1. Мн., 1962; (у сааўт.) География Белоруссии. Мн., 1965; (у сааўт.) Белоруссия. М., 1967 (серия «Советский Союз»).

Сур'ёзна змяніўся і склад Савета, у які ўвайшлі: В.А.Дзяменцьеў – старшыня: В.Р.Заўрыеў – нам.старшыні Савета, кіраўнік секцыі фізічнай геаграфіі; Ф.С.Фешчанка – вучоны сакратар; У.І.Гладкі – кіраўнік секцыі эканамічнай геаграфіі; В.А.Жучкевіч – кіраўнік камісіі краязнаўства і турызма; А.Х.Шкляр – кіраўнік феналагічнай секцыі; С.М. Мельнічук і М.С. Руткоўская – члены Савета.

На пасяджэнні Савета 6 красавіка 1963 г. (пратакол № 2) былі зацверджаны агульны план работы Савета ГТ БССР і планы работы камісій і секцый. Упершыню быў вызначаны дзень абавязковага прысутнічання Старшыні і вучонага сакратара ў штаб-кватэры ГТ БССР. Серада з гэтага часу на доўгія гады стала геаграфічным днем, калі члены ГТ БССР маглі збірацца і вырашаць бягучыя пытанні.

На агульных сходах ГТ БССР у 1963 г. было вырашана заслухаць даклады на тэму "Спецыялізацыя сельскай гаспадаркі БССР" (дакладчык акад. І.С.Лупіновіч), "Днепра-Неманская транспартная сістэма і яе сучаснае значэнне (В.А.Жучкевіч), "Стан і перспектывы даследаванняў азер Беларусі" (В.П.Якушка), "Перспектывы развіцця і размяшчэння прамысловасці БССР" (І.І.Трухан) і інш.

Савет ГТ БССР абмеркаваў і прапанаваў да друку кнігі: К.І.Лукашоў "Нарысы па геахіміі зоны гіпергенеза" (30 др.арк.); В.А.Дзяменцьеў, А.Х. Шкляр, В.П.Якушка, М.Т. Раманоўскі "Турысцкія маршруты па Беларусі" (8 др. арк.); А.Х.Шкляр "Кліматычныя рэсурсы Беларусі і шляхі іх выкарыстання ў сельскай гаспадарцы" (20 др.арк.); С.М. Зубаў "Фізічная геаграфія СССР",ч.1 (22 др.арк.) і інш.

Па ініцыятыве феналагічнай камісіі ў Беларусі створана сетка феналагічных назiранняў, арганізаваны сістэматычныя назіранні за фазамі развіцця 21 пладовых і дзікарастучых культур на 43 гідраметэаралагічных станцыях.

У 1963 г. Вучоным саветам ГТ БССР упершыню пастаўлена пытанне аб стварэнні ў структуры ГТ БССР аддзялення этнаграфіі і камісій матэматычнай геаграфіі і медыцынскай геаграфіі.

У 1963 г. камісія краязнаўства і турызма была пераўтворана ў камісію краязнаўства, турызма і школьнай геаграфіі (кіраўнік В.А.Жучкевіч).

20 студзеня 1964 г. прайшоў арганізацыйны сход па стварэнню аддзялення этнаграфіі і фальклора ГТ БССР. Старшынёй аддзялення абраны кандыдат гістарычных навук Бандарчык В.К., сакратаром Э.Р.Сабаленка, членамі аддзялення: Бірыла М.В., Грынблат М.Я., Лемцюгова В.П., Сцяпунін І.Г. і інш.

Першапачаткова аддзяленне этнаграфіі і фальклору працавала сумесна з тапанімічнай камісіяй (кіраўнік П.П.Шуба).

У лютым 1964 г. была арганізавана камісія па медыцынскай геаграфіі. Першапачаткова ў склад камісіі ўваходзілі: В.С. Сенчук, В.П.Якушка, М.М.Корын, А.М.Перасада (кіраўнік камісіі).

25-29 мая 1964 г. у г. Маскве праходзіў IV з’езд Геаграфічнага таварыства СССР. На агульным сходзе членаў БГТ шляхам закрытага галасавання былі абраны дэлегаты на IV з’езд. Імі сталі В.А.Дзяменцьеў і М.Т.Раманоўскі. На з’ездзе быў прыняты новы Статут ГТ СССР, прэзідэнтам таварыства абраны С.В.Калеснік.

У 1964 г. член ГТ БССР акад. І.С.Лупіновіч удзельнічаў у VIII Міжнародным глебавым кангрэсе ў Румыніі. В.Г.Заўрыеў знаходзіўся ў навуковай камандзіроўцы ў В’етнаме, В.А.Жучкевіч, П.П.Шуба і В.К.Бандарчык прынялі ўдзел у рабоце тапанімічнай канферэнцыі ў г.Ленінградзе.

На адным з першых пасяджэнняў Савета ГТ БССР у 1964 г. быў заслуханы навуковы даклад «Праблемы геаграфічнай кібернетыкі», які прачытаў М.Л.Палонскі. Даклад выклікаў вялікую цікавасць, і для развіцця гэтага накірунку было вырашана стварыць Камісію Геаграфічнай кібернетыкі пры Савеце ГТ БССР. Упершыню ў склад камісіі ўвайшлі: В.Ф.Мядзведзеў, М.Л.Палонскі, В.В.Міласердаў, В.Ф.Айзенштэйн, А.Р.Булаўка, А.Х.Шкляр.

У 1965 г. К.І.Лукашоў прыняў удзел у рабоце VII кангрэса ІНКВА у ЗША. І.С.Лупіновіч на канферэнцыі па праблеме “Мікраэлементы і прыродная радыёктыўнасць глебаў” (г.Петразаводск), выступіў з дакладам “Мікраэлементы ў глебах БССР і эфектыўнасць мікраўгнаенняў”; В.П.Якушка і М.В.Лаўрыновіч удзельнічалі ў канферэнцыі па вывучэнню азёр Паўночнага Захаду СССР”; Л.М.Вазнячук зрабіў даклады на канферэнцыях па стратыграфіі верхняга плейстацэну ў Маскве і па стратыграфіі неагену Паўночнага Прычарнамор’я і Малдавіі ў г.Адэса,. В.Я.Крышчановіч прыняў удзел у канферэнцыі па геаграфіі насельніцтва ў г.Ташкенце; В.К.Бандарчык, М.Я.Грынблат і Л.І.Маўчанава – на канферэнцыях па этнаграфіі і антрапалогіі ў гарадах Баку і Вільнюсе; А.М.Перасада – на канферэнцыі “Медыцынская геаграфія і здароўе насельніцтва” у г.Ленінградзе.

17-25 лістапада 1965 г. у г.Ленінградзе адбыўся першы сімпозіум па гісторыі азёр, на якім вырашана, што наступны сімпозіум будзе праходзіць у 1967 г. у г.Мінску на базе ГТ БССР і геаграфічнага факультэта БДУ. 5 ліста-

пада 1966 г. акадэмік С.В.Калеснік – Прэзідэнт ГТ СССР, звярнууся ў Прэзідыум АН БССР, рэктарат БДУ і савет ГТ БССР з просьбай правесці сімпозіум у Мінску.

20 кастрычніка 1965 г. адбыўся чарговы справаздачна-выбарчы сход ГТ БССР, дзе з дакладам аб праведзенай рабоце выступіў вучоны сакратар Ф.С.Фешчанка. Даклад, прысвечаны 120-годдзю ГТ СССР, зрабіў В.А.Дзяменцьеў. Выбраны новы склад Савета ГТ БССР, у які ўвайшлі: В.А.Дзяменцьеў (старшыня), В.Р.Заўрыеў (нам.старшыні), Л.М.Вазнячук – вучоны сакратар, І.І.Трухан – кіраўнік аддзялення эканамічнай геаграфіі, А.Н.Андрушчанка – кіраўнік аддзялення фізічнай геаграфіі, В.К.Бандарчык - кіраўнік аддзялення этнаграфіі, В.А.Жучкевіч - кіраўнік камісіі краязнаўства, турызма і школьнай геаграфіі, А.М.Перасада - кіраўнік камісіі па медыцынскай геаграфіі, А.Х.Шкляр – кіраўнік феналагічнай камісіі, П.П.Шуба – кіраўнік тапанамічнай камісіі, Ф.С.Марцінкевіч, П.А.Сідараў – члены Савета. У склад рэвізійнай камісіі ўвайшлі: В.П.Якушка (старшыня), Е.Б.Фрыдлянд і Н.П.Козыр – члены камісіі.

У 1965 г. упершыню ў Беларусі выйшаў з друку падручнік для ВНУ (грыф Міністэрства вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесійнай адукацыі БССР) “Геаграфія Беларусі” (26,3 др.арк.) пад рэдакцыяй членаў Савета ГТ БССР В.А. Дзяменцева, М.Т.Раманоўскага, С.М.Мельнічука. У 1966 г. гэта кніга абмяркоўвалася на сходзе членаў БГТ з удзелам аўтараў, рэдактараў і выдаўцоў. Абмяркоўваліся на Савеце ГТ БССР і вышлі з друку ў 1966 г. кнігі: В.А.Жучкевіч “Тапаніміка, геаграфічныя нарысы" (17,0 др.арк.); В.А.Жучкевіч, В.П.Якушка “Геаграфія БССР” (падручнік для школ); А.Р.Мядзведзеў “Эканамічная ацэнка зямель Беларусі” (8,8 др.арк.); І.Д.Юркевіч, В.С.Гельтман “Лясы Беларусі” (16,0 др.арк.) і інш.

У 1966 г. члены ГТ БССР здзейснілі паездкі ў замежныя краіны, дзе выступілі з дакладамі: В.А.Дзяменцьеў – у ПНР па фізіка-геаграфічнаму раянаванню, Ф.С.Марцінкевіч – у Італію на ІІ Сусветны кангрэс па аграрных рэформах; І.І.Трухан – у Швецыю, нарада ЮНЕСКА; М.Т. Раманоўскі – у Фінляндыю з лекцыямі ў ВНУ.

Геаграфічнае таварыства наведаў дэкан геаграфічнага аддзялення філасофскага факультэта г.Любляны (Славенія) – доктар М. Жагар.

Члены ГТ БССР у 1966 г. працавалі ў складзе іншых грамадскіх арганізацый: В.А.Жучкевіч – старшыня секцыі геолага-геаграфічных навук НТС Міністэрства адукацыі; У.А.Навіцкі – старшыня секцыі геолага-геаграфічных навук таварыства “Веды”; С.М.Зубаў – дэкан геафака універсітэта навуковых ведаў настаўнікаў; І.С.Лупіновіч – старшыня Беларускага таварыства аховы прыроды; К.І.Лукашоў – старшыня навуковага Савета АН БССР па праблемах Палесся і інш.

К.І. Лукашоў і І.С.Лупіновіч прымалі ўдзел у рабоце Усесаюзнай геахімічнай нарады (г.Іркуцк), В.П.Якушка і В.А.Калечыц – у нарадзе па азёрах (г.Пскоў), А.Г.Булаўка і Я.І.Пупсін – на канферэнцыі па пытаннях клімата і гідралогіі (г .Вільнюс), І.Д.Юркевіч і В.С.Гельтман - па праблемах біягеаграфіі (г.Масква) і інш.

У 1966 г. на агульных сходах членаў ГТ БССР былі зроблены навуковыя даклады: Б.Б.Багаслоўскі "Гідраграфія азёр СССР", В.С.Гельтман "Біягеаграфія і раянаванне лясной расліннасці БССР", В.П.Якушка "Новае ў вывучэнні азёр Беларусі", Г.І.Гулюк "Атлас Антарктыды", Е.Б.Фрыдлянд "Агракліматычны даведнік Мінскай вобласці", Л.М.Вазнячук "Новыя звесткі па палеагеаграфіі позняга плейстацэну Беларусі" і інш..

1967 год для Геаграфічнага таварыства БССР прыкметны актывізацыяй дзейнасці, накіраванай на стварэнне ландшафтных запаведнікаў і заказнікаў. Вучоны савет ГТ БССР звярнуўся ў Камітэт аховы прыроды пры СМ БССР з прапановай разгледзець пытанне арганізацыі ахоўваемых тэрыторый: 1. Вадазбор Крывога возера ў групе Ушацкіх азёр як прыклад азёрнага ўзгоркавага ландшафта зоны апошняга зледзянення; 2. Ельненскае балота (Шаркаўшчынскі раён) як тыповае для азёрна-ледавіковага ландшафта нізіннага тыпу поўначы Беларусі; 3. Скразная даліна рэк Ілія-Гайна ў населеных пунктах Янушкавічы і Гайна як частка ўзгоркава-марэннага ландшафта зоны маскоўскай стадыі Дняпроўскага зледзянення; 4.Частка Беларускага Палесся па сярэдняму цячэнню р.Льва, на ўсход ад г.Століна з характэрнымі рысамі далін палескіх рэк, з хвойна-шыракалісцёвымі і дробналісцёвымі лесамі, нізіннымі балотамі і забалочанымі лугамі; 5. Заходняя частка Нарачана-Вілейскай нізіны з озамі, камамі, астаткавымі азёрамі як прыклад водна-ледавіковага ландшафта маскоўскай стадыі зледзянення; 6. Частка Мазырскай марэннай грады зоны дняпроўскага зледзянення з тэрасамі даліны ракі Прыпяць і ўчасткамі хваёва-шыракалісцёвых лясоў; 7. Аднавіць запаведны рэжым Вялаўскага заказніка як часткі Верхне-Нёманскай нізіны з характэрнымі рысамі расліннага і жывёльнага свету; 8. Участак па верхняму цячэнню р.Рэмяствянка на лёсавай платопадобнай Горацка-Мсціслаўскай раўніне з лагчынна-яравымі і суфазійннымі формамі рэльефа.

У 1967 г. члены ГТ БССР В.П.Барадзіна, В.А.Дзяменцьеў, В.А.Жучкевіч, К.І.Лукашоў, Ф.С.Марцінкевіч, С.М.Мельнічук, М.Т.Раманоўскі, А.Х.Шкляр і В.П.Якушка падрыхтавалі том "Беларусь" (25,0 др.арк.) у шматтомнай серыі "Савецкі Саюз". А.Х.Шкляр выпусціў кнігу "Каляндар прыроды Беларусі" (15,6 др.арк.), С.М.Зубаў – "Фізічная геаграфія СССР" ч.ІІ (16,0др.арк.), М.Т.Раманоўскі "Развіццё манафактурнай прамысловасці ў Беларусі ў пасляпэформенны перыяд" (18 др.арк.), А.І.Багдановіч, П.А.Сідараў "Гарады Беларусі" (8 др.арк.) і інш.

З 23 па 28 мая 1967 г. на базе ГТ БССР і БДУ адбыўся ІІ сімпозіум па гісторыі азёр Паўночнага Захаду СССР. На сімпозіуме заслухана больш за 60 дакладаў, 40% якіх зрабілі вучоныя Беларусі. Усяго ў сімпозіуме прымалі ўдзел 117 человек. Сімпозіум меў вялікі поспех. З дакладамі выступілі вядомыя вучоныя Масквы (Л.Л. Расаліма, М.І. Нейштадт, Н.В.Кардэ), Ленінграда (Д.Д.Квасаў, Н.Н.Давыдава і інш.), Карэліі (Г.С.Біскэ, Г.І.Лак), Літвы (М.В.Кабайлене, А.А.Гарункштыс), Эстоніі (А.В.Раўкас, Я.М.Пунінг), Смаленска (А.С.Крэмень, В.Г.Казлоў) і інш. Матэрыялы сімпозіума надрукаваныя.У гонар канферэнцыі ГТ БССР выпусціла памятны мядаль (адказны В.А.Калечыц).

28-30 лістапада 1967 г. па плану работы ГТ БССР адбылася Першая Беларуская тапанімічная канферэнцыя.


Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР

Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна

Геаграфічнае таварыства СССР. Беларускі аддзел

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ТАПАНІМІЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

28 — 30 лістапада 1967

МІНСК

У ёй прынялі ўдзел больш за 70 вучоных з Беларусі, Украіны, Літвы, Латвіі. Выпушчаны з друку тэзісы дакладаў, а таксама зборнік навуковых прац “Пытанні беларускай этнаграфіі, фалькларыстыкі і тапанімікі” (14 др.арк.) пад рэдакцыяй В.К.Бандарчыка, М.В.Бірылы, А.С.Фядосіка, Э.Р.Сабаленкі. У 1967г. пры Віцебскім дзяржаўным медыцынскім інстытуце створана секцыя медыцынскай геаграфіі (замест спыніўшай дзейнасць камісіі ў Мінску), старшынёй якой абраны С. І. Бялоў.

У 1968 г. Савет ГТ падтрымаў ініцыятыву АН БССР аб выданні Беларускай Савецкай энцыклапедыі ў 12 тамах і яму было даручана распрацаваць раздзел “Геаграфія”. У рэдакцыйную камісію БелСЭ увайшлі К.І.Лукашоў і Ф. С.Марцінкевіч, а ў склад рэдакцыйнага Савета - В.А.Дзяменцьеў, В.Р.Заўрыеў, М.Т.Раманоўскі, І.І.Трухан, А.Х.Шкляр. Асноўную частку артыкулаў па геаграфіі для І і ІІ тамоў БелСЭ напісалі члены ГТ артыкулы прайшлі абмяркаванне на паседжаннях Савета, аддзяленняў і камісій ГТ БССР на працягу 1968 г.

11-12 снежня 1968 г. Саветам ГТ БССР праведзена канферэнцыя, прысвечаная 50-годдзю БССР і КПБ, на якой было зроблена 8 пленарных дакладаў: В.Р.Заўрыеў, В.П.Якушка “Вывучэнне азёр БССР”, В.А.Жучкевіч “Та-

паніміка ў БССР", Д.М.Карулін "Мінеральна-сыравінная база БССР", Л.М.Вазнячук "Дасягненні ў вобласці вывучэння антрапагену БССР", В.П.Барадзіна "Пытанні развіцця і размеркавання дрэваапрацоўчай прамысловасці ў БССР", І.І.Трухан "Лёгкая і харчовая прамысловасць за 50-год БССР", Н.І.Жураўская "Змены ў размеркаванні і спецыялізацыі сельскай гаспадаркі Віцебскай вобласці за гады савецкай улады", М.Т. Раманоўскі «Развіццё паліўна-энергетычнай прамысловасці БССР за 50 гадоў». Юбілею былі прысвечаны 12 выстаў, 13 выступленняў на радыё і тэлебачанні, арганізаваныя Саветам ГТ БССР.

Абмеркаваны на пасяджэннях ГТ БССР і вышлі з друку наступныя кнігі членаў геаграфічнага таварыства: І.Д. Юркевіч, В.Г.Гельтман "Тыпы і асацыяцыі чорнаальховых лясоў (23,5 др.арк.), В.А.Жучкевіч "Тапаніміка" (28,0 др.арк.), Д.М. Карулін "Развіццё мінеральна-сыравіннай базы" (12,0 др.арк.), Ф.С.Марцінкевіч, Л.В.Казлоўская, В.Д.Паўлава і інш. "Уплыў умоў і фактараў на эфектыўнасць размяшчэння вытворчасці"(20,5 др.арк.), Ф.С.Фешчанка "Мяса-малочная прамысловасць БССР (8,0 др.арк.), М.Я.Грынблат "Беларусы", А.С.Ліс "Мікола Шчыкаціхін" (8,0 др.арк.), К.П. Кабашнікаў "Беларуская навука ў казачным эпасе славян (16,0 др.арк.) і інш.

С.І. Бялоў прыняў удзел і выступіў з дакладам на тэму «Стан і задачы медыка-геаграфічных даследаванняў у Беларусі» на Трэцім навуковым пасяджэнні па праблемах медыцынскай геаграфіі, якое адбылося ў г.Ленінградзе 25-30 лістапада 1968 г.

9 кастрычніка 1968 г. пайшоў з жыцця першы Старшыня Вучонага Савета і арганізатар Геаграфічнага таварыства БССР акадэмік Іван Сцяпанавіч Лупіновіч.

У красавіку 1968 г. у Брэсцкім педінстытуце стварылася ініцыятыўная група географаў, якія пачалі працу па арганізацыі аддзела ГТ БССР. 12 лютага 1969 г. Вучоны савет ГТ БССР заслухаў прапанову ініцыятыўнай групы і прыняў пастанову аб адкрыцці Брэсцкага аддзела. Старшынёй аддзела абраны У.Я.Навуменка, сакратаром Я.М.Мяшэчка. Пры аддзеле працавалі тры секцыі: фізічнаай геаграфіі, эканамічнай геаграфіі і школьнай геаграфіі, краязнаўства і тапанімікі. Ужо ў 1963 г. Брэсцкі аддзел налічваў 27 членаў, у асноўным гэта былі супрацоўнікі Брэсцкага дзяржаўнага педінстытута.

19 сакавіка 1969 г. адбыўся справаздачны сход ГТ БССР, на якім з дакладам выступіў В.А.Дзяменцьеў. У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел: М.Т.Раманоўскі, С.А.Польскі, І.І.Трухан, В.Р.Заўрыеў. У выніку тайнага галасавання быў абраны Вучоны Савет і рэвізійная камісія:: В.А.Дзяменцьеў. В.Р.Заўрыеў (нам.старшыні), В.В.Салазанаў (вуч. сакратар), Андрушчанка А.Н. (кіраўнік аддзялення фізічнай геаграфіі), І.І.Трухан (кіраўнік аддзялення эканамічнай геаграфіі), В.К.Бандарчык (кіраўнік аддзялення этнаграфіі), А.М.Перасада (кіраўнік камісіі медыцынскай геаграфіі), А.Е.Шкляр (кіраўнік феналагічнай камісіі), В.А.Жучкевіч (кіраўнік камісіі краязнаўства, турызма, тапанімікі і школьнай геаграфіі), члены Савета: С.А.Польскі, С.М.Мельнічук, А.А.Леўшынаў, А.З.Паўлава. У склад рэвізійнай камісіі ўвайшлі: В.П.Якушка (старшыня), Я.Б.Фрыдлянд, Н.П.Козыр.

Сход географаў упершыню паставіў пытанне аб неабходнасці стварэння ў АН БССР Аддзялення навук аб Зямлі.

3 снежня 1969 г. Вучоны Савет ГТ БССР вырашыў: у сувязі са смерцю В.В. Салазанава даручыць выконваць абавязкі Вучонага сакратара ГТ БССР Г.І.Марцынкевіч.

У 1969 г. Савет ГТ БССР прапанаваў да выдання калектыўную манаграфію “Ахова прыроды. Прыродныя ресурсы БССР і іх рацыянальнае выкарыстанне” (24,5 др.арк.), якая вышла з друку ў гэтым жа годзе. Вышлі таксама такія кнігі як: В.П.Якушка “Край блакітных азёр”(3,5 др.арк.), І.Д.Юркевіч, В.С.Гельтман “Расліннае покрыва Беларусі” з картай масштаба 1:1000000 (26,0 др.арк.), К.І.Лукашоў “Геахімічныя пошукі элементаў у зоне гіпергенэза” (у 2 тамах), В.А.Дзяменцьеў, Г.І.Марцынкевіч “Структура фізіка-геаграфічных раёнаў Паўночнай Беларусі”(2 др.арк.) і і нш.

Асабліва актыўна працавала аддзяленне этнаграфіі ГТ БССР. Толькі ў 1969 г. надрукавана 10 кніг, у тым ліку: Л.А. Малчанава “Матэрыяльная культура беларускай вёскі”, Л.І.Мінько “Народная медыцына Беларусі”, Э.Сабаленка “Этнаграфічная спадчына Якуба Коласа, Н.В.Бірыла “Беларуская антрапанімія”, А.С.Фядосік “Беларуская народная сатырычная проза”, А.Гурскі “Загадкі” і інш.

У 1969 г. пайшоў з жыцця былы Старшыня Вучонага савета ГТ БССР (1960-1962 гг.), акадэмік АН БССР Цімафей Сазонавіч Гарбуноў.

25 лютага 1970 г. адбыўся агульны справаздачна-выбарчы сход членаў ГТ БССР. Са справаздачным дакладам выступіў намеснік старшыні В.Р.Заўрыеў. У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел больш 10 членаў ГТ БССР. Быў абраны новы склад Вучонага савета ГТ БССР, у які ўвайшлі: В.А.Дзяменцьеў (старшыня), В.Р. Заўрыеў (нам. старшыні), Г.І.Марцынкевіч – вучоны сакратар, А.Н.Андрушчанка – старшыня аддзялення фізічнай геаграфіі, І.І.Трухан – старшыня аддзялення эканамічнай геаграфіі, В.К.Бандарчык - старшыня аддзялення этнаграфіі, А.Х.Шкляр – старшыня феналагічнай камісіі, В.А.Жучкевіч – старшыня камісіі краязнаўства, турызма і тапанімікі; А.Н.Перасада – старшыня камісіі медыцынскай геаграфіі; А.А.Леўшынаў, С.М.Мельнічук, А.Д.Паўлава, С.А.Польскі. У склад рэвізійнай камісіі ўвайшлі: В.П.Якушка (старшыня), Е.Б.Фрыдлянд, Н.П.Козыр.

Сход вырашыў, што агульнымі накірункамі дзейнасці ГТ БССР на бліжэйшы час павінна быць падрыхтоўка і правядзенне мерапрыемстваў, прысвечаных стагоддзю У.І.Леніна і падрыхтоўка да V з’езда ГТ СССР, які павінен адбыцца у снежні 1970 г. Вырашана да 1 мая 1970 г. падрыхтаваць да выдання зборнік навуковых прац членаў ГТ БССР, прысвечаны 125 угодкам ГТ СССР.

Сход аднагалосна прыняў прапанову ўключыць у спіс кандыдатаў на прысваенне звання Ганаровы член ГТ СССР наступных беларускіх географаў: В.А.Дзяменцьеў, В.Р.Заўрыеў, К.І.Лукашоў, М.Т.Раманоўскі, І.І.Трухан, А.Х. Шкляр, І.Д.Юркевіч. На сходзе былі абраны дэлегаты на V з’езд ГТ СССР ад Беларусі. Імі сталі В.А.Дзяменцьеў, І.І.Трухан, А.Х.Шкляр,

П.А.Лярскі (ад Магілёўскага аддзела). Гасцямі з’езда былі вызначаны А.Н.Андрушчанка, В.К.Бандарчык, У.І.Гладкі, Л.Я.Немцава (ад Брэсцкага аддзела). Усе яны прымалі ўдзел у рабоце з’езда (г.Ленінград, 1970 г.). Аднак замест В.Я.Дзяменцьева (з прычыны хваробы) ўдзельнічаў у рабоце з’езда В.Р.Заўрыеў. У нвуковай частцы з’езда прымалі ўдзел маладыя навукоўцы-географы В.С.Аношка, М.К.Алісіевіч, М.К.Чартко.

Упершыню на з’ездзе ГТ СССР абмяркоўваліся пытанні суадносін геаграфіі і экалогіі (даклад В.Б.Сачавы), што стала пачаткам фарміравання новага накірунку ў геаграфічнай навуцы – геаэкалогіі.

Пяты з’езд ГТ СССР прыняў пастанову аб адмене назвы «Філіял ГТ СССР» у Геаграфічных таварыствах рэспублік. У Беларусі стала Геаграфічнае таварыства БССР, альбо ГТ БССР.

У 1970 г. пасля доўгага перапынку вышаў з друку другі выпуск зборніка “Пытанні геаграфіі Беларусі” (першы вышаў у 1960 г.) пад рэдакцыяй В. Р.Заўрыева і І.І.Трухана (8,5 др.арк.). Ён утрымліваў 16 навуковых артыкулаў, напісаных членамі ГТ БССР па выніках вывучэння прыроды, насельніцтва і гаспадаркі БССР. Сярод аўтараў А.Х. Шкляр, У.У. Стэцко, І.П. Галай, С.І.Сідор, С.А.Польскі, А.С.Акінчыц, В.П. Барадзіна, В.Я.Крышчановіч, С.І.Бялоў і інш.

У 1970 г. Беларусь наведалі праф. М.А.Гваздецкі, праф. Э.М.Мурзаеў, праф. Л.Л.Расаліма, праф.А.Т.Хрушчоў, якія выступілі з навуковымі дакладамі на сходах членаў ГТ БССР і на пасяджэннях Вучонага савета.

1970 г. адзначаны своеасаблівым рухам у падрыхтоўцы геаграфічных дысертацый, адна доктарская дысертацыя была абаронена (В.П.Якушка) і адна абмеркавана на агульным сходзе ГТ БССР і рэкамендавана да абароны (В.А.Жучкевіч). Пасля працяглага перапынку наладзілася сістэматычная абарона кандыдацкіх дысертацый, якія абвязкова разглядаліся на пасяджэннях ГТ БССР. За кароткі час географы абаранілі больш за 10 кандыдацкіх дысертацый, сярод якіх Р.А.Жмойдзяк, М.К.Чартко, Н.А.Гецэвіч, К.К.Кудло, В.С.Аношка, В.В.Стэцко, В.Г.Сінякова і інш.

У пачатку 1971 г. работа Вучонага савета ГТ БССР была накіравана на адкрыццё Гродзенскага аддзела. 17 лютага 1971г. адбылося пасяджэнне Вучонага савета, на якім было вырашана: 1). У адпаведнасці з §35 Статута ГТ СССР зацвердзіць Гродзенскі аддзел ГТ БССР з местам знаходжання ў г. Гродна; 2). Зацвердзіць арганізацыйны камітэт Гродзенскага аддзела ГТ БССР у складзе: Зеланд М.Г. (старшыня), Сакалоўскі С.І. (вуч. сакратар), Курстак Л.Л.; 3). Даручыць члену Вучонага савета ГТ БССР І.І.Трухану і арганізацыйнаму камітэту Гродзенскага аддзела ГТ БССР на працягу сакавіка правесці арганізацыйна-выбарчы сход членаў аддзела; 4) Прасіць Гродзенскі абкам КПБ і аблвыканкам дапамагчы арганізаванаму аддзелу ГТ БССР. Пратакол падпісалі В.А.Дзяменцьеў і Г.І.Марцынкевіч.

На сходах членаў ГТ БССР у 1971 г. абмяркоўваліся такія пытанні: Залежнасць прадукцыйнасці расліннасці сушы Зямлі ад фізіка-геаграфічных умоў (С.М.Зубаў); Сучаснае ўяўленне аб уздеянні меліярацыі на водныя рэсурсы (А.Р.Булаўка); Глебы Мінскай вобласці (М.Р.Каўхута); Некаторыя

праблемы развіцця і размеркавання вытворчых сіл Беларускай ССР у 9-й пяцігодцы і надалей (С.А.Польскі); Перспектывы развіцця машынабудавання БССР (І.П.Філатаў); Геаграфія некаторых наследных прыкметаў беларускага насельніцтва (А.І.Мікуліч); Культурны ўзровень сучаснай сельскай сям'і (І.П.Корзун); Медыка-геаграфічная характэрыстыка прыродных зон Беларускай ССР (С.І.Бялоў); Геаграфія лекавых раслін на тэрыторыі БССР (Г.В.Шахавенка) і інш.

Вялікую цікавасць выклікалі папулярныя ў той час даклады, зробленыя на аснове асабістых уражанняў: Прырода і гаспадарка Усходняй Афрыкі (В.П.Якушка); Па паўднёвай Балгарыі (В.Р.Заўрыеў); Месяц у Парыжы (на 26 сессіі Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА) – А.Я.Малышаў і інш.

1971 год быў багаты на геаграфічныя выданні. Абмяркоўваліся на пасяджэннях Савета і сходах членаў ГТ БССР і вышлі з друку наступныя кнігі: "Якасная ацэнка зямель у калгасах і саўгасах БССР" (А.Р.Мядзведзеў і інш.); "Беларускае Паазер'е" (В.П. Якушка); «Тыпы і асацыяцыі яловых лясоў» (І.Д.Юркевіч, Д.С. Голад, В.І.Парфёнаў); "Водны баланс рачных вадазбораў" (А.Р.Булаўка); "Фізічная геаграфія СССР" ч.ІІІ (С.М. Зубаў); "Дэмаграфічная сітуацыя ў БССР і некаторыя пытанні выкарыстання працоўных рэсурсаў" (С.А.Польскі); "Беларускія геаграфічныя назвы" (І.Я.Яшкін); "Беларуская айканімія" (В.П.Лемцюгова); "Беларуская народная сатыра" (А.С.Фядосік); Нарысы дарэвалюцыйнага быту працоўных Беларусі"(У.М.Іваноў); "Знахарства" (Л.І.Мінько) і інш.

5 студзеня 1972 г. адбыўся агульны сход членаў ГТ БССР, на якім была заслухана і абмеркавана справаздача Савета аб дзейнасці за 1970-1971 гг., з якой выступіла Вучоны сакратар Г.І. Марцынкевіч. У абмеркаванні справаздачы прынялі ўдзел Я.А. Якубоўскі, В.Р. Заўрыеў, В.Н. Кісялёў, В.А. Дзяменцьеў. Сход вырашыў прасіць Камітэт па ахове прыроды і рэдкалегію часопіса «Родная прырода» адкрыць раздзел «Геаграфія» у часопісе. Даручыць В.Р.Заўрыеву, С.М.Мельнічуку і І.І.Трухану вывучыць магчымасць выдання навукова-папулярнага часопіса «Геаграфія» і падрыхтаваць праект і макет першага нумара.

У 1972 г. выйшаў з друку зборнік ГТ БССР "Пытанні геаграфіі Беларусі" пад агульнай рэдакцыяй В.А.Жучкевіча, А.Х.Шкляра, С.А.Польскага (11,5 др.арк.). У ім змешчаны некаторыя вынікі вывучэння прыроды, насельніцтва, гаспадаркі, гарадскіх і сельскіх паселішчаў, праведзенага членамі ГТ БССР. Усяго зборнік утрымліваў 22 навуковыя артыкулы. Сярод аўтараў такія вядомыя навукоўцы як: Д. М.Карулін, У.Я.Бардон, Б.М.Гурскі, Я.А.Якубоўскі, Б.Б.Багаслоўскі, Г.М.Базыленка, В.П.Якушка, Г.І.Марцынкевіч, С.А.Польскі, В.Ф.Мядзведзеў, Л.І.Спіжанкоў, Л.П.Шахоцька, А.У.Багдановіч, М.К.Чартко і інш.

На агульным сходзе членаў ГТ БССР быў заслуханы даклад М.Т.Раманоўскага "Аб падрыхтоўцы географаў для навукі і народнай гаспадаркі". Адбылося шырокае абмеркаванне пытанняў, маючых важнае стратэгічнае значэнне для развіцця ўсёй геаграфічнай навукі і адукацыі. Вялікую цікавасць у географаў выклікалі такія навуковыя даклады: "Пра

ўнутраныя заканамернасці развіцця фізічнай геаграфіі (П.С.Кузняцоў); “Міграцыя сельскага насельніцтва ў БССР і яе ўздеянне на сямейны быт” (Э.Р. Сабаленка) і інш. На сходах ГТ БССР упершыню ў Беларусі пачалі навукова абмяркоўвацца пытанні аховы прыроды: даклад В.А. Дзяменцьева “Пра карты аховы прыроды”; М.П.Красніцкага “Ахова нетраў і задачы грамадскасці”. Па ініцыятыве Вучонага савета і пры актыўным удзеле яго членаў (В.А.Дзяменцьеў, А.Х. Шкляр і інш.) у 1972 г. вышаў з друку зборнік навуковых прац “Ахова прыроды Беларусі”, пачаў выходзіць зборнік “Праблемы Палесся”. Вялікую цікавасць выклікаў даклад Ю.І.Лупіновіча “Прырода і людзі Конга (Кіншаса) ” – асабістыя ўражанні.

Савет ГТ БССР пачаў арганізоўваць творчыя брыгады для агітацыйнай работы сярод насельніцтва, у тым ліку і па пытаннях аховы прыроды. У 1972 г. на 5 дзён выязджала творчая брыгада з 7 членаў ГТ БССР у Маладзечненскі раён, з 5 чалавек – у Барысаўскі, з 6 чалавек – у Бабруйскі і г.д.,. Вялікую актыўнасць у гэтай справе праявілі В.А.Жучкевіч, А.Х.Шкляр, У.А.Навіцкі, І.І.Трухан, Г.І.Марцынкевіч, М.Т.Раманоўскі, Ф.С.Фешчанка і інш.

За цыкл навуковых прац па вывучэнню расліннасці Беларусі (“Расліннае покрыва Беларусі”, “Тыпы і асацыяцыі чорнаальховых лясоў”; «Тыпы і асацыяцыі яловых лясоў») члены ГТ БССР І.Д.Юркевіч і В.С.Гельтман атрымалі Дзяржаўную прэмію БССР у галіне навукі і тэхнікі. У 1972 г. член Савета ГТ БССР В.К.Бандарчык абраны членам-карэспандэнтам АН БССР па спецыяльнасці “этнаграфія”.

У 1972 г. на пашыраным пасяджэнні Савета ГТ БССР абмяркоўваўся змест пятага тома Беларускай Савецкай энцыклапедыі ў складзе рэдакцыйнага савета былі: М.Т.Раманоўскі, І.І.Трухан, В.К.Бандарчык; навуковымі кансультантамі: В.А.Жучкевіч, В.Ф.Мядзведзеў, В.Я.Крышчановіч, В.П.Якушка. Заўвагі перададзены рэдакцыі БелСЭ.

11 кастрычніка 1972 г. на паседжанні Вучонага савета ГТ БССР, у сувязі з паступіўшай ад А.Н.Андрушчанкі заявай, вырашана назначыць кіраўніком аддзялення фізічнай геаграфіі А.Х. Шкляра.

У 1972 г. пры Вучоным Савеце ГТ СССР быў створаны Рэдакцыйны Савет па геаграфічнай літаратуры, які узначаліў В.А.Жучкевіч. З гэтага часу яшчэ больш ўзрасла актыўнасць рэдакцыйна-выдавецкай дзейнасці ГТ СССР.

Па ініцыятыве В.А.Дзяменцьева ў 1972 г. Вучоным саветам ГТ БССР была прынята пастанова аб падрыхтоўцы перспектыўных пяцігадовых планаў работы ГТ БССР, якія пасылаліся ў Цэнтральную арганізацыю ГТ СССР (г. Ленінград).

Перспектыўны план работы (!972-1976) ўключаў такія разделы:

1. Агульныя задачы геаграфіі; 2. Рэгіянальныя геаграфічныя даследаванні; 3. Геаграфічная адукацыя; 4. Прапаганда геаграфічных ведаў; 5. Выдавецкая дзейнасць; 6. Сумесныя мерапрыемствы з геаграфічнымі таварыствамі другіх дзяржаў. Больш дэталёвыя перспектыўныя планы работ складаліся для аддзяленняў і камісій.

Напрыканцы 1972 г. Савет ГТ СССР у г. Ленінградзе арганізаваў выставу прац вядомых савецкіх географаў, сярод якіх па прапанове Савета ГТ БССР былі прадстаўлены працы І.С. Лупіновіча, К.І. Лукашова, Ф.С.Марцінкевіча, В.А.Дзяменцьева. Выстава была прысвечана 50-годдзю СССР.

24 студзеня 1973 г. адбыўся агульны сход членаў ГТ БССР, на якім заслухана справаздача Вучонага савета за 1972 г., а таксама два даклады: І.І. Трухан "Сучасны Алжыр" і М.Т. Раманоўскі "Прырода, насельніцтва і гаспадарка краін Экватарыяльнай Афрыкі".

Справаздачны даклад зрабіў А.Х.Шкляр, а заключэнне рэвізійнай камісіі зачытала В.П.Якушка. У спрэчках выступілі: В.А. Жучкевіч, А.Р.Булаўка, М.Т.Раманоўскі і інш.

14 красавіка 1973 г. адбыўся другі агульны сход членаў ГТ БССР, на якім заслуханы даклады: 1. В.А.Дзяменцьеў "XXII Міжнародны геаграфічны кангрэс у Канадзе"; 2. Я.А. Якубоўскі "Геаграфічныя артыкулы ў БелСЭ"; 3. Б.У.Фашчэўскі "Аб праблеме павароту сібірскіх рэк у Аральскае мора".

На пасяджэннях аддзяленняў і камісій у прысутнасці больш за 100 чалавек з вялікай цікавасцю заслуханы наступныя даклады:

1. Аддзяленне фізічнай геаграфіі: А.М. Дзенісенка "Эфектыўнасць вырошчвання сельскагаспадарчых культур на тэрыторыі Магілёўскай вобласці"; В.А.Каган "Па заходняй Афрыцы" (асабістыя ўражанні); Г.А.Браніцкі "Па Злучаных Штатах Амерыкі"; В.Я.Крышчановіч "Выкладанне аэраметадаў, аэраздымкі, фотаграметрыі ў навучальных установах"; П.А. Каўрыга "Радыяцыйны і цеплавы баланс на асушаных тарфяніках"; Е.Б. Фрыдлянд "Рост і развіццё сельскагаспадарчых культур на тэрыторыі БССР у сухія і вільготныя гады".

2. Аддзяленне эканамічнай геаграфіі: В.В.Пакшышэўскі "Сучасныя навуковыя накірункі ў вывучэнні насельніцтва СССР і замежных краін"; А.Т.Хрушчоў "Сучасная Куба"; І.В.Бястужава "Геаграфічны прагноз у сістэме сацыяльна- эканамічнай геаграфіі".

3. Аддзяленне этнаграфіі: І.Я. Яшкін "Этнаграфічныя і дыялектычныя нарысы пра Беларускае Пасожжа"; І.І.Браім "Асаблівасці развіцця рыбалоўства ў БССР"; В.С.Гуркоў "Вёска Чаплін: учора і сёння".

4. Камісія медыцынскай геаграфіі: Б.Л.Гінзбург "Пра ўзнаўленне медыцынскай тапаграфіі; С.І.Бялоў "Змест і методыка складання медыкагеаграфічнага атласа БССР"; А. М.Дарафееў "Рэдкія і знікаючыя расліны і жывёлы Беларускага Паазер'я"; А.А.Лысін "Геаграфія эндэмічнага зобу Мінскай вобласці".

У 1973 г. абмеркаваны на пасяджаннях і выйшлі з друку буйныя навуковыя працы: І.Д.Юркевіч, В.С. Адзярыха "Тыпы ясеневых лясоў БССР"; А.Х.Шкляр "Кліматычныя рэсурсы Беларусі і выкарыстанне іх у сельскай гаспадарцы"; С.А.Польскі "Нарысы геаграфіі гарадоў Беларускай ССР" і інш.

15 студзеня 1974 г. адбылося пасяджэнне Савета ГТ БССР, на якім разглядаліся наступныя пытанні: 1. Справаздача аб рабоце ГТ БССР за 1973 г.; 2. Заключэнне рэвізійнай камісіі; 3. Рашэнне Савета ГТ СССР па падрых-

тоўцы VI Геаграфічнага з'езда (Тбілісі, кастрычнік 1975 г.) і XXIII Міжнароднага кангрэса (Масква, 1976 г.); 4. Абмеркаванне кандыдатур да выбараў у Вучоны савет ГТ БССР; 5. Прыем у члены ГТ БССР. Праект справаздачнага даклада далажыла Г.І.Марцынкевіч, які і быў прапанаваны для абмяркавання на агульным сходзе. Абмеркаваны 14 кандыдатур у склад Савета і 3 у рэвізійную камісію.

22 студзеня 1974 г. адбыўся агульны справаздачна-выбарчы сход членаў ГТ БССР, на якім была заслухана справаздача аб рабоце ГТ БССР за 1970-1974 гг. У справаздачным дакладзе В.А.Дзяменцьява адзначалася, што напачатку 1974 г. у ГТ БССР працавалі 3 аддзяленні: фізічнай геаграфіі, эканамічнай геаграфіі, этнаграфіі і фальклора; 4 камісіі: феналагічная, тапанімікі і школьнай геаграфіі, краязнаўства і турызма; медыцынскай геаграфіі; 3 аддзелы – Магілёўскі, Брэсцкі, Гродзенскі.

У сувязі з тым, што 1974 год быў 20-годдзем для ГТ БССР справаздача Савета была больш пашыранай і аналітычнай, яна складала больш за 30 старонак тэкста.

На сходзе быў абраны новы склад Савета і Рэвізійнай камісіі. У склад Савета ўвайшлі: В.А.Дзяменцьеў (старшыня), В.А. Жучкевіч (нам.старшыні), В.С.Аношка (вучоны сакратар), А.Е.Агаханянц (старшыня аддзялення фізічнай геаграфіі), І.І. Трухан (старшыня аддзялення эканамічнай геаграфіі), В.К. Бандарчык (старшыня аддзялення этнаграфіі і фальклору), А.Х. Шкляр (старшыня феналагічнай камісіі), В.Н. Кісялёў (старшыня камісіі краязнаўства і турызма), члены Савета: С.А. Польскі, В.С. Шаплыка, В.І. Ваньшына, І.І. Салівон, А.Д. Паўлава, М.С. Руткоўская. У склад рэвізійнай камісіі ўвайшлі: В.П.Якушка (старшыня), Е.Б.Фрыдлянд, Н.П.Козыр.

На першым паседжанні Савета, якое адбылося 23 студзеня 1974 г., у склад Геаграфічнага таварыства былі прыняты: І.І.Пірожнік (рэкамендавалі І.І.Трухан і В.П.Якушка), З.Я.Андрыеўская (В.Г.Заўрыеў, В.А.Жучкевіч), А.А. Макарэвіч (Г.І.Марцынкевіч, В.М.Губін) і інш.

На вялікі жаль, старшыня савета ўвесь 1974 г. моцна хварэў. Абавязкі старшыні выконваў яго намеснік В.А.Жучкевіч. В.А.Жучкевіч і В.С.Аношка былі ўключаны ў склад арганізацыйнага камітэта ад Беларусі па правядзенню VI з'езда ГТ СССР і прымалі ўдзел ва ўсіх падрыхтоўчых мерапрыемствах на працягу 1974-75 гг.

11 снежня 1974 г. пасля працяглай хваробы памёр Старшыня Геаграфічнага таварыства БССР Васіль Аляксеевіч Дзяменцьеў.

Выконваючым абавязкі старшыні ГТ БССР абраны В.А.Жучкевіч. Была вырашана перайсці ад справаздачных сходаў да з'ездаў Геаграфічнага таварыства БССР. З'езд ГТ БССР быў назначаны на сакавік 1975 г. у г.Мінску.

І з'езд ГТ Беларускай ССР адкрыўся 12 сакавіка 1975 г. на геаграфічным факультэце БДУ. За сталом Прэзідыума месцы занялі акад. Г.І.Гарэцкі, акад. К.І.Лукашоў, акад.І.Д.Юркевіч, вучоны сакратар ГТ СССР Л.І. Сенчура, дэкан геаграфічнага факультэта праф. М.Т. Раманоўскі, праф.В.А. Жучкевіч, член-кар. АН БССР В.К. Бандарчык.

З прывітальным словам да дэлегатаў з'езда звярнуўся В.А.Жучкевіч. Прысутнічаючыя ўшанавалі памяць аб В.А.Дзяменцьеве.

Для вядзення паседжання выбралі праф. М.Т.Раманоўскага, які абвясціў парадак работы з'езда: 1.Справаздача аб рабоце ГТ БССР за 1970-1974 гг.; 2. Заключэнне Рэвізійнай камісіі; 3. Зацвярджэнне Статута ГТ БССР; 4. Выбары Прэзідэнта ГТ БССР, давыбары членаў Вучонага савета і Рэвізійнай камісіі ГТ БССР; 5. Выбары дэлегатаў на VI з'езд ГТ СССР; 6. Навуковы даклад: "Задачы беларускіх географаў у ахове прыроды" (акад. К.І.Лукашоў). У рабоце з'езда прынялі ўдзел 135 географаў з розных рэгіёнаў Беларусі. У сувязі з тым, што для зацвярджэння на з'ездзе Саветам ГТ БССР быў прапанаваны праект новага Статута ГТ СССР, у якім прадугледжана новая структура кіруючых органаў таварыства, было вырашана адначасова з выбраннем старшыні правесці давыбары саставу Савета, выбранага на агульным сходзе ў 1974 г.

Справаздачу аб дзейнасці Геаграфічнага таварыства БССР зрабіў вучоны сакратар В.С.Аношка. Даклад быў вельмі дэталёвы і доўжыўся больш за 30 хвілін. Аб рабоце рэвізійнай камісіі справаздачу зрабіла В.П.Якушка.

У абмеркаванні дакладаў прынялі ўдзел П.А.Лярскі, А.М.Краўчук, І.Д. Юркевіч, Л.І. Сенчура, Г.І. Гарэцкі, А.Н. Андрушчанка. І.Д. Юркевіч прапанаваў многія пытанні абмяркоўваць сумесна геаграфічнаму і батанічнаму таварыствам, рабіць адзін раз у год сумесныя пасяджэнні гэтых таварystваў. Для гэтага мэтазгодна ў склад Вучонага савета дадаткова к абраным 12 студзеня 1972 г. членам савета ГТ БССР увесці члена батанічнага таварыства В.С.Гельтман, Г.І.Гарэцкі прапанаваў актывізаваць работу географаў не толькі ў Мінску, а і на перыферыі, стварыць свой рэгулярны друкаваны орган, дзе змяшчаліся б геаграфічныя нарысы не толькі навукоўцаў, а і настаўнікаў, работнікаў музеяў, экскурсійных бюро і інш.

В.Г.Шаплыка прапанаваў у склад Савета ўвесці членаў ГТ Б.М. Гурскага, В.М. Шырокава, Р.А. Жмойдзяка, Ф.С. Фешчанку, С.М. Зайко, А.А. Хоміча, С.І. Бялова, П.А. Лярскага, У.Я. Навуменка, Б.А. Манак, Т.А. Раманаву, В.С. Гельтмана. Шляхам закрытага галасавання ўсе яны ўвайшлі ў састаў Савета.

На пасаду Прэзідэнта ГТ БССР А.Х.Шкляр уносіць прапанову рэкамендаваць В.А.Жучкевіча. Закрытым галасаваннем з'езд аднагалосна выбірае В.А.Жучкевіча першым (да гэтага былі старшыні) Прэзідэнтам ГТ БССР.

Па прапанове С.А. Польскага ў спіс для давыбрання Рэвізійнай камісіі ўключаны М.С. Вайтовіч, Н.С. Юрцэвіч, Н.І. Жураўская, В.У. Кадацкая. Усе яны абраны ў Рэвізійную камісію.

Пры разглядзе пытання аб выбранні дэлегатаў на VI з'езд ГТ СССР В.Н. Кісялёў прапанаваў: выбранага старшыню ГТ БССР, В.Р. Заўрыева; В.П. Якушку; А.Е. Агаханянца, В.С. Аношку. Большасцю галасоў прапанаваныя кандыдатуры былі абраны дэлегатамі VI з'езда ГТ СССР.

Упершыню за ўсю гісторыю ГТ БССР быў распрацаваны праект Статута ГТ БССР. Аўтарамі яго былі В.А.Жучкевіч і В.С.Аношка. У абмеркаванні праекта Статута, які на з'ездзе дакладаў В.А.Жучкевіч, прынялі ўдзел А.М.

Краўчук, Л.І.Сенчура, М.Т.Раманоўскі, С.А.Польскі і інш. З’езд пагадзіўся з усімі дапаўненнямі і папраўкамі і аднагалосна прыняў Статут ГТ БССР, які быў зацверджаны Прэзідыумам АН БССР 29 красавіка 1975 г.





АКАДЕМИЯ НАУК БЕЛОРУССКОЙ ССР
ПРЕЗИДИУМ АКАДЕМИИ НАУК

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

29 апреля 1975 года № 92

г. Минск

Об утверждении Устава Географического общества БССР

Президиум Академии наук БССР ПОСТАНОВЛЯЕТ:

Утвердить Устав Географического общества БССР, принятый съездом Общества 12 марта 1975 года. (Прилагается).

Президент
Академии наук БССР
академик АН БССР Н.А.Борисевич.

Главный ученый секретарь
Президиума АН БССР
академик АН БССР А.С.Дмитриев.

Зак. 523 Тираж 3 УД АН БССР. 197 . Минск

На з’ездзе абмяркоўвалася пытанне аб вылучэнні кандыдатур на прысваенне звання «Ганаровы член Геаграфічнага таварыства СССР», якое прысвойваецца чарговым з’ездам ГТ СССР. В.П. Якушка ад імя Савета і

Рэвізійнай камісіі прапанавала рэкамендаваць у Ганаровыя члены ГТ СССР Г.І.Гарэцкага - акадэміка АН БССР з 1929 г., географа і геолага, заслужанага дзеяча навукі БССР, старшыню антрапагенавай камісіі АН СССР і АН БССР, К.І. Лукашова – акадэміка АН БССР, дырэктара НДІ геахіміі і геафізікі АН БССР.

А.Е. Агаханянц прапанаваў кандыдатуру І.Д.Юркевіча - акадэміка АН БССР, вядомага фітагеографа, старшыню Батанічнага таварыства БССР. У падтрымку названых кандыдатаў выступіў М.Т. Раманоўскі. Г.І. Гарэцкі, К.І. Лукашоў і І.Д. Юркевіч аднагалосна прапанаваны на званне «Ганаровы член Геаграфічнага таварыства СССР».

Для правядзення закрытага галасавання па разглядаемых пытаннях была абрана падліковая камісія ў складзе: В.Я. Крышчановіч (старшыня), У.П. Чэканаў, Б.У. Фашчэўскі, Л.А. Паўловіч, Н.П. Кісялеўская, П.Ф. Каранны, Г.І. Марцынкевіч.

З'езд аднагалосна зацвердзіў наступную Пастанову, падрыхтаваную сакратарыятам і рэдакцыйнай камісіяй.

## Пастанова І з'езда Геаграфічнага таварыства БССР

Заслухаўшы і абмяркаваўшы справаздачу аб рабоце Геаграфічнага таварыства БССР, І з'езд Геаграфічнага таварыства БССР адзначае плённую працу, праведзеную таварыствам па аб'яднанню намаганняў спецыялістаў на рашэнне важных пытанняў, якія стаяць перад географамі рэспублікі і прадстаўнікамі памежных навук.

З'езд адзначае, што колькасны рост таварыства ў апошнія гады застаецца пакуль што слабым, а формы работы недастаткова разнастайнымі. Невысокай была актыўнасць многіх членаў ГТ БССР, недастатковымі былі навуковыя і дзелавыя кантакты паміж імі.

З'езд прызваў усіх членаў ГТ БССР актывізаваць дзейнасць накіраваную на вырашэнне сумеснымі намаганнямі задач па вывучэнню і рацыянальнаму выкарыстанню прыродных рэсурсаў, ахове прыроды, па развіццю і размяшчэнню вытворчасці ў адпаведнасці з задачамі пастаўленымі перад навукамі аб Зямлі XXVI з'ездам КПСС.

З'езд лічыць неабходным палепшыць дапамогу органам народной адукацыі ў выкладанні геаграфіі ў школах і ВНУ, пашырыць і ўзмацніць прапаганду геаграфічных ведаў сярод насельніцтва.

З'езд лічыць неабходным:

1. Звярнуць асаблівую ўвагу на рост колькасці членаў ГТ; вывучыць пытанне аб неабходнасці стварэння Мінскага аддзела ГТ БССР.
2. Прыняць праект Статута ГТ БССР з улікам паправак і змяненняў тэкста, прапанаваных Саветам і ўдзельнікамі з'езда.
3. Лічыць неабходным больш увагі ўдзяляць правядзенню рэспубліканскіх навуковых канферэнцый і семінараў, стварэнню геаграфічнага лекторыя.

4. Вывучыць стан выкладання геаграфіі ў школах і вышэйшых навучальных установах, аказання рэальнай дапамогі органам народнай адукацыі і настаўнікам школ.
5. Палепшыць і пашырыць дзелавыя сувязі ГТ БССР з іншымі таварыствамі БССР і СССР.
6. Шырэй практыкаваць абмеркаванне дысертацый, падручнікаў, навуковых справаздач на пасяджэннях аддзяленняў і камісій.
7. Палепшыць работу бібліятэкі таварыства.
8. Заснаваць Грамату ГТ БССР, даручыць Савету ГТ БССР распрацаваць і зацвердзіць Палажэнне аб узнагародах ГТ БССР.
9. Улічваючы, што асноўны склад кіраўніцтва ГТ БССР абраны ў 1974г., лічыць мэтазгодным перавыбары правесці на наступным з’ездзе ГТ БССР.
10. Прасіць Прэзідыум АН БССР выдзеліць адну штатную адзінку для пастаяннай работы ў Геаграфічным таварystве БССР

12 сакавіка 1975 г. адбылося першае пасяджэнне новага Вучонага савета ГТ БССР у поўным саставе. На парадку дня пытанне аб размеркаванні абавязкаў сярод членаў Савета і выбранне Прэзідыума Вучонага савета ГТ БССР. У склад Прэзідыума ўвайшлі: В.А.Жучкевіч (старшыня, прэзідэнт ГТ БССР), Б.М.Гурскі (нам.старшыні), Р.А.Жмойдзяк (нам.страшыні), В.С.Аношка (вучоны сакратар), Ф.С.Фешчанка (адказны за арганізацыйную работу), А. Е.Агаханянц (кіраўнік аддзялення фізічнай геаграфіі), С.А.Польскі (кіраўнік аддзялення эканамічнай геаграфіі), В.К.Бандарчык (кіраўнік аддзялення этнаграфіі), А.А.Хоміч (адказны за Мінскі аддзел), Т.А.Раманава (член прэзідыума).

Было вырашана абавязкова зацвярджаць планы работы агульных сходаў Вучонага савета, аддзяленняў і камісій на кожнае паўгоддзе на пасяджэннях Савета, абагульняць іх у адзіны каляндарны план і рассылаць усім падраздзяленням таварыства. Прыкладам такога плана можа быць календарны план на першае паўгоддзе 1975 г., які быў зацверджаны на пасяджэнні Савета ГТ БССР 2 красавіка 1975 г.

# К А Л Е Н Д А Р Н Ы Й  П Л А Н
## ОБЩИХ СОБРАНИЙ, ЗАСЕДАНИЙ ПРЕЗИДИУМА, СОВЕТА, ОТДЕЛЕНИЙ И КОМИССИЙ ГЕОГРАФИЧЕСКОГО ОБЩЕСТВА БЕЛОРУССКОЙ ССР НА АПРЕЛЬ-ИЮНЬ 1975 года

| Дата/ Время | Организационное подразделение | Докладчик и тема | Ауд. |
|---|---|---|---|
| 02.04. 19.00 | Заседание Совета общества | 1. О плане подготовки к VI съезду Географического общества БССР<br>2. О распределении обязанностей и формировании новых комиссий | 53 |
| 16.04. 19.00 | Отделение физической географии | 1. Романова Т.А. – Почва как элемент биогеоценоза.<br>2. Телеш Л.С. – Содержание гумуса – количественный показатель при картировании смытых дерново-подзолистых почв БССР. | 56 |
| 16.04. 19.00 | Отделение экономической географии | 1. Янович Е.Л. (НИИЭМП) – Социально-экономические аспекты охраны окружающей среды. | 51 |
| 21.04. 9.30 | Отделение этнографии | 1. Мышепуд С.А. – К истории возникновения адвентизма на территории Белоруссии. | Ин-т этногр |
| 23.04. 19.00 | Заседание президиума | 1. Информация Б.Н.Гурского о заседании Ученого совета Географического общества СССР.<br>2. Информация В.С.Аношко о проекте Положения о Грамоте Общества и о выставке для съезда.<br>3. Информация экспедиционно-туристической комиссии о плане научно-туристических мероприятий на 1975 г.<br>4. Организационные вопросы. | 53 |
| 23.04. | Совещание представителей Отделов Общества | Обмен опытом работы, инструктаж | 72 |
| 07.05. 19.00 | Отделение экономической географии | 1. Ваньшина Е.И.(НИИЭМП) - Современое состояние и перспективы развития легкой промышленности БССР. | 56 |
| 14.05. 19.00 | Отделение физической географии | 1. Мотуз В.М. - Палеогеография антропогена северо-запада Русской равнины по данным континентальной фауны моллюсков.<br>2. Зубов С.М. – Особенности распределения продуктивности | 56 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | растительности на территории СССР. | |
| 21.05. | Заседание Президиума Общества | 1. О подготовке вопросов и плана работы до февраля 1976 года.<br>2. Об обмене членских билетов.<br>3. Организационные вопросы. | 53 |
| 21.05. 19.00 | Отделение экономической географии | 1. Павчинский Л.А.(МФЦНИИП градостроительства) – БАМ - важнейшая стройка пятилетки.<br>2. Проблемы развития Нечерноземной зоны РСФСР | 56 |
| 22.05. 09.30 | Отделение этнографии | 1. Белявина В.Н. – Некоторые вопросы методики и техники этносоциального изучения современой культуры городского населения БССР. | Ин-т этногр. |
| 11.06. 19.00 | Отделение экономической географии | 1. Ложкина Л.Н. (МФ НИИ труда) – Актуальные проблемы использования женских трудовых ресурсов в БССР. | 56 |
| 18.06. | Заседание Совета Общества | 1. О выполнении решений съезда Географического общества БССР, информация комиссий и отделений.<br>2. Организационные вопросы. Доклад ревизионной комиссии. | 53 |

ЧЛЕНСКИЕ ВЗНОСЫ ПРИНИМАЮТСЯ: понедельник, среда, пятница с 15.00 до 20.00; вторник, четверг, суббота с 9.00 до 15.00

Председатель Географического общества БССР
профессор В.А. Жучкевич

Ученый секретарь
доцент В.С.Аношко

Савет разгледзеў пытанні, якія датычацца падрыхтоўкі да VI з'езда ГТ СССР. Вырашана прыняць удзел у выставе навуковых прац на VI з'ездзе. У склад арганізацыйнага камітэта па выставе ўвайшлі В.С.Аношка, С.М.Зайко, В.А.Калечыц, А.А. Хоміч. Вырашана, матэрыялы на выставу павінны быць адпраўлены ў г.Тбілісі да 23 красавіка 1975 г.

Вырашана стварыць пры Вучоным савеце ГТ БССР рэдакцыйна-выдавецкі аддзел у складзе: С.А. Польскі, С.М. Зайко, У.Г. Шаплыка. Стварыць лекторый (Б.М. Гурскі), экспедыцыйна-экскурсійную камісію (Б.А. Манак, Ф.С. Фешчанка, В.Н. Кісялёў, І.І. Ганапольскі).

Па рашэнню Савета В.С.Аношка распрацаваў Палажэнне аб формах заахвочвання членаў ГТ БССР, якое было зацверджана 23 красавіка на пасяджэнні Прэзідыума Савета ГТ. На гэтым жа Прэзідыуме быў зацверджаны наступны спіс навуковых прац, прапануемых на выставу ў гонар VI з'езда ГТ СССР (г.Тбілісі).

I. Манаграфіі, падручнікі і дапаможнікі:

1. Заўрыеў В.Р. Па дарогах В'етнама. Мн.,1971.
2. Зубаў С.М. Фізічная геаграфія СССР. Ч.1,2,3. Мн., 1970-1972 гг.
3. Жучкевіч В.А. Агульная тапаніміка. Мн., 1971.
4. Жучкевіч В.А. Кароткі тапанімічны слоўнік. Мн.,1971.
5. Жучкевіч В.А. Геаграфія БССР (падручнік для школ ). Мн.,1974.
6. Жучкевіч В.А. Вывучэнне геаграфіі БССР у курсе «Геаграфія СССР». Мн.,1974.
7. Жучкевіч В.А. Геаграфія ў лічбах і параўнаннях. Мн., 1972.
8. Жучкевіч В.А. Пытанні і задачы па геаграфіі. Мн., 1972.
9. Ратабыльскі М.С., Лярскі П.А. Геаграфія. Мн.,1972.
10. Мядзведзеў А. Р. і інш. Якасная ацэнка зямель у калгасах і саўгасах БССР. Мн.,1971.
11. Мядзведзеў А. Р., Шкляр А.Х. і інш. Ахова прыроды. Мн.,1972.
12. Мядзведзеў А. Р. і інш. Глебы БССР. Мн., 1974.
13. Карулін Д.М. і інш. Развіццё мінеральна-сыравіннай базы БССР. Мн.,1971.
14. Лупіновіч І.С., Дубікоўскі Г.П. і інш. Мікраэлементы ў глебах Беларусі і эфектыўнасць мікраўгнаенняў. Мн.,1970.
15. Аношка В.С. Геаграфічныя асновы меліярацый. Мн.,1974.
16. Аношка В.С. і інш. Палявая і лабараторная практыка па глебазнаўству. Мн., 1974.
17. Карулін Д.М. Геалогія і карысныя выкапні СССР. Мн., 1971.
18. Карулін Д.М. Геалогія ў школьнай геаграфіі. Мн., 1971.
19. Шкляр А.Х. Кліматычныя рэсурсы Беларусі і выкарыстанне іх у сельскай гаспадарцы. Мн., 1973.
20. Якушка В.П. Беларускае Паазер'е. Мн.,1971.
21. Якушка В.П. Геаграфія азёр Беларусі. Мн.,1971
22. Якушка В.П. Край блакітных азёр. Мн.,1970.

II. Праграмма спецкурсаў і практык

1. Возеразнаўства. Мн.,1974.
3. Геаграфічныя асновы меліярацый. Мн.,1973.
4. Палявыя вучэбныя практыкі студэнтаў I і II курсаў. Мн., 1973.

III Фотаальбомы, карты і іншыя матэрыялы

1. Альбом характэрных ландшафтаў Беларускага Паазер'я.
2. Альбом фатаграфій, прысвечаных уздеянню асушальных меліярацый на прыродныя ландшафты.
3. Карты этнаграфічнага атласа.
4. Паспарт возера.
5. Карты марфаметрычных паказчыкаў асобных фізіка-геаграфічных раёнаў БССР.

На пасяджэнні Вучонага Савета ГТ БССР 18 чэрвеня 1975 г. зацверджаны план работы ГТ БССР на другую палову 1975 г. В.А.Жучкевіч далажыў Савету перспектыўны план навуковых канференцый пад эгідай ГТ БССР на бліжэйшыя два гады. Ён уключаў наступныя тэмы: «Ландшафтныя даследаванні Беларусі», «Геаграфія ў школах і ВНУ Беларусі», «Праблемы картаграфічных работ», «Другая тапанімічная канферэнцыя».

Падрыхтаваны да друку чацвёрты зборнік ГТ БССР «Геаграфія ў школах і ВНУ». Рыхтуецца пяты зборнік «Матэматычныя метады ў геаграфіі», які павінен быць зданы ў выдавецтва ў другой палове 1975 г.

У маі 1975 г. выйшла на пенсію М.С.Прахарэнка, якая працавала тэхнічным сакратаром ГТ БССР пасля Ф.С.Фешчанкі з 1962 г. На яе месца Вучоным саветам 18 чэрвеня 1975 г. зацверджана Г.М.Лукошка.

На пасяджэнні Прэзідыума Савета ГТ БССР 17 верасня 1975 г. разгледжана пытанне аб адкрыцці Гомельскага аддзела ГТ БССР. Аб стане справы расказаў В.А. Жучкевіч, якому было даручана вясной гэтага года вывучыць магчымасці адкрыцця аддзела. Ён далажыў, што 29 жніўня 1975 г. праведзены сход географаў Гомеля, на якім абраны аргкамітэт па стварэнню Гомельскага аддзела ГТ БССР. У яго склад увайшлі: А.А.Сакалова (старшыня), В.М.Юрчанка (вучоны сакратар), члены: В.М.Валавікова, В.І.Войцік, Н.Г.Брыц, А.Г.Краўчанка, У.Е. Пашук, Н.В. Волкава, А.А.Кайсік. Прэзідыум Савета ГТ БССР прыняў рашэнне аб адкрыцці Гомельскага аддзела ГТ БССР і звярнуцца ў абком КПБ з просьбай зацвердзіць такое рашэнне.

Па даручэнню Прэзідыума Савета ГТ БССР М.С.Вайтовіч праверыў работу Магілёўскага аддзела. На пасяджэнні Прэзідыума М.С.Вайтовіч далажыў пра стан справы ў Магілёўскім аддзеле. Адзначана, што работа аддзела ў апошні час пагоршылася, што связана з закрыццём геафака ў педінстытуце.

Вырашана падтрымаць кіраўніцтва аддзела, звярнуцца ў абкам КПБ г. Магілёва за дапамогай. У канцы 1975 г. заслухаць справаздачу старшыні аддзела П.А.Лярскага.

У 1975 г. выйшаў з друку зборнік навуковых прац «Геаграфія ў школах і ВНУ Беларусі» (9 др. арк.), які ўключаў 25 артыкулаў.

Прэзідыум Савета ГТ БССР прыняў рашэнне аб правядзенні штогадовай канферэнцыі па выніках навуковых экспедыцыйных даследаванняў, праведзеных у летні час. Для правядзення першай такой канферэнцыі створаны аргкамітэт у складзе В.С.Аношкі, Б.М.Гурскага, Р.А.Жмойдзяка, Ф.С.Фешчанкі. Лепшыя даклады прапанавана ўключаць у тэматычны зборнік.

На пасяджэнні зацверджаны план работы БГТ БССР на верасень 1975 г. – студзень 1976 г. Вырашана правесці экскурсіі членаў таварыства ў Бярэзінскі запаведнік у кастрычніку 1975 г.

На пасяджэнні Прэзідыума ГТ БССР 3 снежня 1975 г. былі прыняты ў члены больш за 30 географаў з розных устаноў, сярод іх: Власаў Б.П., Макрыцкі А.М., Богдэль І.І., Рачэўскі А.М., Гігевіч Г.С., Раманаў В.П., Жабінская Л.Е. і інш. На 1 студзеня 1976 г. таварыства налічвала 327 членаў.

14 студзеня 1976 г. на пасяджэнні Прэзідыума ГТ БССР адбылося абмеркаванне справаздачы за 1975 г. і зацвярджэнне плана работы на І паўгоддзе 1976 г. Абагульняючую справаздачу аб рабоце таварыства ў 1975 г. зачытаў вучоны сакратар В.С.Аношка. Абмяркоўвалася прапанова картфабрыкі аб падрыхтоўцы да перавыдання Атласа БССР. Вырашана падтрымаць прапанову.

У красавіку 1976 г. Геаграфічнаму таварыству быў выдзелены пакой для вядзення арганізацыйнай работы, працы бібліятэкі і размяшчэння фондаў і архіваў.

На пасяджэнні Савета таварыства 21 красавіка 1976 г. ў выніку агульнага абмяркавання былі вызначаны асноўныя накірункі працы ГТ БССР і развіцця геаграфічнай навукі ў Беларусі на бліжэйшыя 5 гадоў. Яны наступныя: 1. Антрапагеннае ўздзеянне на прыроднае асяроддзе; 2. Вывучэнне азёр Беларусі з мэтай іх выкарыстання і аховы; 3. Вывучэнне прыродных ландшафтаў; 4. Пытанні выкладання геаграфіі ў школах і ВНУ; 5. Вывучэнне прыродных і працоўных рэсурсаў; 6. Вывучэнне этнаграфіі, фальклору; 7. Вывучэнне медыцынскай геаграфіі. У далейшым пасля абмеркавання накірункаў у працоўных калектывах распрацаваны пяцігадовы план развіцця Геаграфічнага таварыства і геаграфічнай навукі, які быў зацверджаны на пасяджэнні Прэзідыума ГТ БССР 12 мая 1976 г.

Асноўнымі навуковымі накірункамі вызначаны: 1. Работа ў галіне меліярацыі ландшафтаў. Вывучэнне глебавага покрыва і рацыянальнага выкарыстання меліяраваных зямель. 2. Даследаванні ў галіне геахіміі. 3. Вывучэнне прыродных рэсурсаў. 4. Вывучэнне кліматычных рэсурсаў, працяг феналагічных назіранняў і аднаўленне феналагічнай сеткі. 5. Працы па ахове навакольнага асяроддзя. Сярод арганізацыйных форм асаблівая ўвага павінна ўдзяляцца мерапрыемствам якія праводзяцца сумесна з іншымі грамадскімі таварыствамі (“Веды”, “Ахова прыроды” і інш.). Штогод планавалася праводзіць навуковыя канферэнцыі па выніках навукова-даследчых работ мінулага года. Штогод праводзіць навукова-пазнавальныя

экскурсіі членаў таварыства, весці прапаганду геаграфічных ведаў, рыхтаваць па 1-2 навуковыя зборнікі.

Вырашана прыняць удзел у правядзенні канферэнцыі па ландшафтазнаўству. Канферэнцыю вырашана правесці 15-16 лютага 1976 г. і выдаць тэзісы дакладаў да пачатку канферэнцыі.

14 сакавіка 1976 г. памёр праф. В.Р.Заўрыеў, які шмат гадоў быў членам Савета і намеснікам старшыні ГТ БССР.

12 мая 1976 г. на Прэзідыуме ГТ БССР выступіў С.І. Бялоў са справаздачай аб рабоце аддзялення медыцынскай геаграфіі (г.Віцебск) і П. А. Лярскі аб рабоце Магілёўскага аддзела.

У ліпені-жніўні 1976 г. у г.Маскве праходзіў XXIII Міжнародны геаграфічны кангрэс. У праграме кангрэса прадугледжвалася шмат навуковых экскурсій і сімпозіумаў. Адзін з іх па тэме “Геаграфія насельніцтва” праходзіў 22-26 ліпеня ў г.Мінску. Адказнымі за выкананне праграмы былі Навукова-даследчы інстытут эканомікі і Геаграфічнае таварыства БССР.

29 верасня – 5 кастрычніка 1976 г. на базе БДУ і ГТ БССР адбыўся буйны міжнародны навуковы семінар на тэму: “Рэгіянальныя эканоміка-геаграфічныя праблемы тэрытарыяльнай арганізацыі вытворчых сіл”. У ім прынялі ўдзел вядомыя географы МДУ (Масква): Ю.Г.Саушкін, В.Н.Горлаў, В.Г. Марчукоў, А.Т.Хрушчоў, Т.М.Калашнікаў, М.П.Дзербіна, М.В.Анісаў, І.В.Нікольскі, Е.М. Перцык, О.Э. Бухгольц; Польшчы: В.Кусінскі (Варшаўскі універсітэт), Б.Кортус (Ягелонскі універсітэт), Л.Страшковіч (Лодзінскі універсітэт), Т. Ольшеўскі (Лодзінскі універсітэт), С. Пончка (Лодзінскі універсітэт); Беларусі: М.Т.Раманоўскі, А.Я.Малышаў, Л.В.Казлоўская, Л.А.Паўловіч, Ф.С.Фешчанка, І.І. Трухан. Вынікі падвялі праф. М.Т.Раманоўскі, В.Кусінскі, Ю.Г.Саушкін.

У верасні 1976 г. Савет ГТ БССР выступіў з ініцыятывай вылучыць БелСЭ на Дзяржаўную прэмію БССР.

На працягу 1976 г. праведзена 11 пасяджэнняў Савета і Прэзідыума ГТ БССР, 4 агульныя сходы, 17 пасяджэнняў аддзяленняў і камісій. Праведзена канферэнцыя па выніках навуковай работы.

У 1976 г. была зацверджана Ганаровая грамата ГТ БССР. Упершыню яе атрымалі дацэнты В.А.Навіцкі і С.М.Зубаў у сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння і вялікім укладам у развіццё геаграфіі.

У тым жа годзе былі арганізаваны цыклы тэлевізійных перадач “Геаграфія ў школе” і “Ваша слова, эрудыты”, у якіх прымалі ўдзел Б.М.Гурскі, Р.Я.Рылюк, М.В.Лаўрыновіч, В.С.Аношка і інш.

У студзені 1977 г. Савет ГТ БССР узнагародзіў Ганаровымі граматамі В.К. Бандарчыка і Б.А. Манак за актыўны ўдзел у рабоце ГТ БССР.

Прэзідыум Савета ГТ БССР 20 студзеня 1977 г. выйшаў з прапановай удакладніць назвы форм рэльефа паўночна-заходняй часткі БССР: Браслаўскае ўзвышша, Свенцянскае ўзвышша ( а не грады), Ашмянскае ўзвышша. Прапанова была прынята БелСЭ і ГУГК.

20 красавіка 1977 рашэннем Прэзідыума ГТ БССР створана гехімічная камісія ГТ БССР пад кіраўніцтвам В.К.Лукашова.

Геаграфічнае таварыства БССР атрымала дазвол на выданне часопіса “Пытанні этнаграфіі БССР”.

На пасяджэнні Прэзідыума ГТ БССР 21 верасня 1977 г. было разгледжана пытанне аб утварэнні Беларускага нацыянальнага камітэта географаў. Вырашана разгледзець пытанне канчаткова пасля атрымання дадатковай інфармацыі.

У склад Прэзідыума ГТ БССР уключаны В.М.Шырокаў замест паехаўшага працаваць на Кубу Ф.С.Фешчанкі. 23 лістапада 1977 г. было прынята рашэнне аб правядзенні II з’езда ГТ БССР напрыканцы 1978 г. Створаны аргкамітэт, у склад якога ўвайшлі Махнач А.С., Раманоўскі М.Т., Гурскі Б.М., Польскі С.А., Жмойдзяк Р.А., Аношка В.С., Лярскі П.А., Навуменка В.Я., Шырокаў В.М., Якушка В.П., Жучкевіч В.А., Манак Б.А.

В. С. Аношка прыняў удзел у выязным семінары вучоных сакратароў геаграфічных таварystваў краін эканамічнай узаемадапамогі, які праходзіў па маршруце: Ленінград – Ноўгарад – Пскоў – Тарту – Рыга. Удзельнічала 16 чалавек.

П.А.Каўрыга і В.М.Яцухна былі камандзіраваны Саветам ГТ БССР для ўдзелу ў рабоце канферэнцыі па тэарэтычных праблемах геаграфіі (г.Адэса).

У 1977 г. выйшаў з друку зборнік навуковых прац “Матэматычныя метады ў геаграфіі (фізічнай)” пад рэдакцыяй В.А.Жучкевіча, А.Х.Шкляра і В.П.Якушкі. У тым жа годзе вышла манаграфія С.І.Бялова і М.С.Ратабыльскага “Медыцынская геаграфія Беларусі”, якая рэкамендавана да выдання Вучоным саветам Геаграфічнага таварыства БССР.

18 студзеня 1978 г. Прэзідыум Савета ГТ БССР разгледзеў пытанне аб правядзенні ў 1979 г. Усесаюзнага сімпозіума па меліяратыўнай геаграфіі. Падрыхтоўчая работа даручана В.С.Аношку.

1 сакавіка 1978 г. Прэзідыум Савета ГТ БССР вырашыў звярнуцца ў кіруючыя органы БССР з прапановай выдання штогодняга зборніка навуковых прац ГТ БССР.

У сакавіку 1978 г. было праведзена 2 агульныя сходы членаў ГТ БССР. На сходах заслуханы даклады: М.К. Чартко “Пра V з’езд Усесаюзнага таварыства глебазнаўцаў”; Е.Г.Гуцаў “Вакол Еўропы”; К.Н.Каспараў “Па гарах Сярэдняй Азіі”; М.М.Брылеўскі “Па Забайкаллю”.

28-29 сакавіка 1978 г. адбылася навуковая канферэнцыя, прысвечаная вынікам навукова-даследчых работ географаў за 1977 г. Праграма ўключала 5 пленарных дакладаў (В.Я.Крышчановіч, А.М.Шульгін, С.А. Канстанціновіч, В.Г. Валабуеў, В.П.Якушка) і 36 секцыйных дакладаў (секцыі: ахова ландшафтаў; ахова вод і паветра; ахова глеб і нетраў). У 1978 г. выйшаў з друку зборнік навуковых прац “Развіццё галін народнай гаспадаркі за годы савецкай улады”.

17 мая 1978 г. у БДУ адбыўся семінар вучоных сакратароў абласных аддзелаў ГТ БССР. Яго праводзілі В.А.Жучкевіч і В.С.Аношка.

5-6 снежня 1978 г. адбыўся другі з’езд ГТ БССР. Ён праходзіў у памяшканні геаграфічнага факультэта БДУ. Адкрыў з’езд уступным словам акадэмік А.С.Махнач. З навуковым дакладам: “Геаграфічнае таварыства БССР за 25 гадоў. Развіццё геаграфічнай навукі Беларусі за 60 гадоў”, выступіў В.А.Жучкевіч. Даклад утрымліваў інфармацыю аб рабоце таварыства пасля I з’езда (1975 г.). Справаздачу аб рабоце рэвізійнай камісіі зрабіла В.П.Якушка.

На з’ездзе член Прэзідыума ГТ СССР праф. С.Б.Лаўроў абвясціў рашэнне Прэзідыума ГТ СССР і ўручыў узнагароды беларускім географам.

Р Е Ш Е Н И Е
ПРЕЗИДИУМА ГЕОГРАФИЧЕСКОГО ОБЩЕСТВА СССР
от 27 ноября 1978 г.

Присутствуют: Президент Географического общества член-корр. АН СССР А.Ф.Трешников, члены президиума: проф. А.Г. Воронов, А.Г.Исаченко, В.С.Преображенский, Л.Е.Родин, К.А.Салищев, П.Г.Сутягин, Л.И.Сенчура, председатель ревизионной комиссии ГО СССР П.Т.Галков.

Постановили: За заслуги перед советской географией и Географическим Обществом СССР н а г р а д и т ь Почетными грамотами Географического общества СССР:

1. Аношко Валерия Станиславовича
2. Андрющенко Онуфрия Нестеровича
3. Горецкого Гаврилу Ивановича
4. Гурского Бориса Николаевича
5. Жмойдяка Ростислава Афанасьевича
6. Жучкевича Вадима Андреевича
7. Лукашева Константина Игнатьевича
8. Польского Спартака Александровича
9. Романовского Николая Тарасовича
10. Трухана Ивана Ивановича
11. Якушко Ольгу Филипповну
12. Юрцевич Нину Степановну

Президент
Географического Общества СССР
Член-корреспондент АН СССР А.Ф.Трешников

Ученый секретарь общества Л.И.Сенчура

На з’езд прыехаў 51 выбраны дэлегат, тры прадстаўнікі Прэзідыума ГТ СССР (Л.І.Сенчура, П.Г.Суцягін, С.Б. Лаўроў), Прэзідэнт ГТ Літвы А.Б.Басалікас, Прэзідэнт ГТ ГДР Б.Барт.

З прывітальным словам і навуковымі дакладамі выступілі: С.Б.Лаўроў, Б. Барт і А.Б.Басалікас.

З навуковымі дакладамі выступілі: акадэмік Г.І.Гарэцкі, праф.В.П.Якушка, праф. В.М.Шырокаў, праф.І.І.Трухан і інш.

У спрэчках выступілі: В.Е.Пашук, В.Я.Харэўскі, Б.Р.Паўчынскі, С.І.Спіжанкоў, Я.А.Якубоўскі, Л.І.Цегака, П.А.Лярскі, С.А.Польскі.

На з'ездзе быў выбраны новы склад Савета з 15 чалавек і рэвізійнай камісіі. На базе камісіі па навуковай і прыкладной геахіміі створана аддзяленне геахіміі.

8 снежня 1978 г. адбылося першае пасяджэнне новага Савета, на якім былі размеркаваны абавязкі сярод членаў Савета: старшынёй (прэзідэнтам) ГТ БССР абраны В.А.Жучкевіч, намеснікамі: В.С.Аношка, Р.А.Жмодзяк, В.М.Шырокаў, вучоным сакратаром – В.А.Калечыц. Старшынёй аддзялення фізічнай геаграфіі абраны А.Е.Агаханянц (сакратар А.В.Кажарынаў); эканамічнай геаграфіі – С.А.Польскі (сакратар Б.А.Манак); этнаграфіі – В.К.Бандарчык (сакратар М.К.Алісіевіч). Кіраўніком Брэсцкага аддзела абраны В.Я.Навуменка, Гродзенскага – Л.Л. Курстак; Магілёўскага – П.А.Лярскі, Гомельскага – В.М.Валавікова. Старшынёй рэвізійнай камісіі – В.П.Якушка.

У прынятай з'ездам ГТ БССР пастанове вызначаны шляхі развіцця геаграфічнага таварыства, задачы і мэты. Вырашана наступны (трэці) з'езд правесці ў 1983 г. Гэта быў крок, набліжаючы стыль і рэжым працы ГТ БССР к ГТ СССР. Работа Савета ГТ БССР стала больш арганізаванай, сістэмнай, асноўная ўвага пры гэтым пачала ўдзяляцца буйным мерапрыемства.

На пасяджэнні Савета ГТ БССР 10 студзеня 1979 г. вырашана падтрымаць прапанову III Усесаюзнага сімпозіума па меліяратыўнай геаграфіі (Харкаў, 1978) аб правядзенні IV сімпозіума у г.Мінску на базе ГТ БССР і БДУ. Створана рабочая група па падрыхтоўцы сімпозіума ў складзе: А.Р. Мядзведзеў, В.С.Аношка, Р.А.Жмойдзяк, Т.А. Раманава, В.А.Калечыц. Зацверджана інфармацыйнае пісьмо, якое павінна быць разаслана ўсім геаграфічным таварыствам СССР і іх буйным аддзелам. 27 лютага на пасяджэнні Прэзідыума ГТ БССР В.С. Аношка далажыў аб падрыхтоўцы да сімпозіума (атрыманы заяўкі на 46 дакладаў ад географаў Масквы, Ленінграда, Рыгі, Роўна, Таліна, Кіева, Уфы, Адэсы, Пермі і інш.). Зацверджана структура праграмы і тэкст другога інфармацыйнага пісьма. На плянарныя пасяджэнні вынесены даклады М.І.Будыкі, В.Ф.Шэбекі, С.Г. Скарапанава, А.М.Алпацьева, У.С.Жэкуліна, В.П.Якушкі, А.Р.Мядзведзева, В.С.Аношкі, В.М. Шырокава, В.М.Плужнікава. Атрымана падтрымка рэктарата аб правядзенні сімпозіума ў актавай зале БДУ.

На пасяджэнні Савета ГТ БССР 11 красавіка 1979 г. вырашана пачаць падрыхтоўку да VII з'езда ГТ СССР, які адбудзецца ў пачатку 1980 г. На гэтым жа пасяджэнні ў члены ГТ БССР прыняты рэктар БДУ акадэмік В.А.Белы.

11 мая 1979 г. Савет ГТ БССР дэталёва разгледзеў навуковыя артыкулы, прапанаваныя ў зборнік "Праблемы рассялення ў БССР". Прапанавана

дапрацаваць артыкулы. Навуковым рэдактарам зборніка зацверджаны С.А.Польскі.

У 1979 г. было праведзена 5 агульных сходаў, прысвечаных у асноўным справаздачам аб вандроўках географаў: В.К.Бандарчык – “Па Індыі і Афганістане”; У.І. Ганапольскі – “Па горнай краіне Чэрскага”; В.А.Калечыц – “Па Кеніі”; С.С.Гусеў – “Сіхотэ-Алінскі запаведнік”.

28-31 студзеня 1980 г. адбыўся IV Усесаюзны сімпозіум па меліярацыйнай геаграфіі. У яго рабоце прынялі ўдзел 116 навукоўцаў, у т.л. 28 дактароў навук, 67 кандыдатаў. Адным з рашэнняў сімпозіума было: прасіць ГТ БССР узначаліць работу па абагульненню звестак аб уздзеянні меліярацыі на прыродныя комплексы Беларускага Палесся за 100 - гадовы перыяд, хадатайнічаць перад Міністэрствам вышэйшай адукацыі аб адкрыцці новай спецыяльнасці “меліярацыйная геаграфія” і адкрыцці адпаведных падраздзяленняў на геафаках Беларускага і Пермскага універсітэтаў. Вырашана наступны сімпозіум па меліяратыўнай геаграфіі правесці на базе Пермскага аддзела ГТ СССР і Пермскага дзяржаўнага універсітэта.

16 красавіка 1980 г. па прапанове геаграфічнай рэдакцыі БелСЭ, адбылося пашыранае пасяджэнне Савета ГТ БССР, з мэтай надання назваў безымянным аб’ектам БССР. Былі зацверджаны найменні 47 азёрам і 18 вадасховішчам. На гэтым жа пасяджэнні Савета абмеркаваны кандыдатуры дэлегатаў і ўдзельнікаў VII з’езда ГТ СССР, які адбудзецца ў г.Фрунзе. Дэлегатаў было вырашана абраць тайным галасаваннем на агульным сходзе членаў ГТ БССР 21 красавіка 1980 г. Дэлегатамі абраны: Агаханянц А.Е., Аношка В.С., Бандарчык В.К., Жучкевіч В.А., Польскі С.А., Хоміч А.А., Якушка В.П. Дадаткова ў лік удзельнікаў з’езда ГТ БССР вырашана паслаць В.М.Шырокава і В.А.Калечыца.

Па рашэнню Савета ГТ БССР 2-4 чэрвеня 1980 г. адбылася творчая сустрэча (семінар) членаў ГТ БССР, Беларускага аддзялення Савецкай сацыялагічнай асацыяцыі і Савета перспектыўнага планавання развіцця г.Мінска на тэму: “Сацыяльна – эканамічныя праблемы вялікіх гарадоў і шляхі іх вырашэння (на прыкладзе г.Мінска)”. Па выніках абмеркавання была прынята пастанова, якую накіравалі ва ўсе ўрадавыя органы, маючыя дачыненне да праблем развіцця г.Мінска.

У рабоце VII з’езда ГТ СССР, які адбыўся ў г.Фрунзе Кіргізскай ССР 22-27 верасня 1980 г., прынялі ўдзел дэлегаты і прадстаўнікі ГТ БССР. На з’ездзе былі даклады зрабілі наступныя беларускія географы: С.А.Польскі, Р.А. Дунаева, І.Г. Хасдан, І.А. Іода, А.В. Багдановіч, В.С. Аношка, Е.Л.Яновіч, Е.С. Туромская, В.П. Якушка, Л.В. Казлоўская, Н.К. Кліцунова, Г.І. Марцынкевіч, А.Р. Мядзведзеў, І.І. Пірожнік, У.М. Зайцаў, В.М. Губін, Ю.П. Качкоў, Ф.Е. Шалькевіч, В.В. Дрозд, Б.В. Фашчэўскі, В.М. Плужнікаў, А.Е. Агаханянц, А.В. Малахаў, Л.А. Лісоўскі, Б.М. Гурскі, В.А. Жучкевіч, С.М. Зубаў, В.А. Яроміна, В.М. Яцухна У склад кіруючых органаў на з’ездзе выбраны: В.П. Якушка – членам вучонага Савета ГТ СССР; В.С. Аношка – членам рэвізійнай камісіі ГТ СССР. Сярод рашэнняў з’езда было: “…..

даручыць Вучонаму савету ГТ СССР хадатайнічаць перад Прэзідыумам АН СССР аб арганізацыі Інстытута геаграфіі АН БССР”.

На пасяджэнні Прэзідыума ГТ БССР 11 лютага 1981 г. прынята рашэнне аб адраджэнні феналагічнай камісіі пры таварыстве. Кіраўніком феналагічнай камісіі стаў П.А. Каўрыга. Ён прапанаваў план работы камісіі на бліжэйшы год.

18 сакавіка 1981 г. у сувязі з 60-годдзем В.П.Якушкі адбылося пасяджэнне Савета ГТ БССР. В.П. Якушка ўзнагароджана Ганаровай Граматай ГТ СССР і Граматай ГТ БССР, аб яе жыцці і дзейнасці былі напісаны артыкулы ў Весніку БДУ (В.С.Аношка, В.А. Калечыц) і Известиях Всесоюзного Географического общества (В.А. Жучкевіч, М.Т.Раманоўскі).

У сувязі з тым, што колькасць географаў у Магілёўскім аддзеле скарацілася, вырашана пераўтварыць аддзел у камісію школьнай геаграфіі. Замест Магілёўскага аддзела прапанавана стварыць Віцебскі аддзел ГТ БССР, захаваўшы пры гэтым камісію па медыцынскай геаграфіі.

У снежні 1981 г. на Прэзідыуме ГТ БССР адбылося абмеркаванне навуковага зборніка “Пытанні адпачынку і турызма ў БССР”. Змест і структуру зборніка далажыў І.І. Пірожнік. Вырашана змяніць назву зборніка ў “Геаграфія адпачынку і турызма ў БССР” і ўключыць яго ў план выдання 1983 г. Адказным за падрыхтоўку зборніка да друку прызначаны І.І.Пірожнік. Вырашылі штогадовую канферэнцыю па выніках навуковой працы за 1981 г. правесці ў сакавіку 1982 г.

10-11 сакавіка 1982 г. адбылася чарговая канферэнцыя “Вынікі навуковай працы за 1981 г.”. Было зроблена 19 навуковых дакладаў, прысутнічала больш за 60 чалавек.

З 25 мая па 3 чэрвеня 1982 г. у Ленінградзе прайшоў першы Міжнародны семінар кіраўніцтва Геаграфічных таварыстваў краін Савета эканамічнай узаемадапамогі (СЭВ). Адбыўся абмен вынікамі працы. Ад ГТ БССР удзел у семінары прымаў В.С.Аношка.

14 кастрычніка 1982 г. на пашыраным пасяджэнні Вучонага савета ГТ БССР абмяркоўвалася магчымасць правядзення VIII з’езда ГТ СССР у Мінску. Вучоны сакратар ГТ СССР Л.І.Сенчура, які прысутнічаў на пасяджэнні, зачытаў пісьмо Прэзідэнта ГТ СССР А.Ф.Трошнікава на імя Першага Сакратара ЦК КПБ Ц.Я.Кісялёва з прапановай правесці з’езд ГТ СССР ў г.Мінску. Прапанова абгрунтоўвалася вялікімі поспехамі беларускіх географаў, асабліва ў галінах меліярацыйнай геаграфіі, чацвярцічнай геалогіі, азёразнаўства, глебазнаўства і інш.

Географическое Общество<br>Союза ССР<br>Ленинград, центр<br>пер. Гривцова дом № 10

Первому секретарю Центрального<br>Комитета компартии Белоруссии<br>товарищу Т.Я.Киселеву

Глубокоуважаемый Тихон Яковлевич!

30.IX.82 г. № 827
О проведении VIII съезда
Географического общества
АН СССР в г.Минске

Географическое общество АН СССР, насчитывающее в своих рядах около 40 тысяч действительных членов и более 600 членов-коллективов, в соответствии с уставом через каждые 5 лет проводит географические съезды. Большое внимание на съездах уделяется научной программе.

Основные задачи очередного географического съезда: подвести итоги и наметить перспективы географического изучения широкого круга проблем, связанных с повышением эффективности сельскохозяйственного производства агропромышленного комплекса СССР. В этой связи предполагается рассмотреть как социально-экономические, так и экологичексие вопросы (проблемы мелиорации земель, трудовых ресурсов, охраны природы и рационального использования природных ресурсов и др.).

На съезде будут также обсуждаться проблемы методологии науки, географического образования и пропаганды географических знаний среди населения.

Географические съезды проходили в Москве, Ленинграде, Киеве, Тбилиси и последний в 1980 г. в г.Фрунзе.

Нам известны серьезные успехи ученых Белорусской ССР в развитии мелиоративной географии, решении ряда социально-экономических и экологических проблем. Поэтому Географическое общество АН СССР обращается к Вам с просьбой провести очередной VIII съезд географов в столице Белорусской ССР г.Минске осенью 1985 г., количество участников – 600 делегатов и 200 гостей.

С искренним уважением
Академик (подпись) А.Ф.Трешников

У абмяркаванні прынялі ўдзел Агаханянц А.Е., Жучкевіч В.А., Гурскі Б.М., Сенчура Л.І., Калечыц В.А. і інш. Вырашылі інфармацыю прыняць да ведама, канчатковае рашэнне прыняць пазней, пасля ўзгаднення пытання з кіруючымі органамі.

На пасяджэнні Прэзідыума ГТ БССР 1982 г. вырашана ў склад Савета ГТ БССР увесці кіраўніка актыўна працуючага геахімічнага семінара В.К.Лукашова.

9-10 снежня 1982 г. адбылася навукова-метадычная нарада па феналагічных даследаваннях у Беларусі. У яе рабоце прынялі ўдзел больш за 80 чалавек, з 10 устаноў Беларусі, а таксама навукоўцы Ленінграда, Масквы, Краснаярска і інш. Вырашылі значна актывізаваць работу феналагічнай камісіі.

На пашыраным пасяджэнні Савета ГТ БССР 29 студзеня 1983 г. была заслухана справаздача аб рабоце ГТ БССР за 1982 г. Справаздачу зачытаў

В.С.Аношка, заключэнне рэвізійнай камісіі – В.П.Якушка, план работы на 1983 г. – В.А.Жучкевіч.

Наступнае пашыранае пасяджэнне Савета 11 красавіка 1982 г. было цалкам прысвечана пытанням падрыхтоўкі да III з’езда ГТ БССР. Выступілі В.А.Жучкевіч, В.А.Калечыц, В.М.Шырокаў, А.В.Невераў, Б.А.Манак, А.Е.Агаханянц, В.С.Аношка, В.К.Бандарчык. Пастанавілі: 1. III з’езд ГТ БССР правесці ў кастрычніку 1983 г. у Гомелі. 2. Зацвердзіць арганізацыйны камітэт у складзе: В.А.Жучкевіч – старшыня, А.В.Малахаў – намеснік, В.М.Шырокаў – намеснік, Р.А.Жмайдзяк – намеснік старшыні; члены аргкамітэта: В.А.Калечыц, В.П.Якушка, В.С.Аношка, С.А.Польскі, А.Е.Агаханянц, Б.А.Манак, А.А.Хоміч, а таксама прадстаўнікі ад ўсіх абласных аддзелаў. 3. Дэлегатаў на з’езд выбіраць па аднаму ад 20 членаў ГТ БССР. 4. Дакладчыкі навуковых дакладаў удзельнічаюць у рабоце з’езда без права галасавання. 5. Прасіць Гомельскі аддзел надрукаваць матэрыялы (тэзісы дакладаў) з’езда.

Аб гатоўнасці да правядзення з’езда арганізацыйны камітэт далажыў на пасяджэнні Савета 7 верасня 1982 г.. Вырашана праграму і запрашэнне на з’езд друкаваць ў колькасці 200 экз.; зборнік тэзісаў дакладаў назваць “III з’езд Геаграфічнага таварыства БССР (тэзісы дакладаў)”; рэгістрацыю ўдзельнікаў з’езда праводзіць у памяшканні Гомельскага педінстытута 18 кастрычніка з 16 да 20 гадзін.



ГЕОГРАФИЧЕСКОЕ ОБЩЕСТВО БССР

ПРИГЛАСИТЕЛЬНЫЙ БИЛЕТ
И
П Р О Г Р А М М А
III СЪЕЗДА
географического общества БССР
(19–21 октября)

ГОМЕЛЬ
1983

III з’езд ГТ БССР адбыўся 19-21 кастрычніка 1983 г. у Гомелі на базе Гомельскага педінстытута. Ад выбраных 48 дэлегатаў на з’езд прыехалі 41: Мінск – 19 (Агаханянц А.Е., Аношка В.С., Андрыеўская З.Я., Бандарчык В.К., Гурын М.М., Жураўская Н.І., Жучкевіч В.А., Казлоўская Л.В., Калечыц В.А., Канстанціновіч С.А., Лукошка Г.М., Манак Б.А., Пракапеня В.А., Польскі С.А., Раманава Т.А., Раманоўскі М.Т., Рогач П.І., Салівон І.І., Шырокаў В.М., Якушка В.П.); Брэст – 2 (Мяшэчка В.М., Амельянчук М.В.); Гродна – 1 (Разуванаў В.Г.); Гомель – 16 (Бурак Ф.Ф., Войцік Э.К., Малахаў А.В., Невераў А.В., Мітраховіч О.І., Паджараў В.К., Расашка І.Ф., Савіцкі Б.П., Сіліцава В.М., Сакалова А.А., Сцерын Л.З., Татарынаў А.А., Ціханскі

А.Д., Ільінчык З.К., Шымаў В.М., Пашук У.Я.). У з’ездзе прымалі ўдзел прадстаўнікі цэнтральнай арганізацыі (Ленінград) Е.С.Караткевіч, Л.І.Сенчура і С.В. Шчогалева.

У першы дзень работы з’езда (19 кастрычніка) з навуковымі дакладамі выступілі: М.Т.Раманоўскі, В.А.Жучкевіч, В.П.Якушка, В.А.Калечыц, Н.І.Жураўская, Т.А.Раманава, В.С.Аношка, Б.А.Манак, В.М.Шырокаў, Б.М.Гурскі, С.А.Польскі, В.К.Бандарчык, А.А.Малахаў, У.М.Шымаў, А.В.Невераў, Б.П.Савіцкі і інш., усяго 19 чалавек.

20 кастрычніка 1983 г. адбыліся справаздачна – выбарчыя мерапрыемствы з’езда. Справаздачны даклад зрабіў В.А.Жучкевіч, справаздачу аб рабоце рэвізійнай камісіі – В.П. Якушка, аб рабоце абласных аддзелаў: А.А.Малахаў (Гомель), М.В.Амельянчук, В.Я.Навуменка (Брэст). З дакладам мандатнай камісіі выступіў У.Я.Пашук.

У абмеркаванні справаздачы прынялі ўдзел С.А.Польскі, А.Е.Агаханянц, М.Т.Раманоўскі, Я.С.Караткевіч.

З’езд аднагалосна абраў Аношку В.С. Прэзідэнтам ГТ БССР.



Аношка Валерый Станіслававіч (н. 13.09.1938 г. в. Гайдукова Слабодка Чэрвеньскага р-на Мінскай вобл.), беларускі вучоны ў галіне фізічнай

геаграфіі. Доктар геаграфічных навук (1990), прафесар (1991). Скончыў БДУ (1963). З 1964 выкладае ў БДУ. Навуковыя працы па геаграфічнаму прагназаванню, меліярацыйна-геаграфічнаму раянаванню тэрыторыі Беларусі, маніторынгавых геаграфічных даследаваннях. Адзін з заснавальнікаў меліярацыйна-інжынернай геаграфіі. Распрацаваў канцэпцыю і склаў карту тэхнагеннай парушанасці прыродных комплексаў Беларусі. Аўтар падручніка па меліярацыйнай геаграфіі. Прэзідэнт Беларускага геаграфічнага таварыства (з 1983). Творы: Географические основы мелиорации. Мн., 1974; Мелиоративная география Белоруссии. Мн., 1978; Основы географического прогнозирования. Мн., 1985 (разам с В.М.Шырокавым, А.М.Трафімавым); Рациональное природопользование Белорусского Поозерья. Мн., 1993 (у сааўт.); Гісторыя развіцця глебазнаўства Беларусі. Мн., 2000; Агульная геаграфія (падручнік для 10 класа). Мн.,2001 (у сааўт.); Инженерная география с основами прогнозирования. Мн.,2002.

Быў абраны наступны склад Вучонага савета: А.Е.Агаханянц, В.С.Аношка, А.Г.Грыневіч, Б.М.Гурскі, В.А.Жучкевіч, В.А.Калечыц, Л.В.Казлоўская, С.А.Канстанціновіч, Э.А.Ляўкоў, А.А.Малахаў, Б.А.Манак, У.Я.Навуменка, С.А.Польскі, Т.А.Раманава, В.М.Шырокаў, В.К.Бандарчык. У склад рэвізійнай камісіі ўвайшлі: В.П.Якушка (старшыня), М.С.Вайтовіч, Н.І.Жураўская, В.У.Кадацкая (сакратар), Н.С.Юрцэвіч (намеснік старшыні).

З’езд прыняў рэзалюцыю (заключэнне), у якой вызначаны накірункі далейшай працы ГТ БССР. Важнейшымі пунктамі рэзалюцыі былі: даручыць вучонаму Савету ГТ БССР аднавіць хадатайніцтва перад Прэзідыумам АН СССР аб адкрыцці ў Беларусі НДІ геаграфіі; актывізаваць работу па падрыхтоўцы і выпуску Атласа БССР; хадатайнічаць перад Саветам Міністраў БССР і БДУ аб адкрыцці на геафаку БДУ спецыяльнасцей “геамарфалогія” і “турызм і краязнаўства”; распрацаваць Палажэнне аб медалі І.Д.Чэрскага і інш.

2 лістапада 1983 г. на геаграфічным факультэце БДУ адбылося першае пасяджэнне новага савета ГТ БССР. Была зацверджана новая структура ГТ БССР. У склад Прэзідыума савета ГТ БССР увайшлі: Аношка В.С. – прэзідент ГТ, Казлоўская Л.В., Гурскі Б.М., Шырокаў В.М. – віцэ-прэзідэнты і вучоны сакратар Калечыц В.А. Створаны аддзяленні, кіраўнікамі якіх зацверджаны: фізічнай геаграфіі – старшыня Агаханянц А.Е.; эканамічнай і сацыяльнай геаграфіі – Польскі С.А.; этнаграфіі – Бандарчык В.К.; медыцынскай геаграфіі – С.І. Бялоў. Кіраўнікамі аддзелаў сталі: Брэсцкага – Навуменка У.Я.; Гомельскага – Малахаў А.В.; Гродзенскага – Разуванаў В.Г.; Мінскага – Гурскі Б.М. Кіраўнікамі створаных камісій зацверджаны: геаграфіі насельніцтва – Манак Б.А.; геаграфіі сельскай гаспадаркі – Жураўская Н.І.; вучэбнай і школьнай геаграфіі – Андрыеўская З.Я.; турызму і краязнаўства – Піражнік І.І.; гідралагічнай – Шырокаў В.М.; праблем картаграфіі – Жмойдзяк Р.А.; антрапагенных ландшафтаў – Яцухна В.М.; геамарфалогіі і палеагеаграфіі – Ляўкоў Э.А.; феналогіі – Каўрыга П.А.; тапанімікі – Жучкевіч В.А.; меліярацыйнвй геаграфіі – Аношка В.С.; праблем Палесся – Малахаў А.В. (Гомель), Навуменка У.Я.(Брест).

Пры Савеце ГТ БССР створаны групы: рэдакцыйна-выдавецкая (старшыня Шырокаў В.М.), комплекснай геаграфічнай экспертызы (Раманава Т.А.), а таксама навукова-метадычны савет (старшыня Агаханянц А.Е.). Вырашана пасяджэнне Вучонага савета ГТ БССР праводзіць 1 раз у квартал, аддзяленняў і камісій на радзей 1 раза ў месяц, агульныя сходы 1-2 разы ў год. Усе падраздзяленні складаюць планы работы, якія павінны знаходзіцца ў справах Вучонага савета ГТ БССР.

У лістападзе 1983 г. на пасяджэнні Вучонага савета ГТ БССР прайшло абмеркаванне першага тома Энцыклапедыі прыроды Беларусі, ініцыятарам падрыхтоўкі якой было ГТ БССР. Выступілі Я.А.Якубоўскі, В.С.Аношка, В.П.Якушка, А.Р.Булаўка, Э.А.Ляўкоў. Выказаныя заўвагі перадалі ў рэдкалегію ЭПБ. У склад рэдкалегіі ЭПБ уваходзілі В.А.Жучкевіч, В.П.Якушка, навуковымі кансультантамі былі: В.С.Аношка, Б.М.Гурскі, Э.А.Ляўкоў, А.А.Хоміч, В.Р.Сінякова і інш.

Выконваючы рашэнні III з’езда ГТ БССР, Вучоны савет ГТ БССР даручыў Аношку В.С., Матвееву А.В., Ляўкову Э.А. падрыхтаваць абгрунтаванне неабходнасці стварэння ў АН БССР НДІ геаграфіі, распрацаваць яго структуру і падрыхтаваць адпаведныя пісьмы ў Прэзідыум АН СССР, Савет ГТ СССР і дырэктыўныя органы БССР.

Географы Беларусі цесна супрацоўнічалі з калегамі Польшчы, Балгарыі, Швецыі і іншых краін. У 1983 г. выйшла з друку сумесная манаграфія «Антрапагенізіраваныя ландшафты Беларусі і Балгарыі (911 стар., аўтары: В.П.Якушка, Г.І. Марцынкевіч, П.В.Петраў, А.С.Велчаў).

Увесь 1984 г. прайшоў пад знакам 30-годдзя Геаграфічнага таварыства БССР.

На пасяджэнні Вучонага савета ГТ БССР 1 лютага 1984 г. адзначана, што ўсе падраздзяленні маюць памесячныя планы работы на 1984 г., якія пачалі актыўна рэалізавацца.

На агульныя сходы членаў ГТ БССР у 1984 г. выносяцца такія важныя для Беларусі пытанні: 1. Гідраграфія Мінска – мінулае, сучаснае, будучае; 2. Абмеркаванне геаграфічнай экспертызы праекта абвалавання р.Прыпяці (з запрашэннем аўтара праекта А.Д.Буткевіча і ўсяго аўтарскага калектыву); 3. Метады і практыка прагназіравання праблем аховы прыроды ў БССР; 4. Комплексная геаграфічная ацэнка энцыклапедыі прыроды Беларусі (т.т.1,2); 5. Вопыт арганізацыі працы Геаграфічнага таварыства ЧССР і інш.

Вырашана аказваць дзейсную дапамогу Свольнінскай сярэдняй школе Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці ў арганізацыі музея І.Д.Чэрскага і асабіста ініцыятару гэтага мерапрыемства настаўніку Барысу Філіпавічу Шымуку. Прэзідыум савета ГТ БССР звярнуўся ў музей ГТ СССР з просьбай перадаць Б.Ф.Шымуку захоўваемыя там матэрыялы, звязаныя з І.Д.Чэрскім. Была арганізавана вандроўка групы студэнтаў (больш за 20 чалавек) на радзіму І.Д.Чэрскага з мэтай дапамогі ў арганізацыі музея. Запланавана пасяджэнне Вучонага савета ГТ БССР на радзіме І.Д.Чэрскага.

Упершыню беларускія географы прынялі ўдзел у штогоднім семінары – “Усесаюзнай Рэпінскай школе”, які арганізуецца ГТ СССР у Рэпіна

Ленінградскай вобл. Ад Беларусі ўдзельнічалі В.А.Яроміна і В.Р.Сінякова. Тэма семінара: "Актуальныя пытанні прапаганды геаграфічных ведаў" (16-19 сакавіка 1984 г.). У сакавіку 1984 г. Б.А.Манак вывучала вопыт работы Геаграфічнага таварыства Грузінскай ССР. Справаздачы В.А.Яромінай, В.Р.Сіняковай і Б.А.Манак зроблены на пасяджэнні Савета ГТ БССР. 29 сакавіка 1984 г., якое праводзілася сумесна з саветам таварыства "Веды". На гэтым пасяджэнні быў заслуханы даклад У.А.Навіцкага "Аб асноўных накірунках удасканалення прапаганды навук аб Зямлі ў свеце патрабаванняў чэрвенскага (1983 г.) Пленума ЦК КПСС.

На пашыраным пасяджэнні Вучонага савета ГТ БССР 10 мая 1984 г. разглядалася пытанне падрыхтоўкі VIII з'езда ГТ СССР. Дэталёвае паведамленне зрабіў Аношка В.С. Вырашана даручыць Прэзідыуму Савета ГТ БССР зрабіць да 1 кастрычніка адбор дакладаў беларускіх географаў на з'ездзе. На гэтым пасяджэнні прынялі ўдзел у якасці калектыўных членаў ГТ БССР калектывы выдавецтваў "Універсітэцкае" і "Вышэйшая школа".

Вырашана хадайнічаць перад выдавецтвам аб выданні манаграфіі калектыву аўтараў АН БССР "Рэльеф Беларусі".

Актывізавалася работа па прыёму ў ГТ БССР маладых географаў. Толькі за 1984 г у ГТ прынята больш за 90 географаў Беларусі.

За 1984 г. Геаграфічным таварыствам праведзена 6 навуковых канферэнцый: "Канструктыўныя задачы геаграфічных даследаванняў у БССР", "Сучасныя праблемы аховы і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў", "100 гадоў з дня нараджэння Я.М.Паўлоўскага", "Сацыяльна-эканамічныя і горадабудаўнічыя праблемы ўзаемнага развіцця населеных месцаў БССР", "Актуальныя эканамічныя праблемы і шляхі павышэння эфектыўнасці грамадскай вытворчасці ў рэспубліцы", "Малыя рэкі БССР, іх выкарыстанне і ахова". Па выніках канферэнцый надрукаваны зборнікі тэзісаў.

У кастрычніку 1984 г. праведзены семінар "Феналагічныя з'явы ў Беларусі: метады іх картаграфавання і прагназавання". Створаны навукова-метадычны цэнтр па феналагічных назіраннях і даследаваннях на базе Інстытута эксперыментальнай батанікі АН БССР пад кіраўніцтвам І.Д.Юркевіча.

У 1984 г. выйшаў з друку зборнік навуковых прац па праграмме XXV Міжнароднага геаграфічнага кангрэса "Прыродныя і сацыяльна-эканамічныя ўмовы Беларускай ССР" (рэдактары: В.М.Шырокаў, М.Т.Раманоўскі).

Работа ГТ БССР 1985 г. у асноўным было накіравана на падрыхтоўку да VIII з'езда ГТ СССР.

На пасяджэнні Вучонага Савета 31 студзеня 1985 г. абмеркаваны і прапанаваны для зацвярджэння на агульным сходзе наступныя кандыдатуры ад БССР у ганаровыя члены ГТ СССР В.П. Якушка., В.А.Жучкевіч, А.Р. Мядзведзеў, А.Е. Агаханянц. Улічваючы, што ў лютым 1985 г. Геаграфічнае таварыства СССР у г.Ленінградзе праводзіць Дзень Беларускай ССР вырашана паслаць для ўдзелу ў мерапрыемствах з навуковымі дакладамі Аношку В.С., Гурскага Б.М., Казлоўскую Л.В.

Вырашана прадставіць манаграфію А.Е.Агаханянца “Арыдныя горы СССР (прырода і геаграфічныя мадэлі флорагенезу)” да ўзнагароджання Залатым медалём ГТ СССР імя М.М.Пржэвальскага.

Ганаровымі граматамі ГТ БССР узнагароджаны Г.І.Гарэцкі і Т.А.Раманава ў сувязі з іх юбілеямі.

У 1985 г. адбыўся агульны сход членаў ГТ БССР, на якім абраны дэлегаты на VIII з’езд ГТ СССР ад БССР. Шляхам тайнага галасавання былі абраны: В.С. Аношка, В.К. Бандарчык, Б.М.Гурскі., Л.В. Казлоўская., А.А.Хоміч., В.М.Шырокаў, В.П. Якушка. Вырашана падтрымаць географаў, якія будуць рабіць навуковыя даклады на з’ездзе, шляхам частковай аплаты камандзіровачных выдаткаў.

У чэрвені 1985 г. вышаў з друку зборнік навуковых артыкулаў “Геаграфія і праблемы рэгіянальнага развіцця Беларусі” па праграмме VIII з’езда ГТ СССР. У зборнік ўвайшлі 24 навуковыя артыкулы, зборнік падрыхтаваны пад агульнай рэдакцыяй В.М.Шырокава, В.С.Аношкі, Б.М.Гурскага, Б.А.Манак.

У красавіку 1985г. адбылася сустрэча географаў Беларусі з кінадакументалістамі “Летапіс” у Доме кіно. На сустрэчы выступілі: В.С. Аношка, Л.В.Казлоўская, рэжысёры члены ГТ БССР В.Сукманаў, Р.Ясінскі. Былі прагледжаны дакументальныя кінафільмы “10 хвілін аб 10 000 000”, “Вяртанне ў першы снег”. Прысутнічала больш за 80 чалавек.



КАЛЕНДАРНЫЙ ПЛАН

РАБОТЫ РЕСПУБЛИКАНСКОГО ДОМА КИНО И СЕКЦИЙ СОЮЗА КИНЕМАТОГРАФИСТОВ БССР

*Апрель—май 1985 года*

г. Минск

18 АПРЕЛЯ ЧЕТВЕРГ

Секция документального кино СК БССР

Географическое общество БССР

Навстречу XXVII съезду КПСС

«Перспективы развития народного хозяйства Белорусской ССР»

Встреча кинодокументалистов с Президентом географического общества БССР **В. С. Аношко**

Кинопрограмма

Начало в 19 час.

Отв. Р. З. Ясинский
И. Б. Абрамова

27

У верасні 1985 г. на імя Савета ГТ БССР паступіў зварот Саветаў Харкаўскага, Калінінградскага, Адэскага, Ровенскага, Пермскага аддзелаў і Маскоўскага філіяла ГТ СССР з прапановай падтрымаць іх ініцыятыву па стварэнню Камітэта па меліярацыйнай геаграфіі пры Вучоным савеце ГТ СССР пад кіраўніцтвам віцэ-прэзідэнта У.С.Жэкуліна. Савет ГТ БССР падтрымаў ініцыятыву географаў.

2-6 кастрычніка 1985 г. адбыўся VIII з'езд ГТ СССР (г.Кіеў). У рабоце з'езда прымалі ўдзел больш за 20 беларускіх географаў. Членам арганізацыйнага камітэта з'езда быў В.С.Аношка.

VIII з'езд ГТ СССР адзначыў, што не былі выкананы асобныя рашэнні VII з'езда ГТ СССР, сярод якіх – ГТ СССР не дабілася стварэння Інстытута геаграфіі ў Беларускай ССР. Сярод мерапрыемстваў, якія неабходна правесці згодна рашэнню VIII з'езда было “Пагадзіцца з прапановай Прэзідыума ГТ СССР, Саўміна БССР аб правядзенні ў 1987 г. у г.Мінску Усесаюзнай навукова-практычнай канферэнцыі па праблемах комплекснай тэрытарыяльнай арганізацыі рэгіёнаў”.

23 кастрычніка 1985 г. адбылося пасяджэнне Савета ГТ БССР па выніках работы VIII з'езда ГТ СССР. З інфармацыяй аб рабоце з'езда выступіў В.С.Аношка. З улікам рашэння VIII з'езда ГТ СССР былі перагледжаны планы работы аддзяленняў і камісій.

Савет ГТ БССР падтрымаў ініцыятыву Вучонага савета Гомельскага універсітэта аб выданні навуковага зборніка “Геалогія і геаграфія”.

3 снежня 1985 г. у г.Ленінградзе адбылося пасяджэнне Вучонага савета ГТ СССР у новым складзе. Удзел у пасяджэнні прынялі В.П.Якушка, В.С.Аношка, В.А.Калечыц. На Савеце было прынята рашэнне аб тым, што з 1 студзеня 1986 г. усе рэспубліканскія таварыствы павінны рабіць адлічэнні 25% сабраных узносаў у Цэнтральную арганізацыю ГТ СССР.

5 снежня 1985 г. на паседжанні Вучонага савета ГТ БССР, разгледжаны магчымасці актывізацыі работы ўсіх падраздзяленняў ГТ БССР. Заслуханы справаздачы аб рабоце камісіі антрапагеннага ландшафтазнаўства (кіраўнік В.М.Яцухна) як адной з лепшых, з мэтай распаўсюджання вопыту на другія камісіі. Разгледжаны пытанні паляпшэння работы камісіі школьнай геаграфіі. Выступілі В.С.Аношка, Б. М. Гурскі, Э.А.Ляўкоў. У адпаведнасці з “Палажэннем аб узнагародах” у якасці заахвочвання членаў ГТ прапанавалася ўзнагароджанне Граматай ГТ БССР, прэміраванне турысцкай пуцёўкай па СССР за кошт ГТ БССР; аб'ява падзякі з занясеннем у спецыяльную кнігу ГТ БССР.

На пасяджэнні Вучонага савета ГТ БССР 26 студзеня 1986 г. зацверджаны план правядзення канферэнцый у 1986-1987 гг. У пасяджэнні прынялі ўдзел прадстаўнікі Маскоўскага філіяла ГТ СССР, таварыства “Веды”, таварыства “Аховы прыроды”, Бярэзінскага біясфернага запаведніка.

7-11 красавіка 1986 г., згодна плана работы ГТ БССР, адбылася навуковая канферэнцыя “Праблемы рацыяльнага выкарыстання і аховы прыроднага асяроддзя”. Старшыня аргкамітэта – Р.А. Жмойдзяк, сустаршыня – В.С.Аношка. На канферэнцыі заслухана больш за 100 дакладаў.

На пасяджэнні Вучонага савета ГТ БССР 10 верасня 1986 г. створана рабочая група (В.М.Шырокаў, В.С.Аношка, А.А.Хоміч) па падрыхтоўцы навукова-каардынацыйнай нарады спецыялістаў краін-членаў Савета эканамічнай узаемадапамогі на тэму “Экалагічныя асновы планавання і кіравання ландшафтамі”. Вырашана арганізацыйнае пытанне: сакратар таварыства Г.М.Лукошка пайшла на пенсію, а на яе месца прызначана Л.І.Антоненка.

23 снежня 1986 г. Вучоны савет ГТ БССР зацвердзіў дэталёвы план работы таварыства на 1987 г. У сувязі з 80-годдзем акадэмік АН БССР, Ганаровы член ГТ СССР К.І.Лукашоў узнагароджаны Ганаровымі граматамі ГТ БССР і ГТ СССР, медалём П.П.Сямёнава-Цянь-Шанскага.

У 1986 г. члены Вучонага савета ГТ БССР прынялі ўдзел у рабоце Усесаюзнай канферэнцыі і па меліярацыйнай геаграфіі (Роўна, 30.IX – 03.X. 1986 г., Аношка В.С., Шырокаў В.М.), па гісторыі азёр (Ленінград, 24-29.IX. 1986 г. В.П.Якушка, В.А.Калечыц, А.А.Хоміч).

26 снежня 1986 г. адбыўся агульны сход членаў ГТ БССР. Асноўны даклад на тэму “Навукова-тэхнічны прагрэс і праблемы аховы навакольнага асяроддзя” зрабіў акадэмік Л.М.Сушчэня. У дыскусіі прынялі ўдзел Т.А.Раманава, Л.А.Дземідовіч, Е.С.Журомская, З.В.Сенюць, І.Г. Танавіцкі, Б.М.Дыскін. На сходзе прысутнічала больш за 100 чалавек. З заключным словам выступіў В.С.Аношка.

Пасяджэнне Вучонага савета ГТ БССР 11 лютага 1987 г. было прысвечана праблемам, звязаным з будаўніцтвам Даўгаўпілскай ГЭС. З дакладам выступілі: Л.В.Казлоўская, В.М.Шырокаў, В.П.Раманаў, А.І.Лучкоў. Савет вырашыў, што ўсе географы павінны прыняць удзел у абмеркаванні гэтай падзеі. У склад экспертнай камісіі ад ГТ БССР прапанаваны В.М.Шырокаў. Вырашылі звярнуцца ў Дзяржплан БССР з просьбай дазволіць В.М.Шырокаву пазнаёміцца з праектнай дакументацыяй будоўлі Даўгаўпілскай ГЭС. Даручыць В.М.Шырокаву зрабіць дэталёвы навуковы даклад на агульным сходзе.

24 сакавіка 1987 г. у Доме кіно адбылася творчая сустрэча членаў ГТ БССР і кінематаграфістаў Беларусьфільма студыі “Летапіс”, прысвечаная 30-годдзю Інстытута мастацтвазнаўства, фальклору і этнаграфіі. Выступілі: В.К.Бандарчык (дырэктар інстытута), рэжысёры-члены ГТ БССР А.І.Алай, Р.З.Ясінскі і інш. Аддзяленне ГТ БССР “Этнаграфіі і фальклёра” узнагароджана медалём П.П.Сямёнава-Цянь-Шанскага.

23 мая 1987 г. пайшоў з жыцця былы Старшыня Геаграфічнага таварыства БССР (1957-1960 гг.) акадэмік К.І. Лукашоў.

17 чэрвеня 1987 г. адбыўся агульны сход членаў ГТ БССР, гісторыкаў і археолагаў АН БССР, геалагічнага таварыства (усяго больш за 120 чалавек), прысвечаны праблемам, звязаным з будоўляй Даўгаўпілскай ГЭС. З дакладам выступілі В.М. Шырокаў, Р.Г. Гарэцкі, Л.В. Казлоўская, Т.А. Раманава, Л.Д. Побаль, А.В. Кудзельскі. Прысутнічалі прадстаўнікі радыё і тэлебачання. Сход пастанавіў: 1. Звярнуцца ў дырэктыўныя органы БССР з прапановай зрабіць дадатковую экспертызу праекта. 2. Арганізаваць выязное пашыранае

пасяджэнне Вучонага савета ГТ БССР сумесна з ГТ Латвійскай ССР і прадстаўнікамі ГТ СССР на месцы будаўніцтва ГЭС.

На пасяджэнні Вучонага савета ГТ БССР 2 снежня 1987 г. была створана камісія "Гісторыя геаграфічных даследаванняў Беларусі". У абмеркаванні выступілі: Э.А.Ляўкоў, А.Д.Ляўковіч, В.С.Аношка і інш. Часовым кіраўніком камісіі назначаны студэнт БДУ А.Болатаў. Вырашылі веснавое пасяджэнне Савета прысвяціць І.Д.Чэрскаму з выездам на радзіму вучонага.

Па асабістай заяве Савет вызваліў А.Е. Агаханянца ад абавязкаў старшыні аддзялення фізічнай геаграфіі. На гэтую пасаду зацверджаны В.Н.Кісялёў.

9 снежня 1987 г. адбыўся агульны сход членаў ГТ БССР і таварыства глебазнаўцаў БССР, прысвечаны 90-годдзю А.Р.Мядзведзева. Выступілі В.С.Аношка, У.В.Жылко, В.Ф.Клебановіч, М.К.Чартко.

З 21 па 28 студзеня В.С.Аношка быў камандзіраваны Саветам ГТ БССР у г.Ленінград (ГТ СССР) і г.Маскву (МДУ) для ўдзелу ў пасяджэннях арганізацыйных камітэтаў па правядзенню Усесаюзных канферэнцый па ландшафтазнаўству і меліярацыйнай геаграфіі.

На пасяджэнні Вучонага савета ГТ БССР 17 лютага 1988 г. разгледжана пытанне па ўдзелу юных географаў Беларусі ў рабоце УГАВ "Планета". На пасяджэнне запрошаны актывісты гэтага руху С.В.Крывавяз (г.Слуцк), С.С. Мітраховіч, І.В. Навумаў, В.В. Гашкоў, А.А. Кажарынаў, З.Я. Андрыеўская. Вырашана адзначыць вялікую работу краязнаўчага гуртка с.ш. № 11 г.Слуцка пад кіраўніцтвам С.В.Крывавяза, увесці ў склад Вучонага савета С.С.Мітраховіча, накіраваць каманду юных географаў г.Слуцка ў г.Рыгу на алімпіяду клуба "Планета".

30 сакавіка 1988 г. Прэзідыум ГТ БССР вырашыў правесці выязное пасяджэнне Вучонага савета на радзіме І.Д.Чэрскага 5-7 мая 1988 г. Маршрут: Мінск – Бярэзінскі біясферны запаведнік – Лепель – Новаполацк – Верхнядзвінск – Даўгаўпілс – Браслаў – Мядзель – Вілейка – Мінск. У парадак работы Савета ўключыць наступныя пытанні: 1. Экалагічныя праблемы г.Новаполацка. 2. Адкрыццё музея і мемарыяльнай дошкі і знака на радзіме І.Чэрскага. 3. Ахова азёр Браслаўшчыны і праблема стварэння Нацыянальнага парка "Браслаўскія азёры". 4. Інжынерна – геаграфічны аб'ект "Вілейска-Мінская водная сістэма".

У выязным пасяджэнні Савета ГТ БССР удзельнічалі: В.С.Аношка, В.М. Шырокаў, Р.Г. Гарэцкі, Т.А. Раманава, В.П. Якушка, В.Н. Кісялёў, А.У.Тамашэвіч, Г.В.Валабуева, Л.С.Якубовіч, Г.Грыневіч, Ю.М.Емельянаў, С.А.Канстанціновіч, Б.У.Фашчэўскі, Ч.А.Раманоўскі, А.А. Лепешаў, Г.І.Касперовіч, Л.І.Антоненка, карэспандэнт газеты "Знамя юности" Ю.В.Велтнер. Акрамя таго, асобную вандроўку па гэтым маршруце зрабіла група студэнтаў (А.Болатаў, Г.Вінярскі і інш.), якія рыхтавалі мерапрыемствы.

Па дарозе з Верхнядзвінска ў Браслаў група наведала месца будаўніцтва дамбы Даўгаўпілскай ГЭС, дзе адбылася сустрэча з прадстаўнікамі Геаграфічнага таварыства Латвіі, Пскоўскага аддзела ГТ СССР і мясцовым

насельніцтвам. Вырашана, што нягледзячы на часовае прыпыненне будаўніцтва, грамадства павінна выступаць супраць, а навукоўцы выступаць у друку з абгрунтаванымі доказамі немагчымасці гэтага будаўніцтва як па эканамічных, так і па экалагічных стасунках.

6 мая 1988 г. члены Савета ГТ БССР разам з прадстаўнікамі Верхнядзвінскага райвыканкама, вучнямі і настаўнікамі мясцовых школ, а таксама жыхароў раёна прынялі ўдзел у адкрыцці музея І.Д.Чэрскага. Музей створаны вучнямі пад кіраўніцтвам настаўніка мясцовай школы Б.Ф.Шымука. Адкрыць мемарыяльную дошку на мануменце – камяні І.Д.Чэрскаму было даручана В.П. Якушка. Выступілі: Р.Г.Гарэцкі, В.С.Аношка, Б.Ф.Шымук, Т.А.Раманава. Вырашана: 1. Прасіць Свольненскую школу даглядаць за мемарыялам І. Д.Чэрскага; 2. Прасіць Верхнядзвінскі райкам партыі і райвыканкам у мэтах увекавечання памяці І.Д. Чэрскага прысвоіць імя Чэрскага вуліцы альбо аднаму з калгасаў.

7 мая 1988 адбылася сустрэча членаў Вучонага савета ГТ БССР з прадстаўнікамі Браслаўскага райвыканкама. Савет ГТ БССР і прадстаўнікі райвыканкама (старшыня І.І.Касьяненка) распрацавалі сумеснае рашэнне аб арганізацыі Нацыянальнага парка “Браслаўскі”. Гэта была першая сумесная ініцыятыва аб адкрыцці Нацыянальнага парка.

Решение об организации Национального парка “Браславский”

1. Учитывая повышенную озерность района (10%), огромное значение озер в водоснабжении населенных пунктов, промышленных и сельскохозяйственных предприятий изучить антропогенные трансформации озер, разработать пути и методы их рационального использования, оптимизации и охраны.

   Поручить эту работу географическому факультету – лаборатории озероведения.
2. Отмечая, исключительную мелкоконтурность сельскохозяйственных угодий (в среднем менее 1,5 га) и связанные с этим трудности применения современныых агротехнических способов обработки и использования земель, считать необходимым разработку системы землепользования индивидуально для Браславского района.
3. Природный комплекс Браславского района отличается исключительным разнообразием и живописностью, свойственными всему прибалтийскому региону страны. Для него характерно большое количество чистых озер, геологических, геоморфологичексих, исторических памятников. Проблема организации туризма и краеведения, строительство на современном уровне туристических комплексов, охрана природы требует создание на территории района национального парка “Браславский”.
4. Просить АН БССР, Госкомитет по охране природы БССР, Агропром, Минводхоз, Общество охраны природы принять участие в обосновании и подготовке проектной документации национального парка “Браславский”.

11 мая 1988 г. праведзена навуковая нарада на тэму “Паходжанне і стан гідраграфічнай сеткі Беларусі” (адказны за правядзенне В.М. Шырокаў, П.С.Лопух).

12-13 мая 1988 г. ГТ БССР правяло навуковую канферэнцыю на тэму: “Сельскагаспадарчыя ландшафты - фарміраванне, выкарыстанне і ахова” (адказныя В.С.Аношка і Яцухна В.М.). У яе рабоце прынялі ўдзел вядучыя спецыялісты па гэтай праблеме з Беларусі, Расіі, Украіны, Малдавіі, Літвы, Латвіі, Эстоніі.

24-27 мая па плану работы ГТ БССР прайшла рабочая нарада па тэме “Устойлівасць геасістэм – 88”. З навуковымі дакладамі выступілі больш за 20 навукоўцоў (адказны А.А.Хоміч).

20-22 верасня 1988 г. на базе Геаграфічнага таварыства Эстоніі пры ўдзеле Прэзідыума ГТ БССР адбылася VIII Усесаюзная канферэнцыя па меліярацыйнай геаграфіі. У складзе арганізацыйнага камітэта быў В.С.Аношка, а ўдзел у канферэнцыі прынялі больш за 20 беларускіх географаў.

12 кастрычніка 1988 г. на пашыраным пасяджэнні Савета ГТ БССР з удзелам прадстаўнікоў больш за 10 арганізацый Мінска былі зацверджаны рашэнні і прапановы выязнога паседжання ў Верхнядзвінскі і Браслаўскі раёны.

На пасяджэнні Прэзідыума Савета ГТ БССР 15 лістапада 1988 г. вырашана стварыць камісію пры Савеце ГТ БССР па экалагічных праблемах г.Новаполацка. Старшынёй камісіі назначаны Л.А.Лысёнак. На гэтым жа пасяджэнні па асабістай заяве вызвалены ад абавязкаў старшыні аддзялення эканамічнай і сацыяльнай геаграфіі С.А.Польскі, старшынёй аддзела прызначаны А.В.Тамашэвіч. Вырашана падтрымаць прапанову Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута аб прысваенні звання прафесара старшыні аддзела ГТ БССР, прарэктару У.Я.Навуменку.

Прэзідыум Савета ГТ БССР выступіў з ініцыятывай арганізаваць штогадовыя чытанні акадэміка К.І.Лукашова пачынаючы з 1989 г.

У рамках руху “Забытыя і вернутыя імёны” Прэзідыум даручыў Э.А.Ляўкову пачаць збор матэрыялаў аб жыцці і дзейнасці А.Б.Місуны – першай жанчыны-геолага Расіі.

Прэзідыум Савета ГТ БССР 30 снежня 1988 г. падтрымаў кандыдатуры ад ГТ СССР У.М. Катлякова, С.Б.Лаўрова, У.С.Жэкуліна, Б.В.Белавусова, А.М.Трафімава ў якасці кандыдатаў у народныя дэпутаты Вярхоўнага савета СССР.

10 студзеня 1989 г. на пасяджэнні Вучонага савета ГТ БССР абмяркоўваўся і зацверджаны план рэспубліканскага семінара юных географаў-даследчыкаў (даклад С.С.Мітраховіча). Вырашана, што ў семінары прымуць удзел (выступяць з дакладамі і сустрэнуцца з вучнямі ў школах г.Мінска В.С.Аношка, Р.А.Жмойдзяк, В.Н.Кісялёў, В.П.Якушка, Б.М.Гурскі, З.Я.Андрыеўская, М.Р.Каўхута і інш. Дата работы семінара 23-25 сакавіка 1989 г.

12 студзеня 1989 г. адбыліся першыя чытанні акадэміка К.І.Лукашова. Чытанні праводзіліся сумесна з АН БССР, прысутнічала 67 чалавек. Выступілі В.С.Аношка, В.П.Якушка, Л.А.Дземідовіч, В.П.Ільін, В.К.Лукашоў, М.Д.Міхайлаў.

1 сакавіка 1989 г. агульны сход членаў ГТ БССР, на якім прысутнічалаі 72 чалавекі, быў прысвечаны тэме "Забытыя і вярнутыя імёны". Зроблены 2 даклады: 1. Трагічны лёс даследчыка і педагога праф. А.А.Смоліча (дакдачыкі: А.Болатаў, Г.Рыдзеўскі). 2. А.Б.Місуна – першая жанчына-геолаг Расіі і Беларусі (дакладчык Э.А.Ляўкоў).

5 красавіка 1989 г. адбыўся агульны сход членаў ГТ БССР г.Мінска і Мінскай вобласці (прысутнічала 76 чалавек). На сходзе абраны дэлегаты на IV з'езд ГТ БССР ад Мінска і Мінскай вобласці: І.В.Арцюх, А.М.Болатаў, Р.Г.Гарэцкі, Л.А.Дземідовіч, А.А.Жадан, Р.А.Жмайдзяк, Г.І.Касперовіч, Т.А.Клімава, С.А.Канстанцінавіч, Л.Г.Ляпіла, В.К.Лукашоў, П.А.Лярскі, В.М.Плужнікаў, Г.В.Рыдзеўскі, П.П.Рогач, М.Т.Раманоўскі, В.М.Сукманаў, А.А.Хоміч, В.М.Яцухна. На гэтым сходзе выступілі з дакладамі рэдактар рэфератыўнага журнала "Геаграфія" К.С.Лосеў, загадчык аддзела В.Ф.Худалей, намеснік дырэктара Салавецкага музея-запаведніка В.С.Ананчанка.

17-22 красавіка 1989 г. на базе БГУ і ГТ БССР адбыўся VIII Усесаюзны сімозіум па гісторыі азёр (члены аргкамітэта В.П.Якушка, і А.М.Рачэўскі). Тэма сімозіума: «Экалагічная ўстоўлівасць аквальных ландшафтаў».

Работа Прэзідыума і Вучонага савета ГТ БССР у сакавіку-чэрвені 1989г. была накіравана на падрыхтоўку IV з'езда ГТ БССР, які рыхтаваўся на базе Брэсцкага аддзела ГТ БССР. 29 сакавіка 1989 г. быў зацверджаны склад аргкамітэта з'езда (В.С.Аношка, М.І.Манюк, Р.А.Жмойдзяк, У.Я.Навуменка, Я.М.Мяшэчка, Л.І.Антоненка, В.К.Бандарчык, Б.М.Гурскі, Л.В.Казлоўская, В.М. Шырокаў, В.П.Якушка), камісія па падрыхтоўцы справаздачы, камісія па распрацоўцы Статута ГТ БССР.

Савет ГТ БССР прыняў пастанову падтрымаць ініцыятыву Саюза пісьменнікаў БССР і Фонда культуры аб стварэнні "Беларускага экалагічнага саюза".

22 мая 1989 г. Вучоны савет ГТ БССР зацвердзіў навуковую праграму з'езда, вырашыў усе арганізацыйныя пытанні па падрыхтоўцы і правядзенню з'езда, разгледзеў праект новага Статута ГТ БССР.

IV з'езд ГТ БССР адбыўся ў г.Брэсце 21-23 верасня 1989 г. на базе Брэсцкага педагагічнага інстытута імя А.С.Пушкіна. На з'ездзе прысутнічалі 46 дэлегатаў з правам рашаючага голаса і 60 гасцей. Праграма з'езда па прыкладу III з'езда складалася з двух частак: 1. Навуковыя даклады і сімпозіумы (21 і 22 верасня); 2. Справаздачна-выбарчая частка (23 верасня).

З'езд адкрыў Прэзідэнт ГТ БССР В.С.Аношка. З прывітальнымі словамі выступілі М.І.Манюк – сакратар Брэсцкага абкома КПБ, А.А.Келлер – прадстаўнік Савета ГТ СССР (г.Ленінград); С.А.Канстанціновіч – намеснік старшыні Беларускага таварыства аховы прыроды, І.А.Горленка – член Савета ГТ УССР.

З навуковымі дакладамі згодна праграме перад удзельнікамі з’езда выступілі В.С.Аношка, А.В.Тамашэвіч, Г.І.Марцынкевіч, В.М.Яцухна, Б.М.Гурскі, У.Я.Пашук, А.М.Рачэўскі, Б.Л.Гінзбург, С.А.Польскі, С.І.Сідор, В.М.Шырокаў, В.М.Плужнікаў. Кіраўнікамі навуковых сімпозіумаў былі: Л.В.Казлоўская (“Праблемы эканамічнага і сацыяльнага развіцця БССР і роля геаграфіі ў іх вырашэнні”) і В.Н.Кісялёў (“Экалагічныя праблемы Беларусі і месца геаграфіі ў іх вырашэнні”). На сімпозіуме выступілі больш за 40 удзельнікаў з’езда.

23 верасня на справаздачна-выбарчай частцы з’езда выступіў старшыня мандатнай камісіі Б.М.Гурскі, які пацвердзіў правамоцтвы ўсіх дэлегатаў і самога з’езда.

З справаздачным дакладам аб рабоце Вучонага савета ГТ БССР выступіў В.С.Аношка. Справаздачу аб рабоце рэвізійнай камісіі зрабіла В.П.Якушка, аб рабоце Гомельскага аддзела ГТ БССР – А.В.Малахаў, аб рабоце Брэсцкага аддзела – У.Я.Навуменка. Аб стане спраў у Магілёўскім аддзеле далажыў П.А.Лярскі. У абмеркаванні справаздачных дакладаў прынялі ўдзел В.М.Шырокаў, С.А.Польскі, Г.І.Касперовіч, Т.А.Клімава, У.Я.Пашук, Б.М.Гурскі, Т.А.Раманава.

Пасля аднагалоснага прызнання работы Вучонага савета ГТ БССР здавальняючай, з’езд прыступіў да выбарнай працэдуры.

В.М.Шырокаў прапанаваў уключыць у спіс для тайнага галасавання на пасаду Прэзідэнта ГТ БССР В.С.Аношку (падтрымана аднагалосна), Па прапанове П.С.Лопуха ад імя дэлегатаў з’езда ў спіс для тайнага абрання Вучонага савета ўключаны наступныя члены ГТ БССР: В.С.Аношка, В.К.Бандарчык, Б.М.Гурскі, Т.А.Клімава, В.Н.Кісялёў, Л.В.Казлоўская, С.А.Канстанціновіч, Э.А.Ляўкоў, А.А.Макарэвіч, А.А.Малахаў, У.Я.Навуменка, С.А.Польскі, Т.А.Раманава, А.У.Тамашэвіч, В.М.Шырокаў, Б.П.Власаў, А.А.Хоміч, У.М.Шымаў, С.І.Сідор, В.М.Яцухна.

А.М.Рачэўскі прапанаваў унесці ў спіс для тайнага галасавання па абранню рэвізійнай камісіі: П.І.Рогача, В.П.Якушку, Н.С.Юрцэвіч, Н.І.Жураўскую, В.У.Кадацкую.

У склад падліковай камісіі ўвайшлі: П.С.Лопух (старшыня), Я.М.Мяшэчка, А.М.Болатаў.

Па выніках тайнага галасавання Прэзідэнтам ГТ БССР аднагалосна абраны В.С.Аношка. У склад Вучонага савета па большасці галасоў увайшлі усе (19) прапанаваныя кандыдатуры. Аднагалосна абрана рэвізійная камісія ў прапанаваным складзе.

З’езд адклікнуўся на палітычную сітуацыю ў краіне і аднагалосна вырашыў: 1. Звярнуцца да ўсіх грамадскіх арганізацый краіны адказацца ад перавыбараў дэпутатаў у органы савецкай улады, якія прадугледжаны ў праекце новага закона аб выбарах; 2. Паслаць тэлеграму Б.М.Ельцыну наступнага зместу: “IV з’езд ГТ БССР падтрымлівае Ваша жаданне паскорыць і палепшыць перабудову ў краіне. Шчыра жадаем Вам поспехаў на гэтым высокародным складаным шляху. Дэлегаты IV з’езда географаў Беларусі”.

Т.А.Раманава далажыла праект Пастановы з’езда, які пасля абмеркавання быў прыняты аднагалосна.

В.С.Аношка ўнёс на разгляд з’езда новую рэдакцыю Статута ГТ БССР, распрацаваную па рашэнню Навуковага савета. У абмеркаванні прынялі ўдзел В.М.Шырокаў, Л.В.Казлоўская, В.М.Яцухна і інш. Тэкст Статута з’езд прыняў з дапаўненнямі.

З’езд аднагалосна падтрымаў, прапанаваныя В.С.Аношкам, кандыдатуры В.П.Якушкі, Т.А.Раманавай, А.Е.Агаханянца, М.Т.Раманоўскага, П.А.Лярскага для прысваення званняў Ганаровы член ГТ СССР на наступным з’ездзе ГТ СССР.

Для ўдзельнікаў з’езда была арганізавана навукова-пазнавальная экскурсія па маршруце: Брэст – Сад савецка-польскай дружбы ў саўгасе “Рассвет” – Белавежская пушча.

11 кастрычніка 1989 г. на першым пасляз’ездаўскім пасяджэнні Вучонага савета ГТ БССР адбылося размеркаванне абавязкаў сярод яго членаў. Віцэ-прэзідэнтамі сталі Л.В.Казлоўская і Б.М.Гурскі, вучоным сакратаром – Б.П.Уласаў; кіраўнікамі аддзелаў: В.Н. Кісялёў (Мінскі), А.А. Малахаў (Гомельскі), У.Я. Навуменка (Брэсцкі); кіраўнікамі аддзяленняў: А.У. Тамашэвіч (эканамічнай і сацыяльнай геаграфіі), В.К. Бандарчык (этнаграфіі і фальклору), С.І.Бялоў. (медыцынскай геаграфіі), Б.М.Гурскі (фізічнай геаграфіі); кіраўнікамі камітэтаў: Т.А.Раманава. і Л.В. Казлоўская. – Комплекснай геаграфічнай экспертызы; В.М. Шырокаў – Рэдакцыйна-выдавецкі; Э.А. Ляўкоў– Прапаганды геаграфічных ведаў; С.А.Польскі. – Міжнародныя сувязі, А.А. Хоміч – Экалагічных праблем Беларусі, С.І.Сідор., Н.С. Юрцэвіч. – Вучэбнай геаграфіі.

23-24 кастрычніка 1989 г. адбылася рабочая нарада па праблеме: “Сучасны стан і перспектывы рацыянальнага выкарыстання вадасховішчаў Беларусі (адказаны за правядзенне В.М.Шырокаў). Зроблена 13 навуковых дакладаў.

На пасяджэнні Вучонага савета ГТ БССР 27 снежня 1989 г. была заслухана інфармацыя А.В.Тамашэвіча і В.С.Аношкі аб стане спраў у аддзяленні эканамічнай і сацыяльнай геаграфіі і Мінскім аддзеле. Зацверджаны планы работы ўсіх падраздзяленняў ГТ БССР на 1990 г.

На паседжанні Прэзідыума Савета ГТ БССР 29 студзеня 1990 г. была прынята пастанова аб удзеле географаў Беларусі ў рабоце Рэпінскай школы-семінары, якая штогод праводзіцца таварыстам “Веды” і Саветам ГТ СССР. Вырашана камандзіраваць з выступленнем С.А.Польскага.

Пасяджэнні Прэзідыума (14 лютага 1990 г.) і Вучонага савета ГТ БССР былі прысвечаны вылучэнню дэлегатаў ад Беларусі на IX з’езд ГТ СССР. Вырашана правесці агульны сход, на якім абмеркаваць усе прапановы і абраць дэлегатаў тайным галасаваннем.

26 лютага 1990 г. адбыліся чарговыя чытанні, прысвечаныя К.І.Лукашову.



**Академик АН БССР,**
**доктор геолого-минералогических наук,**
**профессор, заслуженный деятель науки БССР**
**К. И. Лукашев**
**(1907—1987)**

**НАУЧНОЕ ЧТЕНИЕ**
**ИМЕНИ К. И. ЛУКАШЕВА**

Агульны сход членаў ГТ БССР, які адбыўся 4 красавіка 1990 г., акрамя абрання дэлегатаў на IX з’езд ГТ СССР, разгледзеў важную праблему “Геаэкалагічная паспартызацыя прыродных аб’ектаў, тэрыторый і прамысловых прадпрыемстваў”. Дакладчыкамі выступілі А.М.Рачэўскі, М.В.Кіслоў, Г.А.Еўдакімава. У спрэчках прынялі ўдзел Б.У.Фашчэўскі, В.М.Шырокаў, В.П.Якушка, А.У.Тамашэвіч, В.С.Фацееў, А.М.Максімовіч, М.А.Капельшчыкаў, Г.У.Новікаў. З заключным словам выступіў В.С.Аношка.

У выніку тайнага галасавання дэлегатамі на IX з’езд ГТ СССР абраны: Б.М.Гурскі, Г.І.Касперовіч, Л.В.Казлоўская, Т.А.Раманава, М.І.Струк. Акрамя таго дэлегатамі сталі члены Савета ГТ СССР В.С.Аношка і В.П.Якушка, Ганаровыя члены ГТ СССР, прадстаўнікі аддзелаў ГТ БССР, абраныя на сваіх з‘ездах.

9-13 красавіка 1990 г. адбылася чарговая, восьмая канферэнцыя маладых навукоўцаў на тэму: “Праблемы рацыянальнага выкарыстання і аховы прыроднага асяроддзя”, на якім заслухана больш за 60 навуковых дакладаў.

26 красавіка 1990 г. па ініцыятыве Вучонага савета ГТ БССР праведзены студэнцкія навуковыя чытанні, прысвечаныя 90-годдзю І.С.Лупіновіча. З уступным дакладам выступіў В.С.Аношка, студэнты БДУ і БГПУ зрабілі 9 дакладаў.

Прэзідыум ГТ БССР 12 чэрвеня 1990 г. узнагародзіў граматамі ГТ БССР А.М.Болатава, Г.В.Рыдзеўскага, У.Ю.Малашэнкава за актыўную работу ў ГТ БССР.

22 чэрвеня 1990 г. ГТ БССР сумесна з Таварыствам глебазнаўцаў Беларусі праведзены навуковыя чытанні, прысвечаныя 90-годдзю першага прэзідэнта ГТ БССР акадэміка І.С.Лупіновіча.


Академик АН БССР,
доктор сельскохозяйственных наук, профессор,
заслуженный деятель науки БССР
И. С. ЛУПИНОВИЧ
(1900 — 1968)
НАУЧНОЕ ЧТЕНИЕ
Минск, 1990

Дзевяты з’езд ГТ СССР адбыўся 10-14 верасня 1990 г. у г.Казані. Удзел у рабоце з’езда ад Беларусі прынялі больш за 20 чалавек (дэлегаты, ганаровыя члены таварыства, дакладчыкі, госці).

У складзе арганізацыйнага камітэта працаваў В.С.Аношка, ён таксама быў абраны старшынёй мандатнай камісіі з’езда.

Агульная тэма з’езда: “Геаграфія ў час перабудовы: сучасныя дасягненні, новыя задачы і шляхі іх рэалізацыі”. Акрамя пленарных дакладаў працавала 7 круглых сталоў па наступных праблемах: 1. Глабальная геаэкалогія; 2. Рэгіянальная геаэкалогія; 3. Тэрытарыяльная арганізацыя савецкага грамадства і праблемы міжнацыянальных адносін; 4. Геаэкалогія міравога акіяна; 5. Сучасныя метады эколага-геаграфічных даследаванняў; 6. Геаграфічная і экалагічная адукацыя; 7. Геаграфічныя аспекты краязнаўства.

11 кастрычніка 1990 г. адбылося пасяджэнне Вучонага савета ГТ БССР, на якім былі падведзены вынікі работы IX з’езда ГТ СССР. У склад Вучонага савета ГТ СССР абраны В.С.Аношка, Ю.М.Емельянаў, Л.В.Казлоўская, С.А.Польскі. Ганаровымі членамі ГТ СССР абраны: В.П.Якушка, А.Е.Агаханянц.

На пасяджэнні Вучонага савета вырашана пачаць падрыхтоўку да 100-годдзя А.А.Смоліча, якое адбудецца ў верасні 1991 г. Для правядзення юбілейных мерапрыемстваў створаны аргкамітэт у складзе: В.С.Аношка – старшыня, члены: Л.Л.Ачыновіч, А.М.Болатаў, Р.Г.Гарэцкі, Б.М.Гурскі, М.Г.Гарнакоў, Г.А.Каханоўскі, Э.А.Ляўкоў, П.С.Лопух, У.А.Навумовіч, Л.А.Руновіч, С.І.Сідор.

У адпаведнасці з планам работы ГТ БССР 9-10 кастрычніка 1990 г. адбылася навуковая канферэнцыя “Эколага-геахімічныя аспекты вывучэння, аховы глебаў і агралaverandшафтаў”. Было зроблена 38 дакладаў, прысутнічала больш за 50 чалавек.



АКАДЕМИЯ НАУК БССР
ИНСТИТУТ ГЕОХИМИИ И ГЕОФИЗИКИ АН БССР
ИНСТИТУТ ПРОБЛЕМ ИСПОЛЬЗОВАНИЯ
ПРИРОДНЫХ РЕСУРСОВ И ЭКОЛОГИИ АН БССР
ГЕОГРАФИЧЕСКОЕ ОБЩЕСТВО БССР
БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕ
им. В. И. Ленина
ГЕОГРАФИЧЕСКИЙ ФАКУЛЬТЕТ
ПРИБАЛТИЙСКО-БЕЛОРУССКАЯ
ГЕОХИМИЧЕСКАЯ СЕКЦИЯ
БЕЛОРУССКИЙ ФИЛИАЛ
ВСЕСОЮЗНОГО ОБЩЕСТВА ПОЧВОВЕДОВ

ПРИГЛАСИТЕЛЬНЫЙ БИЛЕТ
И
ПРОГРАММА

НАУЧНОЕ СОВЕЩАНИЕ
«ЭКОЛОГО-ГЕОХИМИЧЕСКИЕ АСПЕКТЫ
ИЗУЧЕНИЯ, ОХРАНЫ ПОЧВ И
АГРОЛАНДШАФТОВ»

Минск 1990

На пасяджэнні Прэзідыума ГТ БССР 11 студзеня 1991 г. зацверджана праграма мерапрыемстваў, прысвечаных 100-годдзю А.А.Смоліча. Вырашана правесці выязное пасяджэнне Савета ГТ БССР сумесна з АН БССР, Фондам культуры, Таварыствам беларускай мовы на радзіме А.А.Смоліча (в.Бацэвічы Клічаўскага раёна Магілёўскай вобл.).

9 студзеня 1991 г. адбыліся чарговыя навуковыя чытанні, прысвечаныя акадэміку К.І.Лукашову. З навуковымі даведкамі выступілі: В.С.Аношка, В.М.Шырокаў, Э.А.Ляўкоў, В.Н.Кісялёў, В.П.Якушка і інш. Прысутнічала 43 чалавекі.

12 лютага 1991 г. Прэзідыум Савета ГТ БССР прыняў пісьмо-зварот на адрас ГТ Літ.ССР у сувязі з трагічнымі падзеямі, якія адбыліся ў Літве.

З В А Р О Т
САВЕТА ГЕАГРАФІЧНАГА ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ ССР

ПРЕЗИДЕНТУ ГЕОГРАФИЧЕСКОГО ОБЩЕСТВА ЛИТВЫ
проф. С.ВАЙТЕКУНАСУ

Уважаемые коллеги !

С глубоким чувством тревоги и разочарования мы восприняли трагические события, происшедшие в Литве. Мы выражаем искреннее соболезнование семьям погибших и всему народу Литвы в связи с трагедией, вызванной неконституционной акцией армии и "комитета спасения", приведшей к гибели людей. Географы Белоруссии не могут быть безразличны к случившемуся, так как наши народы тесно связаны исторически и территориально. Мы считаем, что все противоречия, возникающие как внутри республики, так и в ее взаимоотношении с центром должны решаться политическими средствами путем диалога и уважения суверенных прав республики. Мы решительно осуждаем применение военной силы против мирного населения и убеждены, что только свободный выбор народов является гарантом мира и процветания Литвы и СССР.

Судьбу Литвы должны решать народы, проживающие на территории Литвы, независимо от их национальности, вероисповедания и политических взглядов. Мы против искусственного нагнетания вражды между литовцами, белорусами, русскими, поляками и др., проживающими в Литве. Мы против искажения информации о событиях в Литве, а равно и в других регионах. Мы считаем законными решения избранного народом правительства и выступаем за привлечение к ответственности непосредственных участников преступления и тех, кто давал им приказы для свершения преступления.

Пусть не повторится это нигде.

Президент Географического общества БССР
доктор географических наук В.С.Аношко

Пашыранае пасяджэнне Савета ГТ БССР 27 лютага 1991 г. мела наступны парадак дня: 1. Аб развіцці геаграфічных даследаванняў у НДУ Праблем рацыянальнага прыродакарыстання і экалогіі АН БССР. 2. Аб правядзенні першай геаграфічнай алімпіяды школьнікаў Беларусі. 3. Аб падрыхтоўцы да "Тыдня геаграфіі". Па першаму пытанню выступіў намеснік дырэктару інстытута У.Ф.Логінаў. Вырашана для больш цеснага ўзаемадзеяння географаў маладога інстытута з географамі навучальных установ і сумеснага вырашэння геаграфічных праблем Беларусі ўключыць

У.Ф.Логінава ў склад Навуковага савета ГТ БССР, паступова на базе інстытута арганізаваць аддзяленне (камісію) геаэкалогіі.

З ініцыятывай пачаць правядзенне геаграфічных алімпіяд сярод школьнікаў выступілі ГТ БССР, Міністэрства народнай адукацыі і Мінскае гарадское ўпраўленне народнай адукацыі. Першую алімпіяду вырашылі правесці 25-29 сакавіка 1991 г. на геаграфічным факультэце БДУ. Савет ГТ БССР вырашыў выдзеліць сродкі для прэміравання пераможцаў.

У праграме падрыхтоўкі да "Тыдня геаграфіі" Вучоны савет ГТ БССР вырашыў звярнуцца ў Вярхоўны Савет БССР з просьбай садзейнічаць правядзенню запланаваных мерапрыемстваў. Савет зацвердзіў "Зварот Савета ГТ БССР да дзяржаўных і палітычных улад, да ўсіх жыхароў Беларусі" у сувязі з правядзеннем "Тыдня геаграфіі". Вырашана прасіць галоўнага рэдактара газеты "Народнай газеты" надрукаваць зацверджаны зварот.

## З В А Р О Т
## САВЕТА ГЕАГРАФІЧНАГА ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ ССР

Наша трывога ў сувязі з абвастрэннем экалагічнай сітуацыі, малаэфектыўным выкарыстаннем на практыцы навукова абгрунтаваных рэкамендацый геаграфічнай навукі, нізкім узроўнем прыродаведчай адукацыі насельніцтва, нездавальняючым станам выкладання геаграфічных дысцыплін у вышэйшай і сярэдняй школах выклікала неабходнасць звярнуцца да дзяржаўных і палітычных улад рэспублікі, да ўсіх жыхароў Беларусі з прапановай аб штогодным правядзенні "Тыдня геаграфіі". Першае такое мерапрыемства мяркуем правесці ў лістападзе 1991 г. пад дэвізам: "Нельга займацца палітыкай, эканомікай, культурай без ведання геаграфіі". Яно будзе састаўной часткай усесаюзнай акцыі, мэта якой прыцягнуць усеагульную ўвагу да геаграфічных і экалагічных праблем, магчымасці выкарыстання геаграфічных ведаў для практычнай работы ў эканоміцы, культуры, палітыцы.

Геаграфія – адна з старажытнейшых навук, важкая састаўная духоўнай культуры чалавецтва і намаганні яе прадстаўнікоў заўсёды былі скіраваны на пошук шляхоў дасягнення найвышэйшай гармоніі ва ўзаемаадносінах паміж чалавекам і прыродай. Недастатковая ўвага да надзённых і актуальных праблем геаграфіі і экалогіі сёння, заўтра павернецца незлічонымі стратамі ў народнай гаспадарцы, нанясе непапраўную шкоду духоўнаму і фізічнаму здароўю нацыі. Праз геаграфію, якая заклікае мысліць глабальна, а дзейнічаць – лакальна, мы зможам знайсці шляхі да захавання агульнага дома – планеты Зямля – для нашых дзяцей і ўнукаў, а таксама агульначалавечай і нацыянальнай культур.

У няпросты для нашай Айчыны час географы рэспублікі заклікаюць да кансалідацыі ўсе прагрэсіўныя сілы, здольныя аздаравіць сацыяльнае і гаспадарчае жыццё нашага рэгіёну, які прыняў на сябе асноўны ўдар буйнейшай катастрофы сучаснасці – Чарнобыльскага выбуху. Неабходна прыкласці максімум намаганняў для аптымальнага сумяшчэння палітычных і

эканамічных установак з гаспадарчым і прыродна-рэсурсным патэнцыялам рэспублікі. Улічваючы надзвычайную палітычную, эканамічную, культурную і навуковую важнасць мерапрыемстваў “Тыдня геаграфіі”, Савет Геаграфічнага таварыства БССР звяртаецца да Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў БССР, ЦК КПБ, Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў і ўсіх грамадзян рэспублікі прыняць актыўны ўдзел і аказаць дзейсную дапамогу ў яго падрыхтоўцы і правядзенні.

Створаны Аргкамітэт па падрыхтоўцы і правядзенню “Тыдня геаграфіі” у Беларусі пад старшынствам прэзідэнта Геаграфічнага таварыства БССР, доктара геаграфічных навук Валерыя Станіслававіча Аношкі. За даведкамі і з прапановамі звяртацца на адрас: 220050, Мінск, Ленінскі пр.4, БДУ імя У.І.Леніна, геаграфічны факультэт, пакой 315, тэл. 26-50-58.

Савет Геаграфічнага таварыства Беларускай ССР.

26 лютага 1991 г. адбыліся чарговыя навуковыя чытанні, прысвечаныя К.І.Лукашову.

18 сакавіка 1991 г. пашыраны агульны сход географаў з удзелам рэктарата БДУ, прадстаўнікоў Міністэрств і ўстаноў быў прывечаны 70-годдзю В.П.Якушкі. Вучоны савет ГТ БССР узнагародзіў В.П.Якушку Ганаровай граматай.

На пасяджэнні Навуковага савета ГТ БССР 28 сакавіка 1991 г. былі запрошаны члены журы І Рэспубліканскай алімпіяды і ўсе пераможцы алімпіяды. Аб выніках алімпіяды справаздачу зрабіў старшыня журы В.С.Аношка. Вынікі наступныя: IX клас – I месца Н. Аляксеева, В. Ляўчук.; II месца – І. Пенкрат; III месца – В. Валенцік, В. Тарапаціна, С. Скуратаў; X клас – I месца С. Каролька., С. Глазуноў; II месца – Д. Рашэтнікаў, В. Янушка.; III месца – В. Сасноўскі., Л. Санец; XI клас – I месца В. Міхновіч, II месца – А Сотнікаў., П. Собаль; III месца – А Занкевич., Э Яваровіч., А. Будкін

Савет ГТ БССР пастанавіў: вучняў XI класа пераможцаў алімпіяды прыняць у члены ГТ БССР і выдаць пасведчанні і значкі. Пераможцаў і прызёраў алімпіяды ўзнагародзіць Граматамі ГТ БССР і зборнікам навуковых прац “Рацыянальнае прыродакарыстанне ў умовах Беларусі” з аўтографамі вядучых вучоных – географаў.

За сумленную работу ў складзе журы Савет ГТ БССР аб’явіў падзяку 17 выкладчыкам і супрацоўнікам БДУ і МДПІ.

10 красавіка 1991 г. праведзены навуковыя чытанні прысвечаныя памяці Г.І.Гарэцкага .



**Акадэмік АН БССР**
**доктар геолага-мінералагічных навук,**
**прафесар, заслужаны дзеяч навукі АН БССР,**
**лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР і БССР**
**Г. І Гарэцкі**
**(1900—1988)**

**НАВУКОВАЕ ЧЫТАННЕ, ПРЫСВЕЧАНАЕ ПАМЯЦІ Г. І. ГАРЭЦКАГА**

На пасяджэнні Прэзідыума Савета ГТ БССР 23 красавіка 1991 г. адзначана, што зварот географаў да ўрада і насельніцтва Беларусі адобраны Вярхоўным Саветам БССР, інфармацыя надрукавана ў “Народнай газеце”, Камітэт па тэлебачанню і радыё будзе асвятляць падзеі. Зацверджан тэкст інфармацыі, якая будзе разаслана ва ўсе НДІ, вучэбныя ўстановы, праектныя арганізацыі аб “Тыдні геаграфіі”.

15 мая 1991 г. Вучоны савет ГТ БССР разгледзеў пытанні падрыхтоўкі і праграму святкаванні 100-годдзю з дня нараджэння А.А.Смоліча. Зацверджана праграма і план мерапрыемстваў.

П Л А Н
мероприятий, посвященных 100-летию со дня рождения профессора
А.А.Смолича

1. Выездная юбилейная конференция на родине А.А.Смолича – открытие мемориальной доски на здании школы в д.Бацевичи Кличевского района Могилевской обл.

- торжественное заседание в Доме культуры в г.п.Кличеве;
- открытие экспозиции, посвященной А.А.Смоличу, в Кличевском районном музее;
- художественная часть – выступление фольклорного ансамбля, чтение отрывков из произведений А.А.Смолича и др.

2. Обновление экспозиций и организация выставок в музеях «Беларуская хатка», АН БССР, М.Богдановича и др.
3. Выступления перед учителями и учащимися Могилевской области о жизни и деятельности А.А.Смолича.
4. Выступления в газетах и журналах о А.А.Смоличе.
5. Подготовка библиографического справочника А.А.Смолича.
6. Организация выступлений по радио и телевидению.
7. Подготовка мемориальной доски А.А.Смолича.
8. Проведение студенческой научной конференции, посвященной проф.А.А.Смоличу.

Оргкомитет

П Р А Г Р А М А
СВЯТКАВАННЯ 100-годдзя з ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ПРАФЕСАРА
А Р К А Д З Я   А Н Т О Н А В І Ч А
С М О Л І Ч А
(у в. Бацэвічы Клічаўскага раёна Магілёўскай вобл.)

27 ВЕРАСНЯ 1991 г.

14.00 – Выезд з Мінска

17.00 – Мітынг, прысвечаны адкрыццю мемарыяльнай дошкі А.А.Смолічу на будынку школы в. Бацэвічы.

Уступнае слова дырэктара школы Барковай Клаўдзіі Лаўрэнцеўны.

Выступаючыя: Яўген Лецка, Радзім Гарэцкі, Расціслаў Жмойдзяк, Арсен Ліс і інш.

19.00 – Адкрыццё ўрачыстага пасяджэння ў Доме культуры в. Бацэвічы.

Уступнае слова старшыні Клічаўскага райвыканкама.

Даклады (да 15 хвілін)

“Жыццё і дзейнасць праф. А.А.Смоліча” Прэзідэнт Геаграфічнага таварыства Беларусі праф.В.С.Аношка.

“Роля А.А.Смоліча ў развіцці сучаснай геаграфічнай навукі” Віцэ-прэзідэнт Геаграфічнага таварыства Беларусі праф. Б.М. Гурскі.

“А.А.Смоліч – заснавальнік беларускага краязнаўства”. Ст.навук. супр. ін-та гісторыі АН Беларусі, к.г.н. А.С. Кароль.

“А.А.Смоліч як дзяржаўны і палітычны дзеяч” Член цэнтральнай рады БНФ А.М.Сідарэвіч.

Выступленні землякоў А.А.Смоліча.

Мастацкая частка.

28 ВЕРАСНЯ 1991 г.

11.00 – наведванне краязнаўчага музея г.Клічава.

12.00 - ад’езд у Мінск

Улічваючы, што 19 верасня 1991 г. рашэннем Вярхоўнага савета БССР была ператворана ў Рэспубліку Беларусь (РБ), назва ГТ БССР таксама была заменена на ГТ РБ.

Савет ГТ РБ звярнуўся з хадатайніцтвам на імя Старшыні навукова-метадычнага Савета па геаграфіі ВМА педінстытутаў СССР К.В.Пашканга аб прысваенні вучонага звання прафесара кандыдату геаграфічных навук М.С.Вайтовічу.

Вырашана запрасіць на святкаванне з нагоды 100-годдзю А.А.Смоліча яго дочак, якія жывуць у г.Кіеве з поўнай аплатай камандзіровачных выдаткаў.

Згодна зацверджанаму плану 27-28 верасня 1991 г. адбылося святкаванне 100-годдзя А.А.Смоліча. У выязным пасяджэнні прынялі ўдзел усе члены Савета ГТ РБ, прадстаўнікі іншых грамадскіх і дзяржаўных устаноў. Выступілі сваякі і землякі А.А.Смоліча. Усяго ў святкаванні прынялі ўдзел больш за 200 чалавек.

На пасяджэнні Прэзідыума Савета ГТ РБ 4 кастрычніка 1991 г. па просьбе творчых калектываў створана Камісія па ацэнцы калекцый мінералаў і горных парод пры ГТ РБ (старшыня А.М.Пап).

12 лістапада 1991 г. на пасяджэнні Вучонага савета ГТ РБ абмяркоўвалася пісьмо Прэзідэнта ГТ СССР А.Ф.Трошнікава аб захаванні ГТ СССР, як самастойнага навуковага таварыства. Выступілі В.С.Аношка, Л.В.Казлоўская, Б.М.Гурскі, В.П.Якушка, В.М.Шырокаў. Аднагалосна было прынята рашэнне, тэкст якога быў накіраваны ў адрас Вярхоўнага савета РБ і Прэзідэнту ГТ СССР А.Ф.Трошнікаву.

25.11.91. №129

РЕШЕНИЕ

Совета ГО Республики Беларусь по обращению Президента ГО СССР академика А.Ф.Трешникова о сохранении Географического общества СССР как самостоятельного научного общества

Географическое общество, образованное задолго до 1917 года, не может считаться искусственной структурой, порожденной тоталитарным режимом. Географическое общество имеет значительные научные и культурные традиции, накопило огромные, не имеющие ценности материалы, которые не могут быть переданы другой организации или разделены на части. Роль географического общества будет возрастать вместе с повышением общего культурного уровня и организованности всего нашего общества.

Совет Географического общества Республики Беларусь считает, что географическая наука, а соответственно и Географическое общество СССР, не сможет пережить разъединения. Это будет равносильно самоликвидации и

потери престижности науки. Географы Республики Беларусь считают, что Географическое общество как центральную организацию, объединяющую всю географическую общественность страны, необходимо сохранить любыми средствами.

Географическое общество Республики Беларусь согласно входить в составоб'єдіненного географического общества на паритетных началах как равноправное самостоятельное общество суверенного государства.

Решение принято единогласно на заседании Совета Географического общества Республики Беларусь 12 ноября 1991 г. протокол № 4.

Президент
Географического общества Республики Беларусь,
доктор географических наук, профессор В.С.Аношко

Абмяркоўваўся праект Закона "Аб дзяржаўным кіраванні аховай прыроды і выкарыстаннем прыродных рэсурсаў". Заўвагі зрабілі Б.М.Гурскі, В.П.Якушка, Б.П.Уласаў, В.М.Яцухна, В.С.Аношка. Заўвагі накіравалі ў Вярхоўны Савет.

У адпаведнасці з распараджэннем Саўміна РБ ад 31 кастрычніка 1991г. №582р. распачалася праца па стварэнню "Схемы рацыянальнага прыродакарыстання Беларускага Паазер'я". Работа складалася з двух частак: 1. Распрацоўка навуковай канцэпцыі (навуковага абгрунтавання) рацыянальнага прыродакарыстання пры развіцці сучасных і перспектыўных галін гаспадаркі Беларускага Паазер'я. 2. Праектная частка Схемы.

Выкананне першай часткі работы даручана Часоваму творчаму калектыву (ЧТК), які фактычна быў створаны і працаваў на базе Вучонага Савета БГТ. Агульная колькасць выканаўцаў-членаў ЧТК перавышала 80 чалавек, навуковы кіраўнік – В.С.Аношка. Творчы калектыў складаўся пераважна з географаў. Географам упершыню была прадстаўлена магчымасць праявіць уменне працаваць калектыўна над канкрэтнай праблемай. Фактычна была даказана магчымасць стварэння навукова-дасдедчага інстытута геаграфіі для вырашэння важных геаграфічных задач, якія да гэтага і пасля вырашаліся спецыялістамі, не маючымі геаграфічнай адукацыі.

Заданне было паспяхова выканана і ў 1993 г. вынікі абмяркаваны і зацверджаны на пасяджэнні НТС Мінпрыроды РБ.

1992 г. стаў годам значных арганізацыйных пераўтварэнняў грамадскіх таварыстваў. 8 студзеня 1992 г. адбыўся пашыраны сход членаў ініцыятыўнай групы па стварэнню Беларускага геаграфічнага таварыства. Выступілі: В.С.Аношка (старшыня ініцыятыўнай групы), В.П.Якушка, У.Я.Пашук, Г.У.Рыдзеўскі, Л.В.Казлоўская. Пастанавілі: 1. Стварыць Беларускае Геаграфічнае таварыства. 2. Звярнуцца ў Мінюст Рэспублікі Беларусь з заявай аб рэгістрацыі таварыства пад назвай " Беларускае геаграфічнае таварыства" (БГТ).

В.П.Якушка далажыла новы Статут БГТ, выступілі Г.У.Рыдзеўскі, У.Я.Пашук. Пастанавілі: Зацвердзіць Статут Беларускага геаграфічнага

таварыства з улікам зробленых заўваг і прапаноў. Па пытаннях выбараў новага саставу кіруючых органаў БГТ выступілі: В.С.Аношка, Я.М.Мяшэчка, М.І.Бобрык, Л.В.Казлоўская, А.А.Хоміч. Па іх прапанове і ў выніку галасавання ў склад Вучонага савета ўвайшлі: В.С.Аношка., Л.В.Казлоўская, В.К. Бандарчык, Т.А.Клімава, Э.А. Ляўкоў, Т.А Раманава., Б.П.Уласаў, А.У.Тамашэвіч, В.М.Шырокаў, А.А.Хоміч, В.М.Яцухна, А.В Малахаў, У.Я. Навуменка, А.М. Болатаў, Г.У. Рыдзеўскі, С.І. Бялоў., С.І.Сідор.

Па прапанове В.П.Якушкі, Т.А.Раманавай, Л.В.Казлоўскай і па выніках галасавання Прэзідэнтам БГТ абраны В.С.Аношка. У склад Прэзідыума БГТ увайшлі: В.С.Аношка, Б.П.Уласаў, Л.В.Казлоўская, В.М.Шырокаў. Рэвізійная камісія абрана ў складзе: В.П.Якушка (старшыня), В.У.Кадацкая (сакратар), П.І.Рогач, М.І.Бобрык, Н.С.Юрцэвіч.

30 студзеня 1992 г. памёр віцэ-прэзідэнт БГТ прафесар Барыс Мікалаевіч Гурскі.

На пасяджэнні Прэзідыума БГТ была разгледжана прапанова Прэзідэнта ГТ Літвы аб аб’яднанні намаганняў географаў Беларусі, Літвы, Латвіі і Калінінградскай вобл. Расіі ў вырашэнні геаграфічных і геапалітычных праблем памежных тэрыторый. Ад БГТ створана рабочая група ў складзе В.С.Аношка, В.М.Шырокаў., Л.В.Казлоўская., Г.І. Касперовіч., В.М. Яцухна для распрацоўкі плана агульных геаграфічных даследаванняў.

Савет ГТ Літвы звярнуўся з просьбай да беларускіх географаў садзейнічаць літоўскім географам у вывучэнні вытокаў р.Нёман. Прэзідыум БГТ вырашыў камандзіраваць вядомага краязнаўцу, знатака Уздзеншчыны (В.Н.Кісялёва), для аказання дапамогі экспедыцыі літоўскіх географаў.

На пасяджэнні Савета БГТ 29 мая 1992 г. па прапанове Ляўкова Э.А., А.У. Тамашэвіча, В.П. Якушкі, В.С. Аношкі было падрыхтавано пісьмо Міністру адукацыі РБ з прапановай палепшыць выкладанне краязнаўчых дысцыплін у школах, тэхнікумах і ВНУ краіны.

Міністру адукацыі
Рэспублікі Беларусь
В.А Гайсёнку

Паважаны Віктар Анатольевіч !

Дзякуючы пераменам, якія праходзяць у Рэспубліцы Беларусь, склаліся спрыяльныя ўмовы адраджэння і далейшага развіцця беларускай культуры і навукі. Галоўным напрамкам, які можа зрабіць працэс адраджэння незваротным, на наш погляд, з’яўляецца адукацыя. Менавіта праз школьны вучэбны план можна дасягнуць падрыхтоўкі не толькі граматнага, а і ўсебакова адукаванага чалавека. Школьныя ж планы ( як і планы ВНУ і навуковых даследаванняў Акадэміі навук) перыяду таталітарнага рэжыму склаліся з галоўнай мэтай забяспечыць ваенна-прамысловы монстр неабходнай колькасцю спецыялістаў з фізіка-матэматычнай падрыхтоўкай, што павінна было “крепить мощь нашей Родины”. Як паказалі падзеі апошніх гадоў, магутнасць краіны вызначаецца зусім іншым. Вопыт шматгадовай працы ў ВНУ паказвае, што асаблівую занепакоенасць павінны выклікаць вельмі слабыя веды выпускнікоў школ па краязнаўству, і ў першую чаргу па

гісторыі ўтварэння, па прыродных асаблівасцях і багаццях свайго краю. Няведанне гэтых пытанняў прыводзіць да нігілістычных адносін да сваёй Радзімы, прыніжае нацыянальны гонар беларусаў, неразуменне эканамічных магчымасцей Беларусі як незалежнай дзяржавы.

На пасяджэнні Савета Геаграфічнага таварыства, куды ўваходзяць усе вядомыя географы – навукоўцы, вырашана прасіць Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь звярнуць асаблівую ўвагу на выкладанне краязнаўчых і прыродазнаўчых дысцыплін у сярэдніх школах і тэхнікумах. Савет Геаграфічнага таварыства Рэспублікі Беларусь лічыць мэтазгодным уключыць у вучэбныя планы школ і тэхнікумаў курсы: "краязнаўства" (з падзелам яго на гістарычнае і прыроднае краязнаўства) і "Геалогію". Пры гэтым у абодвух курсах неабходна асаблівую увагу ўдзяліць вывучэнню пытанняў краязнаўства і геалогіі і Беларусі. Курс "Краязнаўства" мэтазгодна вывучаць у VIII – IX класах, а "Геалогію" у X – XI класах, альбо адпаведна ў тэхнікумах.

Геаграфічны факультэт універсітэта можа адкрыць спецыялізацыю па падрыхтоўцы выкладчыкаў гэтых дысцыплін, а таксама распрацаваць вучэбныя праграмы і мэтадычныя дапаможнікі.

З вялікай павагай да Вас па даручэнню Савета
Прэзідэнт
Геаграфічнага таварыства
Рэспублікі Беларусь
доктар геаграфічных навук, прафесар В.С.Аношка

30 ліпеня 1992 г. Міністэрства юстыцыі РБ зарэгістравала Статут БГТ (пасведчанне № 394).

Міністэрства юстыцыі РБ запатрабавала ад БГТ унесці некаторыя змяненні ў Статут БГТ, якія можна зрабіць толькі на з'ездзе, альбо пашыраным пасяджэнні Вучонага Савета БГТ.

28 кастрычніка 1992 г. адбылося пашыранае пасяджэнне Вучонага савета БГТ (на правах з'езда). Акрамя членаў Савета на пасяджэнні прысутнічалі 34 члены БГТ Мінска і ўсіх абласцей Беларусі. Парадак дня: 1. Аб змяненнях у Статуце БГТ. 2. Аб новым складзе Вучонага савета і Прэзідыума БГТ. 3. Аб гаспадарчай дзейнасці БГТ. 4. Аб узнагародах БГТ. 5. Аб пячатцы, штампе і афіцыйным бланку БГТ. Вучоны савет абмяркаваў і зацвердзіў новую рэдакцыю Статута БГТ.

Па прапанове Міністэрства юстыцыі РБ у склад Вучонага савета БГТ давыбралі прадстаўнікоў усіх абласцей Беларусі (Г.У. Рыдзеўскі – ад Магілёўскай, В.А.Жданюк – ад Гродненскай, С.І.Курдзін ад Віцебскай). Замест памершага члена Прэзідыума Вучонага савета БГТ Б.М.Гурскага ў склад Прэзідыума абраны С.І.Сідор.

Савет аднагалосна зацвердзіў палажэнне аб тым, што Ганаровыя члены ГТ СССР з'яўляюцца адначасова і Ганаровымі членамі БГТ. Імі сталі Г.І.Гарэцкі, К.І.Лукашоў, В.П.Якушка, А.Е.Агаханянц.

В.С.Аношка прапанаваў Ганаровымі членамі БГТ абраць вядомых географаў М.Т.Раманоўскага і П.А.Лярскага. Выступілі П.С.Лопух, В.М.Шырокаў, Г.У.Рыдзеўскі, В.П.Якушка, А.М.Болатаў, У.Ю.Малашанкаў. Для правядзення выбараў створана камісія: В.М.Яцухна – старшыня, Л.І.Антоненка, Г.У.Рыдзеўскі.

Пашыраны Вучоны Савет БГТ тайным галасаваннем аднагалосна абраў: Мікалая Тарасавіча Раманоўскага Ганаровым членам Беларускага Геаграфічнага таварыства (пасведчанне № 1), Пятра Аляксеевіча Лярскага Ганаровым членам Беларускага Геаграфічнага таварыства (пасведчанне № 2).

Вучоны савет разгледзеў прапанаваныя камісіяй узоры пячаткі, штампа і афіцыйнага бланка. У абмяркаванні прынялі ўдзел В.М.Яцухна, У.Я.Пашук, Г.У.Рыдзеўскі, А.М.Болатаў, В.П.Якушка. Аднагалосна зацверджаны прапанаваныя ўзоры.

На пасяджэнні Прэзідыума Вучонага савета БГТ 11 студзеня 1993 г. разгледжана пытанне аб рабоце Гродненскай абласной станцыі юных турыстаў. Адзначана, што ў рабоце геалагічнага гуртка "Карат" вялікую дапамогу аказваюць дырэктар с.ш. №16 Л.І.Шкут і яго намеснік Р.В.Далькевіч. Вырашылі направіць пісьмо на імя загадчыка райана з прапановай аб'явіць падзяку Л.І.Шкуту і Р.В.Далькевічу.

10 лютага 1993 г. Прэзідыум разгледзеў прапанову тэлекампаніі ММ – 4 аб супрацоўніцтве. Вырашана зацвердзіць распрацаваны дагавор і прыкласці намаганне да яго рэалізацыі.

На красавіцкім пасяджэнні Прэзідыума і майскім пасяджэнні Вучонага савета БГТ разглядалася пытанне аб правядзенні рэспубліканскай навуковай канферэнцыі "Экалагічнае і сацыяльна-эканамічнае абгрунтаванне схем рацыянальнага прыродакарыстання". Савет Міністраў РБ сваёй пастановай вызначыў час правядзення канферэнцыі 7-8 кастрычніка 1993 г. Арганізатарамі канферэнцыі акрамя БГТ з'яўляюцца: Мінадукацыі РБ, Мінсельгазхарч РБ, Дзяржкамэкалогіі РБ, Дзяржкамзем РБ, АН Беларусі. Зацверджаны арганізацыйны камітэт, у склад якога ўвайшлі: І.І. Ліштван, В.І. Парфёнаў, В.С. Аношка, В.І. Алешка, М.М.Бамбалаў, І.С.Жмака, В.І. Камасін, Г.А.Патаеў, А.М. Рачэўскі, Л.М.Ярашэвіч, В.М.Яцухна.

Вучоны савет БГТ вырашыў у дальнейшым асноўную ўвагу ў сваёй рабоце накіроўваць на падтрымку розных ініцыятыў, паступаючых ад географаў Беларусі. Падтрымана ініцыятыва А.М. Болатава і А.Р. Карнакова аб арганізацыі навукова-пазнавальнай экскурсіі па Заходняму Саяну, Алтаю, на возера Байкал.

На верасиёўскім пасяджэнні Вучонага савета БГТ абмяркоўвалася пытанне аднаўлення БГТ, як самастойнага таварыства, у Міжнародным Геаграфічным саюзе (МГС) у якасці паўнапраўнага члена. Зацверджана пісьмо (аўтары В.С.Аношка, В.М.Яцухна) на імя Прэзідэнта МГС праф. М.Верстанена ў якасці афіцыйнага звароту па гэтым пытанні.

У пісьме ў адказ Прэзідэнт МГС М.Верстанен і Генеральны сакратар МГС Э.Элерс падтрымалі ініцыятыву БГТ у тым, што БГТ прадстаўляе ў гэтым супольніцтве беларускіх географаў і геаграфічныя ўстановы і можа

быць членам МГС. БГТ было ўключана ў склад МГС на Рэгіянальнай канферэнцыі МГС у Празе ў 1994 г.

6 кастрычніка 1993 г. пасяджэнне Вучонага савета БГТ праходзіла сумесна з аргкамітэтам канферэнцыі "Экалагічнае і сацыяльна-эканамічнае абгрунтаванне рэгіянальных схем рацыянальнага прыродакарыстання". Адзначана, што падрыхтоўка да канферэнцыі завершана: надрукавана і разаслана праграма, надрукаваны зборнік тэзісаў дакладаў. Выступілі з прапановамі В.С.Аношка, Г.А.Патаеў, А.М.Рачэўскі, В.М.Яцухна. Усё да адкрыцця канферэнцыі гатова.



Министерство образования Республики Беларусь
Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь
Государственный комитет по экологии Республики Беларусь
Комитет по земельной реформе и землеустройству при СМ Республики Беларусь
Академия наук Беларуси
Белорусское Географическое общество

РЕСПУБЛИКАНСКАЯ НАУЧНАЯ КОНФЕРЕНЦИЯ
«ЭКОЛОГИЧЕСКОЕ И СОЦИАЛЬНО-ЭКОНОМИЧЕСКОЕ ОБОСНОВАНИЕ РЕГИОНАЛЬНЫХ СХЕМ РАЦИОНАЛЬНОГО ПРИРОДОПОЛЬЗОВАНИЯ»

ПРИГЛАСИТЕЛЬНЫЙ БИЛЕТ
И
ПРОГРАММА

МИНСК 1993

На пасяджэнні Вучонага савета разгледжана і прынята рашэнне рэкамендаваць цыкл работ украінскіх географаў (Горленка, Марыніч, Паламарчук, Пархоменка, Рудэнка, Швебс, Шышчанка, Шчэрбань)

"Геаграфічныя асновы рэгіянальнага прыродакарыстання" на прысваенне Дяржаўнай прэміі Украіны.

У адказ на прапанову Міністэрства замежных спраў РБ падрыхтаваць кнігу-даведнік "Рэспубліка Беларусь" вырашана даручыць гэту работу С.І.Сідору, В.М.Яцухну і В.С.Аношку.

На пасяджэнні вырашана, што БГТ сумесна з Нацыянальным цэнтрам стратэгічных ініцыятыў "Усход-Захад" павінна распрацаваць і правесці цыкл семінараў па праблеме "Беларусь і сістэма еўрапейскай экалагічнай бяспекі".

7-8 кастрычніка 1993 г. адбылася навуковая канферэнцыя "Экалагічнае і сацыяльна-эканамічнае абгрунтаванне рэгіянальных схем рацыянальнага прыродакарыстання". На канферэнцыі выступілі з дакладамі больш за 50 навукоўцаў з Беларусі, Расіі (Масква, Санкт-Пецярбург, Твер, Казань, Іркуцк, Уладзікаўказ), Малдовы, Украіны (Кіеў, Харкаў, Львоў, Адэса), Польшчы (Варшава, Люблін), Германіі. У прынятым канферэнцыяй рашэнні галоўнай задачай адзначана распрацоўка Генеральнай схемы рацыянальнага прыродакарыстання тэрыторыі Беларусі.

## Решение
## Республиканской научной конференции "Экологическое и социально-экономическое обоснование региональных схем рационального природопользования"

7-8 октября 1993 г., в г. Минске состоялась Республиканская научная конференция по проблеме: "Экологическое и социально-экономическое обоснование региональных схем рационального природопользования", проведенная согласно постановлению Совета Министров РБ № 130 от 05 марта 1993 г. Организаторами конференции были Минобразования РБ, Госкомитет по экологии РБ, Академия наук Беларуси, Минсельхозпрод РБ, Комитет по земельной реформе и землеустройству при СМ РБ, Белорусское географичексое общество.

В работе конференции приняло участие более 100 ученых, специалистов, работников проектных и производственных учреждений Беларуси, Украины, Молдовы, России, Польши и Германии.

Конференция отмечает, что в условиях становления в нашей республике рыночных отношений, развития различных форм собственности, в т.ч. на землю, усиление роли местного самоуправления, а также экологически безопасного использования природных ресурсов, роль и практическая значимость региональных схем рационального природопользования существенно возрастает. В первую очередь они направлены на научно-обоснованное совершенствование территориальной организации хозяйственной деятельности с учетом целесообразного и перспективного социально-экономического развития отдельных регионов, и в целом Республики Беларусь. Имеющиеся в настоящее время отраслевые и специальные территориальные схемы (районная планировка, охраняемых территорий, мелиоративного строительства, планировка городов и систем

расселения, земельных ресурсов и др.), как правило, не увязаны между собой и не решают задачу комплескного использования и охраны природных ресурсов.

В выступлениях и докладах участников конференции отмечалась недостаточная координация проводимых исследований на республиканском уровне, отсутствие Генеральной схемы рационального природопользования территории Беларуси, отсутствие внимания к разработке комплексных схем природопользования для территорий с особо сложными, экологически напряженными ситуациями. Указывалось на необходимость разработки единой концепции рационального природопользования Беларуси, которая могла бы быть научной основой Генеральной схемы рационального природопользования. Недостаточно координируется участие Беларуси в международных программах экологического профиля. Много неясности в разработке экологических проблем, связанных с процессами приватизации и другими проявлениями рыночной экономики. По мнению выступающих назрела необходимость разработки государственной научно-технической программы: “Приватизация и экология”. Отмечалась недостаточная проработка законодательно-правовых вопросов в современных условиях, а также трудности, связанные с отсутствием закона о территориальном устройстве Беларуси. Указывалось на трудности в исследованиях, связанных с отсутствием надежных и объективных методов эколого-экономической оценки природных ресурсов, в т.ч. проведение природоохранных мероприятий в новых условиях. Эти важные вопросы практически не находят отражения в средствах массовой информации, научных монографиях и других видах изданий.

Научная конференция постановляет:

1. Считать необходимым безотлагательно приступить к разработке научной концепции и Генеральной схемы рационального природопользования территории Беларуси с учетом ее геополитического положения, современного экологического состояния и перспективного социально-экономического развития.
2. Обратить особое внимание на изучение и направление исследований территорий с особо опасными экологическими условиями. Приступить к обоснованию и разработке схем природопользования этих территорий.
3. Осуществлять координацию деятельности всех министерств, ведомств, организаций и отдельных ученых и специалистов в международных программах по этой проблеме. С этой целью создать единый координационный центр при Госкомитете по экологии РБ.
4. Обратиться в АН Беларуси и Госкомитет по экологии с предложением разработки Государственной программы комплексной эколого-экономической оценки природно-ресурсного потенциала Беларуси и ее регионов, предусматривающей:

- разработку научно-методических основ экономической оценки природных ресурсов и ущерба от их нерационального использования и загрязнения среды в условиях рыночной экономики;
- составление на единой методологической основе кадастров природных ресурсов (земельных, водных и др.) нового типа, содержащих экономическую оценку;
- эколого-экономическое районирование республики;
- формирование единого банка данных по природопользованию как информационной основы для государственного регулирования процессов природопользования в рыночных условиях;
- обоснование механизма реализации схем рационального природопользования регионов различного уровня;
- разработка концептуальных положений и практических мер осуществления процессов приватизации.

5. В правовых документах на законодательном уровне придать статус национального богатства природным ресурсам республики. Создать при Верховном Совете РБ Государственный фонд “Природные ресурсы” с передачей ему от местных органов власти распорядительных функций природными ресурсами.
6. Считать необходимым ускорить разработку типовых положений об охраняемых природных территориях Республики Беларусь с целью определения их статуса, управления, а также методических указаний по оценке их территориального положения, репрезентативности, критериев выделения охранных зон, их нормального функционирования.
7. Поддержать решение Экологической комиссии Академии наук Беларуси, сессии Житковичского районного совета народных депутатов о создании Национального парка “Туровщина” и просить Совет Министров РБ принять по этому вопросу специальное постановление, а также ускорить решение вопросов создания Браславского и Нарочанского национальных парков, по которым уже разработаны ТЭО организации этих парков.
8. Обратиться в комиссию по законадательству Верховного Совета РБ с предложением о разработке закона о территориальном устройстве Республики Беларусь.
9. Войти с предложением в Госкомитет по экологии РБ, Штаб гражданской обороны РБ и Комиссию по чрезвычайным ситуация при Совете Министров Беларуси о рассмотрении предложений Полоцкого государственного университета по разработке системы защиты водных объектов от нефтяных загрязнений при авариях.
10. Просить Госкомчернобыль РБ поддержать работы по завершению проекта “Радлан”, как синтеза комплексных исследований по минимизации радиоактивного загрязнения и возможности прогнозировать этот процесс.

11. Поддержать исследования, направленные на разработку территориальных комплексных схем охраны природы (ТерКСОП). Однако учитывая большую методическую разобщенность, считать необходимым организовать Межведомственный научный Совет по координации этих разработок.

23-25 снежня 1993 г. праведзена Рэспубліканская канферэнцыя настаўнікаў-краязнаўцаў "Роля краязнаўства ў выхаванні навучэнцаў ва ўмовах нацыянальнага адраджэння". У праграме канферэнцыі адбылася сустрэча яе ўдзельнікаў з Прэзідэнтам і членамі Навуковага савета БГТ.

Пасяджэнне Вучонага савета БГТ 23 лютага 1994 г. было прысвечана абмеркаванню плана мерапрыемстваў, прысвечаных 150-годдзю І.Д. Чэрскага. У абмеркаванні прынялі ўдзел В.С. Аношка, А.М. Болатаў, Л.В. Казлоўская, В.М. Шырокаў, С.С. Мітраховіч. Вырашана: 1. Хадатайнічаць перад Вучоным саветам БДУ і БДПУ устанавіць стыпендыю імя І.Д. Чэрскага для студэнтаў-выдатнікаў. 2. Правесці навуковыя чытанні на радзіме І. Д. Чэрскага з удзелам настаўнікаў і вучняў Віцебскай вобласці. 3. Арганізаваць выступленне членаў БГТ перад насеьніцтвам на тэму: І.Д.Чэрскі – вядомы географ і геолаг. 4. Хадайнічаць перад Вучоным Саветам РБ аб прысваенні імя І.Д.Чэрскага геаграфічным аб'ектам Беларусі.

Работа Вучонага Савета БГТ у сакавіку-маі 1994 г. было прысвечана падрыхтоўцы да пятага з'езда БГТ.

22 верасня 1994 г. на пасяджэнні Вучонага Савета БГТ былі разгледжаны першыя вынікі падрыхтоўчай работы. Вырашана з'езд правесці 24-25 лістапада 1994 г. сумесна з урачыстымі мерапрыемствамі, прысвечанымі 60-годдзю геаграфічнага факультэта БДУ. Зацверджаны арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы з'езда (Вучоны савет БГТ) і камітэт па сустрэчы гасцей (Р.А.Жмойдзяк, Л.У.Мар'іна). Адказнымі за інфармацыю аб з'ездзе ў газетах, на радыё і тэлебачанні прызначаны Р.А.Жмойдзяк, В.С.Аношка.

18 лістапада 1994 г. Вучоны савет БГТ разгледзеў кандыдатуры, прапануемыя з'езду для абмеркавання і абрання ў склад новага Вучонага савета, рэвізійнай камісіі і на пасаду Прэзідэнта БГТ.

Адкрыццё V з'езда БГТ адбылося 24 лістапада 1994 г. на геаграфічным факультэце БДУ. З'езд адкрыў уступным словам Прэзідэнт БГТ В.С.Аношка. З віншаваннямі да ўдзельнікаў з'езда звярнуліся: рэктар БДУ Ф.М.Капуцкі, віцэ-Прэзідэнт АН Беларусі Р.Г.Гарэцкі, дырэктар НДІ геалагічных навук А.В.Мацвееў, дэкан геафака БДУ Р.А.Жмойдзяк.

Асаблівасці ўмоў, у якіх праводзіўся з'езд БГТ, адзначаны ва ўступным слове прэзідэнта БГТ В.С.Аношкі.

***Паважаныя дэлегаты з'езда, ганаровыя члены БГТ, госці і ўсе прысутныя!***

*Перш чым адкрыць з'езд, дазвольце нагадаць Вам некаторыя асаблівасц,і якія адрозніваюць V з'езд ад мінулага IV і тыя змены, якія адбыліся за гэты кароткі час.*

*Перш за ўсё, гэта тое, што з'езд праходзіць зусім у іншай дзяржаве ва ўсіх адносінах (геаграфічных, палітычных, дзяржаўных, эканамічных і інш.). Адбылася вельмі значная змена каштоўнасцей, што выклікала змену адносін да шмат якіх з'яў і падзей.*

*Усе гэта патрабуе ад усіх нас іншага разумення месца грамадсскіх арганізацый у жыцці краіны і іншых адносін да грамадскай і навуковай працы. Непамерна вырасла роля геаграфіі як адзінай навукі, вывучаючай прыродныя комплексы і ўсё тое, што ў іх адбываецца..*

*Шаноўнае спадарства! З'езд праходзіць у БДУ, які быў калыскай беларускай геаграфічнай навукі і застаецца яе цэнтрам як навуковым, так і метадычным. Таму дазвольце ад Вашага імя падзякаваць рэктарат БДУ за спрыяльныя ўмовы працы, добрыя адносіны да географаў.*

*Паважаныя ўдзельнікі з'езда! Пасля IV з'езда мінула трошкі больш за 5 гадоў. Кавалак часу невялікі, але за гэты час мы недалічыліся некаторых вядомых географаў, шмат зрабіўшых для беларускай геаграфіі. Заўчасна назаўсёды пакінулі нас такія вядомыя навукоўцы члены Савета БГТ як праф., д. г-м.н. Б.М.Гурскі, праф., д.г.н. С.А.Польскі, а таксама к.г.н., дац. В.А.Навіцкі, к.г.н., дац. Стэцко В.В., к.н., дац. М.А.Вальчык, к.н., дац. А.Н.Андрушчанка, к.н., дац. Б.А.Мядзведзеў, выкладчыкі БДУ І.Б.Белавусава і А.А.Бяспалы, навуковы супрацоўнік А.М.Макрыцкі. Прапаную аддаць даніну павагі і памяці гэтых людзей.*

*Дазвольце вітаць ад Вашага імя ў першую чаргу нашых Ганаровых дэлегатаў з'езда: Р.Г. Гарэцкі., А.В. Мацвеяў., Б.П. Савіцкі., В.М. Шыма., В.К. Лукашо., У.А. Багіна., В.Ф. Мядзведзеў., У.В. Жылко., Г.І. Сураўнёў., Ф.М. Капуцкі., А.І. Лясніковіч., П.Д. Кухарчык., М.І. Смеян., В.І. Парфёнаў., М.М. Пікулік., а таксама ўсіх прысутнічаючых у гэтай зале.*

Праграма з'езда складалася з дзвюх частак: 1.Справаздача і выбары; 2. Навуковая праграма.

Справаздачу аб рабоце Вучонага савета БГТ зрабіў В.С.Аношка. У спрэчках па дакладу выступілі: Л.В.Казлоўская, А.У.Тамашэвіч, Б.А.Манак, В.П.Якушка, А.М.Вітчанка. Па прапанове У.Я.Пашука з'езд аднагалосна ацаніў работу Вучонага савета здавальняючай. Аднагалосна была зацверджана справаздача В.П.Якушкі аб рабоце Рэвізійнай камісіі.

Са справаздачамі аб рабоце аддзелаў выступілі: Мяшэчка Я.М. (Брэст), Курдзін С.І. (Віцебск), Малахаў А.А. (Гомель). Рыдзеўскі Г.І. (Магілёў). У абмеркаванні выступілі У.Я.Пашук, С.І.Сідор, В.П.Якушка, І.І.Богдэль.

Для правядзення выбараў у склад падліковай камісіі абраны: Саломка А.В., Лопух П.С., Зайко С.М., Вітчанка А.Н., Кухарчык Т.М.

У выніку абмеркавання і тайнага галасавання ў склад Вучонага савета БГТ абраны: Аношка В.С., Богдэль І.І., Вітчанка А.М., Казлоўская Л.В., Карабанаў А.К., Кірэенка К.Р., Курдзін С.І., Лопух П.С., Малашэнкаў У.Ю.,

Навуменка У.Я., Раманава Т.А., Рыдзеўскі Г.У. Сідор С.І., Хоміч В.С., Яцухна В.М. У склад рэвізійнай камісіі ўвайшлі: Тамашэвіч А.У., Мар'іна Л.У., Кадацкая В.У., Бобрык М.І.

У спіс для тайнага галасавання па кандыдатуры Прэзідэнта БГТ былі ўключаны: Яцухна В.М., Кісялёў В.Н, Сідор С.І., Аношка В.С. У выніку падліку галасоў Прэзідэнтам БГТ абраны В.С.Аношка.

V з'езд БГТ зацвердзіў Статут БГТ у новай рэдакцыі. Створана камісія (Аношка В.С., Яцухна В.М., Малашанкаў У.Ю.) для працэдуры перарэгістрацыі БГТ у Міністэрстве юстыцыі РБ.

З'езд зацвердзіў эмблему БГТ. Па прапанове Брылеўскага М.М. (праект) і Казлоўскай Л.В. (у цэлым) прынята Пастанова з'езда.

V з'езд Беларускага Геаграфічнага таварыства
пастанаўляе

1. Дзейнасць Рады БГТ прызнаць здавальняючай.
2. Зацвердзіць справаздачу рэвізійнай камісіі БГТ.
3. Актывізаваць дзейнасць Таварыства, усіх географаў на рашэнне актуальных навуковых задач, неабходных для сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, для павышэння ролі геаграфічных навук, павышэння канструктыўнасці геаграфічных даследаванняў.
4. Узмацніць сувязі БГТ з вытворчымі, навуковымі і праектнымі ўстановамі і ведамствамі для сумеснага вырашэння праблем прыродакарыстання.
5. Прыкласці намаганні для падтрымання арганізацый, дзейнасць якіх накіравана на вырашэнне экалагічных, сацыяльных і гаспадарчых задач рэспубліканскага і мясцовага ўроўню.
6. Вучонаму савету БГТ узмацніць каардынацыйную дзейнасць, аказваць падтрымку і дапамогу геаграфічным калектывам, членам таварыства ў іх навуковой рабоце.
7. Распрацаваць і ажыццявіць мерапрыемствы па расшырэнню і ўзмацненню абласных аддзелаў БГТ. Дабіцца павелічэння колькаснага саставу БГТ, пашырэння саставу калектыўных членаў.
8. Звярнуцца ў Міністэрства адукацыі РБ з прапановай адшукаць сродкі для друкавання "Граматы БГТ", членскіх білетаў, значкоў, медаля.
9. Для кантролю за станам навакольнага асяроддзя, падключацца да распрацоўкі навуковых геаграфічных экспертыз буйных праектаў, праграм і г.д.
10. Лічыць актуальнай задачу далейшага паглыблення даследаванняў функцыянавання, дынамікі і развіцця прыродных сістэм, развіцця стацыянарных даследаванняў ландшафтаў.
11. Актывізаваць работу картаграфічнага накірунку ў рэспубліцы, арганізаваць работы па падрыхтоўцы і выданню Атласа РБ.
12. Лічыць неабходным далейшае пашырэнне работ па вывучэнню размяшчэння насельніцтва і працоўных рэсурсаў Рэспублікі Беларусь, падрыхтаваць серыю карт па геаграфіі насельніцтва, арганізаваць і правесці І-ю Усебеларускую канферэнцыю па народанасельніцтву.

13. Актывізаваць даследаванні па пытаннях тэрытарыяльнай арганізацыі сельскай гаспадаркі ў Беларусі, развіццю фермерскіх гаспадарак.
14. Больш увагі ўдзяляць падрыхтоўцы геаграфічных кадраў, падрыхтоўцы падручнікаў, вучэбна-метадычных дапаможнікаў, правядзенню школьных геаграфічных алімпіяд, навуковых семінараў для настаўнікаў.
15. Праводзіць абмеркаванне і конкурсы новых падручнікаў, дапаможнікаў па геаграфіі.
16. Падтрымаць ініцыятыву ў распрацоўцы стандартаў геаграфічнай адукацыі.
17. Праводзіць прапаганду геаграфічных ведаў сярод насельніцтва.
18. Актывізаваць работу па арганізацыі Інстытута геаграфіі на базе геаграфічнага факультэта БДУ і інстытутаў АН Беларусі.
19. Праводзіць работу па ўзмацненню сувязяў з геаграфічнымі таварыствамі іншых краін блізкага і далёкага замежжа, зрабіць захады па арганізацыі міжнароднага альянсу геаграфічных таварыстваў.
20. Актывізаваць работу па аказанню навуковых кансультацый.
21. Працягваць работу па навуковых чытаннях, прысвечаных вядомым беларускім географам, больш увагі ўдзяляць пытанням развіцця геаграфічнай думкі ў РБ.
22. Зацвердзіць членскія ўзносы: для асоб, маючых навуковую ступень – 10% ад мінімальнай зарплаты, для супрацоўнікаў без навуковай ступені – 5%; для студэнтаў – 1% ад стыпендыі. Непрацуючыя пенсіянеры не плацяць узнос. Уступны ўзнос для асоб, маючых навуковую ступень – 20% ад мінімальнай зарплаты, для астатніх – 10%.
23. Актывізаваць работу рэдакцыйна-выдавецкага аддзела.
24. Арганізоўваць экспедыцыі школьнікаў.
25. Савету БГТ аказаць неабходную дапамогу ў арганізацыі Віцебскага аддзела БГТ.
26. Звярнуцца ў Міністэрства адукацыі РБ з хадатайніцтвам дазволіць кафедры геаграфіі Віцебскага педінстытута працаваць па асабістаму вучэбнаму плану падрыхтоўкі географаў на перыяд станаўлення кафедры (5 гадоў).
27. Хадайнічаць перад Міністэрствам адукацыі РБ аб дапамозе ў арганізацыі геаграфічных выданняў.
28. Звярнуцца з захадамі да ўраду РБ аб ільготным падаткаабкладанні навуковай і гаспадарчай дзейнасці Геаграфічнага таварыства.

Навуковая частка праграмы складалася з 10 пленарных дакладаў і трох сімпозіумаў (круглых сталоў). З дакладамі выступілі Р.А.Жмойдзяк, В.П.Якушка, В.С.Аношка, Л.В.Казлоўская, В.М.Губін, У.Ф.Логінаў, В.М.Плужнікаў, Б.А.Манак, С.І.Сідор, В.І.Войцік.

Першы круглы стол быў прысвечаны тэме: “Праблемы вучэбнай геаграфіі” (вядучыя С.І.Сідор, І.П.Галай). Выступілі: М.С.Вайтовіч, С.Ф.Зубовіч, А.А.Зыль, К.Р.Кірэенка, С.А. Кручак, Р.Г.Обух, В.В.Пугач, С.І.Сідор, М.Л.Страха, А.У.Грыбко, І.М.Шаруха і інш. Другі круглы стол - “Географа – экалагічныя праблемы Беларусі і шляхі іх вырашэння” (вядучыя В.М.Шырокаў, У.Ф.Логінаў), Выступілі: С.М.Зайко, В.А.Бакарасаў, В.Я.Бардон, М.М.Брылеўскі, Л.В.Гур’янава, Д.Л.Іваноў, В.У.Кадацкая, В.Н.Кісялёў, І.І.Кірвель, А.К.Карабанаў, П.С.Лопух, У.А.Пракапеня, Г.А.Сербін, Б.П.Уласаў, В.М.Яцухна і інш. Трэці круглы стол “Праблемы эканамічнага і сацыяльнага равіцця Беларусі” (вядучыя Л.В.Казлоўская, А.У.Тамашэвіч). Удзельнікі: М.У.Амельянчук, С.В.Арцёменка, М.І.Бобрык, А.Г.Злотнікаў, Т.А.Клімава, Н.В.Кавальчык, В.М.Корзун, К.К.Красоўскі, А.А.Малахаў, Г.А.Патаеў, Г.В.Рыдзеўскі, Т.А.Федарцова, В.С.Хоміч, А.А.Швяцоў і інш.

Пасля закрыцця канферэнцыі адбыўся ўрачысты сход супрацоўнікаў, студэнтаў і выпускнікоў геафака, прысвечаны 60-годдзю геаграфічнага факультэта БДУ. На сходзе прысутнічала больш за 600 чалавек.

26 лістапада 1994 г. на пасяджэнні Вучонага савета БГТ разгледжана пытанне аб размеркаванні абавязкаў сярод членаў новага складу Савета. В.С. Аношка– прэзідэнт БГТ, віцэ-прэзідэнты – Л.В. Казлоўская, С.І. Сідор, В.М. Яцухна; вучоны сакратар Савета У.Ю. Малашанкаў., П.С. Лопух– старшыня Мінскага аддзела, І.І. Богдзель– старшыня Гомельскага аддзела, Г.У. Рыдзеўскі– старшыня Магілёўскага аддзела, С.І. Курдзін– старшыня Віцебскага аддзела, В.Я. Навуменка– старшыня Брэсцкага аддзела, Т.А. Раманава– старшыня камітэта геаэкспертызы, А.М. Вітчанка– старшыня рэдакцыйна-выдавецкага Савета, К.Р. Кірэенка – старшыня аддзялення эканамічнай і сацыяльнай геаграфіі, В.С. Хоміч– старшыня аддзялення фізічнай геаграфіі і геаэкалогіі, А.К. Карабанаў– старшыня камітэта па сувязях з АН Беларусі.

На паседжанні Вучонага савета 7 снежня 1994 г. была прынята пастанова, згодна якой усе кандыдацкія і доктарскія дысертацыі геаграфічных спецыяльнасцей праходзяць абмеркаванне на аддзяленнях БГТ. На гэтым жа пашыраным Савеце адбылося абмеркаванне кандыдацкай дысертацыі Яна Тайбао (КНР) “Палеагеаграфія Ційхай-Тыбецкага нагор’я ў антрапагене” (кіраўнік В.П.Якушка).

3 лютага 1995 г. Вучоны савет БГТ абмеркаваў і зацвердзіў план мерапрыемстваў, прысвечаных 150-годдзю з дня нараджэння І.Д.Чэрскага. Выступілі: В.С. Аношка, У.Ю. Малашанкаў, С.С. Мітраховіч, В.М. Яцухна, В.І. Пашкевіч Савет пастанавіў: 1. Правесці канферэнцыю прысвечаную 150-годдзю І.Д.Чэрскага, 22-25 мая 1995 г. з выездам на радзіму вучонага. 2. Зацвердзіць арганізацыйны камітэт канферэнцыі: Р.Г. Гарэцкі– старшыня, В.С. Аношка– сустаршыня, члены – А.В. Мацвееў, С.С. Мітраховіч, У.Ю. Малашанкаў, В.І., Пашкевіч С.І., Сідор, Б.Ф Шымук, В.А.Ярмоленка.

На пашыраным пасяджэнні Вучонага савета БГТ 7 красавіка 1995 г. абмеркаваны кандыдатуры членаў БГТ для ўдзелу ў X з’ездзе Рускага

геаграфічнага таварыства. Прапанаваны наступныя кандыдатуры: Аношка В.С., Казлоўская Л.В., Якушка В.П., Агаханянц А.Е., Жмойдзяк Р.А., Рыдзеўскі Г.У., Курдзін С.І., Навуменка У.Я., Богдэль І.І., Лопух П.С., Хоміч В.С., Ляўкоў Э.А.

Зацверджана Праграма канферэнцыі, прысвечанай 150-годдзю І.Д.Чэрскага.

**23 мая 1995 г.**
**Рэспубліканскі цэнтр дзіцяча-юнацкага турызму і экскурсій**
**(вул. 3-я Пасялковая, 18)**
**9.00 — 13.00**

**Сімпозіум (круглы стол):**
**“Краязнаўства ў геаграфічнай навуцы і адукацыі.”**

**Вядучыя** - д.г.н., прафесар С.І.Сідор, С.С.Мітраховіч.

**Удзельнікі:** **А.А.Лісоўскі** “Роля краязнаўства ў геаграфічнай падрыхтоўцы школьнікаў”. **Л.С.Цвірко** “Выкарыстанне краязнаўчага матэрыяла ў экалагічным выхаванні студэнтаў”. **А.А.Багдасараў, В.Я.Навуменка** “Краязнаўчы прынцып правядзення геалагічных экскурсій для школьнікаў і студэнтаў”. **Я.М.Мяшэчка** “Роля краязнаўчых даследванняў у вывучэнні прыроды Беларусі”. **С.І.Сідор** “Краязнаўчы падыход у выкладанні геаграфіі ў школе па новай праграме”. **Я.М.Мяшэчка, М.П.Міхальчук** “Краязнаўчыя прынцыпы ў выкладанні геаграфіі ў сярэдняй школе” **Г.С.Смалякоў** “Краіназнаўчы напрамак у сучаснай геаграфіі”. **П.С.Лопух** “Методыка арганізацыі гідралагічных назіранняў у школе”. **Т.А.Рысянкова** “Навуковыя даследванні, праводзімыя з навучэнцамі па экалогіі”. **С.С.Мітраховіч** “Аб стварэнні рэспубліканскай геаграфічнай школы пры РЦДТЭ”. **А.А.Фурс.** “З вопыту работы школьнага музея “Чалавек і прырода”. **Т.В.Котава** “Экалагічнае выхаванне — неабходны элемент у навучальна-выхаваўчым працэсе”. **А.П.Філіпаў** “Вывучэнне экалогіі роднага краю (з вопыту работы)”. **У.А.Жданюк** “З вопыту работы гуртка “Юны геолаг””. **А.М.Болатаў** “Магчымасці турысцкіх падарожжаў па мясцінах жыцця І.Д.Чэрскага”. **У.М.Барташэвіч** “Экалагічнае выхаванне на ўроках геаграфіі” **і іншыя.**

Абмеркаванне дакладаў і прыняцце рашэння.

**15.00 — ад`езд на радзіму І.Д.Чэрскага**
**(Верхнедзвінскі раён Віцебскай вобл.)**

**24 мая 1995 г.**
**9.00 — 12.00**

Выяздное паседжанне, прысвечанае афіцыйнаму адкрыццю мемарыяльнага музея І.Д.Чэрскага.

Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь

Акадэмія навук Беларусі

Беларускае Геаграфічнае таварыства

Беларускае Геалагічнае таварыства

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ,

**ПРЫСВЕЧАНАЯ 150-ГОДДЗЮ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ВЫДАТНАГА БЕЛАРУСКАГА ГЕОЛАГА І ГЕОГРАФА І.Д.ЧЭРСКАГА**

**ЗАПРАШЭННЕ І ПРАГРАМА**

Мінск 1995

22 мая 1995 г. у памяшканні Прэзідыума АН Беларусі адкрылася Рэспубліканская навуковая канферэнцыя, прысвечаная 150-годдзю І.Д.Чэрскага. Праграма канферэнцыі была выканана поўнасцю. Прысутнічала больш за 150 чалавек. У час выязнога пасяджэння Вучонага савета БГТ адбылся сустрэча членаў Савета з кіраўніцтвам Верхнядзвінскага раёна, з настаўнікамі і вучнямі школ Віцебскай вобласці.

24 мая 1995 г. адбылося афіцыйнае адкрыццё мемарыяльнага музея І.Д.Чэрскага. На адкрыцці выступілі: Р.Г. Гарэцкі, В.С. Аношка, Б.Ф. Шымук і інш. Адбыўся мітынг на месцы нараджэння І.Д.Чэрскага з удзелам мясцовых жыхароў, вучняў і настаўнікаў. Да помніка І.Д.Чэрскага ўскладзены кветкі.

Пасяджэнне Вучонага савета БГТ 28 чэрвеня 1995 г. было прысвечана вырашэнню выдавецкіх праблем БГТ. Выступілі Аношка В.С., Казлоўская Л.В., Лопух П.С., Малашанкаў У.Ю. Прысутнічаючы прэзідэнт фірмы “Арты-факт” Л.Р.Казлоў прапанаваў сумесна з БГТ падрыхтаваць першы нумар часопіса “Наш край”. Прапанова падтрымана.

Вырашана падтрымаць экспедыцыйныя паездкі членаў БГТ Какарэка С.В.(Бішкек – Алматы) і Зайко С.М.(Эстонія). Зацверджана кандыдатура Р.І.Аўчыннікавай на пасаду кіраўніка секцыі тапанімікі БГТ. Аўчыннікава Р.І. рэкамендавана для ўдзела ў працы першага паседжання Балтыйскага аддзела групы экспертаў ААН па геаграфічных назвах.

5 кастрычніка 1995 г. на пасяджэнні Вучонага савета БГТ разгледжана пытанне ўдзелу беларускіх географаў у X з'ездзе Рускага геаграфічнага таварыства. Заслухана інфармацыя Аношкі В.С. "Праблемы геаграфіі і геаэкалогіі ў праграме X з'езда РГТ".

23 кастрычніка 1995 г. памёр член Вучонага савета БГТ Вячаслаў Міхайлавіч Шырокаў.

1 лістапада 1995 г. адбыўся агульны сход членаў БГТ. Заслуханы навуковы даклад В.Б.Кадацкага "Тэхнафільныя элементы ў ландшафтах Беларусі". Прысутнічалі больш за 60 чалавек.

На снежаньскім пасяджэнні (6 снежня 1995 г.) была заслухана справаздача В.С.Аношкі аб рабоце Вучонага савета БГТ у 1995 г.. Выступілі В.М.Яцухна, П.С.Лопух, У.Ю.Малашанкаў, А.М.Вітчанка. Пастанавілі справаздачу зацвердзіць.

На пасяджэнні Вучонага савета БГТ 15 студзеня 1996 г. разгледжана пісьмо Літоўскага геаграфічнага таварыства з прапановай супрацоўніцтва беларускіх і літоўскіх географаў па даследаванню прыгранічных ахоўваемых тэрыторый. Інфармацыю зрабіў В.М.Яцухна, які Саветам БГТ быў накіраваны ў Вільнюс для вырашэння агульных пытаняў. Вырашана падтрымаць прапанову літоўскіх географаў, накіраваць піьмо Міністру прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя РБ з канкрэтнымі прапановамі. Міністэрства пагадзілася з прапановай і на базе БГТ быў створаны творчы калектыў (кіраўнік В.М.Яцухна, навуковы кансультант В.С.Аношка) па выкананню тэмы.

25 студзеня 1995 г. Вучоны савет разгледзеў пытанне аб прысваенні вучонага звання "прафесар" Я.М.Мяшэчку. Савет аднагалосна падтрымаў кандыдатуру Я.М.Мяшэчкі і накіраваў пісьмо на імя рэктара Брэсцкага дзяржуніверсітэта з абгрунтаваннем гэтага рашэння.

31 студзеня адбыліся чарговыя чытанні акадэміка К.І.Лукашова, у якіх прынялі ўдзел больш за 50 чалавек.

14 лютага 1996 г. на пашыраным пасяджэнні Вучонага савета БГТ слухалі даклад А.М.Вітчанкі па тэме доктарскай дысертацыі "Тэарэтычныя і прыкладныя асновы аграэкалагічнага патэнцыялу ландшафтаў Беларусі". У абмеркаванні прынялі ўдзел Раманава Т.А., Яцухна В.М., Кісялёў В.Н., Логінаў В.Ф. Савет аднагалосна (30 – "за") прыняў пашыранае заключэнне па дысертацыі і накіраваў яго ў Савет БДУ па абароне дысертацый.

На пасяджэннях Вучонага савета БГТ у сакавіку і красавіку 1996 г. разглядаліся пытанні перарэгістрацыі абласных аддзелаў БГТ.

25 красавіка 1996 г. на пасяджэнні Вучонага савета БГТ абмяркоўвалася пісьмо ў адміністрацыю Прэзідэнта РБ і Прэзідыума Вярхоўнага савета РБ "Аб стварэнні Дзяржаўнага Савета РБ па геаграфічных назвах". Выступілі

В.С.Аношка, Р.І.Аўчыннікава, В.М.Яцухна, Л.В.Казлоўская, П.С.Лопух. Пастанавілі накіраваць пісьмо ў адміністрацыю Прэзідэнта і Вярхоўны Савет РБ.

У маі месяцы 1996 г. Прэзідыум БГТ зацвердзіў эскіз пячаткі Магілёўскага аддзела і выдзеліў сродкі на яе выраб.

У маі 1996 г завяршылася работа па вызначэнню Геаграфічнага цэнтра Беларусі, удзельнікам якой было БГТ. У адкрыцці знака “Геаграфічны цэнтр Беларусі” у Пухавіцкім раёне Мінскай вобл. удзельнічаў В.С.Аношка.

11 верасня 1996 г. на пасяджэнні Вучонага савета БГТ заслухана інфармацыя В.М. Яцухна аб рабоце 28 Кангрэса Міжнароднага геаграфічнага саюза (4-10 жніўня 1996 г. г.Гаага), удзельнікам якога ён быў. Вырашана арганізаваць выставу матэрыялаў 28-го Канрэса на геаграфічным факультэце БДУ (адказны В.М.Яцухна) і правесці агульны сход на гэтую тэму.

Савет падтрымаў кандыдатуру прафесара Калінінградскага дзяржуніверсітэта Е.В.Краснова на суісканне Міжнароднай прэміі “Фонд за будучае Балтыйскага мора”.

25 верасня 1996 г. адбыўся агульны сход членаў БГТ, на якім выступіў В.М.Яцухна з дакладам: “28-ы Кангрэс Міжнароднага геаграфічнага саюза (Гаага, Галандыя): вынікі, напрамкі развіцця геаграфіі”. Прысутнічалі больш за 50 чалавек. У час сходу быў паказаны слайд-фільм “Геаграфія Галандыі”, працавала выстава матэрыялаў кангрэса.

Вышаў з друку навуковы зборнік БГТ “Водныя рэсурсы Беларускага Паазер’я: іх выкарыстанне і ахова”.

20 лістапада 1996 г. Вучоны савет узнагародзіў У.Г. Хамякова Граматай БГТ за вялікі ўклад у развіццё геаграфічнай адукацыі і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння.

На пасяджэнні Вучонага савета БГТ 26 лютага 1997 г. быў рагледжаны зварот Старшыні навукова-метадычнага аб’яднання педагагічных ВНУ Расіі да Савета з просьбай прапанаваць у склад НМА прадстаўніка Беларусі. Савет вырашыў рэкамендаваць ад Беларусі ў склад НМА Расіі праф. М.С.Вайтовіча.

На сакавіцкім пасяджэнні Вучонага савета абмяркоўвалася праблема ўдзела географаў у вырашэнні праблем устойлівага развіцця РБ. Выступілі В.С. Аношка, Л.В. Казлоўская., В.М. Яцухна Савет пастанавіў правесці агульны сход па гэтай праблеме.

Савет дазволіў камандзіраваць Р.І.Аўчыннікаву ў Верхнядзвінскі, Браслаўскі, Міёрскі раёны для тапанімічных даследаванняў.

15 мая 1997 г. на пасяджэнні Вучонага савета разглядалася пытанне правядзення (месца, час) VI з’езда БГТ. Разгледжана прапанова магілёўскага аддзела правесці з’езд у Магілёве. Выступілі В.С. Аношка, У.Ю. Малашанкаў, В.М. Яцухна, П.С. Лопух. Вырашылі правесці VI з’езд БГТ у Магілёве на базе МДПУ.

За вялікі ўклад у развіццё геаграфіі і ў сувязі з юбілеем Савет узнагародзіў: Ганаровай граматай БГТ – Б.М.Нешатаева, С.І.Сідора, В.Н. Кісялёва, Л.В.Казлоўскую, Л.А.Дземідовіча, Ю.М.Емельянава, В.М. Яцухну.

Граматай БГТ: Г.У. Рыдзеўскага, Л.У.Мар'іну, Ю.П.Качкова, Л.І. Антоненка. У сувязі з 75-годдзем П.А.Лярскага вырашана звярнуцца ў Вярхоўны Савет РБ з просьбай аб узнагароджанні яго ўрадавай узнагародай.

Створана рабочая група па распрацоўцы Палажэння аб узнагародах БГТ у складзе: Малашанкаў У.Ю., Кадацкая В.У., Сідор С.І., Брылеўскі М.М., Рыдзеўскі Г.У., Болатаў А.М., Вайтовіч М.С.

22 мая 1997 г. адбыўся агульны сход членаў БГТ на тэму: "Геаграфічная інтэрпрэтацыя праблем устойлівага развіцця РБ на сучасным этапе". Выступілі: В.С. Аношка, Л.В.Казлоўская, В.М. Яцухна. У абмяркаванні праблемы прынялі ўдзел больш за 10 чалавек. На сходзе прысутнічалі 43 члены БГТ.

1998 г. быў годам юбілеяў: 90-годдзе з дня нараджэння В.А.Дзяменцьева, 65-годдзе кафедры глебазнаўства, 25-годдзе кафедры агульнага землязнаўства. Пасяджэнні Вучонага савета і Прзідыума студзеня – сакавіка 1998 г. былі прысвечана пытанням падрыхтоўкі да гэтых дат. Створаны арганізацыйныя камітэты па правядзенню гэтых мерапрыемстваў.

У маі 1998 г. Вучоны савет БГТ удзельнічаў у арганізацыі і правядзенні навуковай канферэнцыі па Праграме Савета фундаментальных геаграфічных праблемах Міжнароднай акадэміі навук у п. Раубічы і г.Мінску. З дакладамі выступілі В.С Аношка, ……

Члены Вучонага савета БГТ В.М.Яцухна і В.С.Хоміч удзельнічалі ў Міжнародным праекце па складанню карты аховы навакольнага асяроддзя краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы (м-б 1:3 000 000).

Ад імя БГТ Л.В.Казлоўская і В.М.Яцухна ўдзельнічалі ў напісанні манаграфіі "Устойлівае развіццё Цэнтральнай і Усходняй Еўропы (прасторавае развіццё)" якая вышла з друку ў г.Дрэздэне (Германія).

17 верасня 1998 г. адбылася навуковая канферэнцыя, прысвечаная 65-годдзю кафедры глебазнаўства і геалогіі, якая праводзілася сумесна з беларускім таварыствам глебазнаўцаў. . З дакладамі выступілі В.С.Аношка, Т.А.Раманава, В.В.Жылко, М.К.Чартко і інш. Адбылася сустрэча выпускнікоў кафедры розных гадоў.

Па прапанове камісіі па культурнай геаграфіі Міжнароднага геаграфічнага саюза географы Беларусі (М.М.Брылеўскі, В.М. Яцухна., А.І. Яшкін.) прынялі ўдзел у падрыхтоўцы сусветнага слоўніка "Геаграфія культурнай спадчыны".

25-27 лістапада 1998 г. прайшла канферэнцыя "Развіццё ідэй В.А.Дзяменцева ў сучасных геамарфалагічных і ландшафтных даследаваннях", прысвечаная 90-годдзю Прэзідэнта БГТ В.А.Дзяменцева. У канферэнцыі прынялі ўдзел больш за 100 чалавек. Надрукаваны матэрыялы канферэнцыі пад рэдакцыяй Г.І.Марцынкевіч, Н.К.Кліцуновай і Л.В.Гур'янавай. Выпушчаны буклет малюнкаў В.А.Дзяменцева, арганізавана выстава яго прац.

На паседжанні Вучонага Савета 21 студзеня 1999 г. разгледжаны пытанні арганізацыі і праграма VI з'езда БГТ. Выступілі: В.С. Аношка, І.І. Пірожнік, В.М. Яцухна, Л.В. Казлоўская., Г.У. Рыдзеўскі., І.М. Шаруха

Пастанавілі: VI з’езда БГТ правесці 28 верасня – 3 кастрычніка 1999 г. пад дэвізам “Геаграфія на парозе XXI века”; навуковую канферэнцыю правесці па тэме “Геаграфічныя праблемы ўстойлівага развіцця Беларусі”; абраць дэлегатаў на з’езд з разліку 1 дэлегат ад 10 членаў БГТ, прасіць Міністэрства адукацыі РБ дэлегаваць на з’езд па 10-15 лепшых настаўнікаў геаграфіі ад кожнай вобласці.

За вялікі ўклад у развіццё геаграфіі Савет узнагародзіў Б.А. Манак Ганаровай Граматай БГТ, В.П. Раманава – Граматай БГТ.

18 сакавіка 1999 г. Вучоны савет БГТ прыняў пастанову аб адкрыцці Мазырскага аддзела БГТ. Выступілі: В.С.Аношка, П.С.Лопух, В.М.Яцухна, Л.А.Лісоўскі. Пастанавілі: стварыць аддзел БГТ пры Мазырскім педінстытуце; даручыць рашэнне арганізацыйных пытанняў па стварэнню аддзела члену БГТ с 1976 г. Л.А.Лісоўскаму

12 красавіка 1999 г. адбыўся агульны сход членаў БГТ, прысвечаны 160-годдзю з дня нараджэння М.М.Пржэвальскага. Праграма ўключала: даклад пра жыццё і дзейнасць вучонага; сустрэча з вядомымі беларускімі вандроўнікамі У.Ганапольскім, Э.Ліпенем, І.Вяленковай і інш., прэзентацыю кнігі С.Новікава “Каб вярнуцца”, вечар аўтарскай песні. Прысутнічалі больш за 50 чалавек.

Майскія пасяджэнні Вучонага савета і Прэзідэнта БГТ былі прысвечаны пытанням падрыхтоўкі да VI з’езда БГТ. Абрана рэдакцыйная калегія па падрыхтоўцы матэрыялаў з’езда ў складзе: В.М. Яцухна, Г.С. Смалякоў, І.П.Галай, П.С. Лопух., А.М. Вітчанка. Складзены рабочыя групы па асобных мерапрыемствах, зацверджана Праграма з’езда.



ПРАГРАМА
VI З’ЕЗДА БЕЛАРУСКАГА ГЕАГРАФІЧНАГА ТАВАРЫСТВА
(27 верасня — 1 кастрычніка 1999 г. Магілёў)

МІНСК
1999

Да ўвагі дэлегатаў і гасцей з’езда

VI з’езд Беларускага геаграфічнага таварыства адбудзецца ў г. Магілёве 27 верасня -1 кастрычніка 1999 г.

Рэгістрацыя удзельнікаў з’езда будзе праводзіцца ў памяшканні Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта (г. Магілёў, вул. Касманаўтаў, 1)
27 верасня з 12 да 20 гадз.
28 верасня з 8 да 10 гадз.

Транспарт: праезд ад аўтобуснай станцыі альбо чыгуначнага вакзала - трал. № 5, аўт. № 10 да прып. «Універсітэт»

Арганізацыйны камітэт з’езда

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Аўласевіч Міхаіл Аляксеевіч | рэктар Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А. Куляшова, член-кар. Акадэміі педагагічных навук — старшыня |
| 2. | Аношка Валерый Станіслававіч | Прэзідэнт Беларускага Геаграфічнага таварыства — сустаршыня |
| | **Члены аргкамітэта:** | |
| 3. | Бурак Фёдар Фёдаравіч | старшыня Гомельскага аддзела БГТ |
| 4. | Ганушчанка Надзея Міхайлаўна | галоўны інспектар Упраўлення агульнай і сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі РБ |
| 5. | Казлоўская Людміла Васіл’еўна | віцэ-прэзідэнт БГТ |
| 6. | Красоўскі Канстанцін Канстанцінавіч | старшыня Брэсцкага аддзела БГТ |
| 7. | Курдзін Сяргей Іванавіч | старшыня Віцебскага аддзела БГТ |
| 8. | Лопух Петр Сцяпанавіч | старшыня Мінскага аддзела БГТ |
| 9. | Піpожнік Іван Іванавіч | дэкан геаграфічнага факультэта БДУ |
| 10. | Рылюўскі Генадзь Уладзіміравіч | старшыня Магілёўскага аддзела БГТ |
| 11. | Хоміч Валерый Сцяпанавіч | старшыня аддзела фізічнай геаграфіі БГТ |
| 12. | Шаруха Ігар Міхайлавіч | вучоны сакратар з’езда |
| 13. | Яцухна Валянцін Міхавіч | віцэ-прэзідэнт БГТ |

Выставы
да VI з’езда БГТ

1. Геаграфія ў Магілёўскім дзяржаўным універсітэце.
2. Да 90 годдзя былога Прэзідэнта БГТ, прафесара В.А. Дзяменцева.
3. Да 100 годдзя першага Прэзідэнта БГТ, акадэміка І.С.Лупіновіча.
4. Да 100 годдзя чл.-кар. НАН РБ, прафесара А.Р.Мядзведзева.
5. Геаграфічныя карты і атласы Беларусі (мінулае, сучаснае, будучыня).
6. Выстава новай геаграфічнай літаратуры.
7. Выстава замежнай бібліяграфічнай інфармацыі аб навуковых геаграфічных выданнях

I. АРГАНІЗАЦЫЙНАЯ ПРАГРАМА

27 верасня 1999 г.
(Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт, вул. Касманаўтаў, 1)

$12^{00}$-$20^{00}$ - Рэгістрацыя ўдзельнікаў з’езда.

28 верасня 1999 г.

$8^{00}$-$10^{00}$ -Рэгістрацыя ўдзельнікаў з’езда
$9^{00}$ -Сумеснае пасяджэнне Савета, рэвізійнай камісіі БГТ і арганізацыйнага камітэту з’езда: «Аб гатоўнасці да правядзення з’езда»

Урачыстае адкрыццё з’езда
(актавая зала МДУ)
*Старшыня: дацэнт П.А. Лярскі*

$10^{00}$ - Уступнае слова рэктара МДУ, прафесара М.А. Аўласевіча
- Зварот да ўдзельнікаў з’езда старэйшага географа Беларусі, ганаровага члена БГТ, дацэнта П.А. Лярскага
- Прывітальныя словы з’езду
$11^{00}$ $12^{30}$ - Зацверджанне рэгламенту з’езда
- Выбары рабочых органаў з’езда
- Абмеркаванне і прыняцце Палажэнняў аб узнагародах і заахвочваннях БГТ
$12^{30}$-$14^{00}$ - Перапынак на абед

Вячэрняе пасяджэнне
*Старшыня: Піpожнік І.І.*

$14^{00}$-$14^{30}$ - Справаздачны даклад аб дзейнасці БГТ за перыяд 1995-1999 гг.
$14^{30}$-$14^{40}$ - Даклад Рэвізійнай камісіі
$14^{40}$-$16^{30}$ - Выступленні прадстаўнікоў абласных і гарадскіх аддзелаў БГТ.
Спрэчкі па дакладу і выступленнях
$16^{30}$-$16^{45}$ - Перапынак
$16^{45}$-$17^{45}$ - Высунэнне і абмеркаванне кандыдатаў у Прэзідэнты БГТ, у склад Вучонага Савета і Рэвізійнай камісіі БГТ. Прапанова па выбарах Ганаровых членаў БГТ
$17^{45}$ - Выбары Прэзідэнта БГТ, членаў Вучонага Савета і Рэвізійнай камісіі, Ганаровых членаў БГТ
$19^{00}$ - Вячэра, культурная праграма

II. НАВУКОВАЯ ПРАГРАМА

29 верасня $10^{00}$-$13^{00}$
*Старшыня: Якушка В.П.*

1. **Аношка В.С.** Геаграфічная навука Беларусі на мяжы XXI стагоддзя (стан, праблемы, перспектывы).
2. **Піpожнік І.І.** Удасканаленне тэрытарыяльнай арганізацыі асяроддзя жыццядзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь.
3. **Логінаў У.Ф., Струк М.І.** Экалагічныя ацэнкі развіцця эканомікі Беларусі ў пераходны перыяд
4. **Марцынкевіч Г.І.** Ацэнка ландшафтнай разнастайнасці Беларусі
5. **Галай І.П., Крайко Б.М., Мішэчка Я.М.** Праблемы школьнай геаграфіі і шляхі іх вырашэння
6. **Шаруха І.М.** Змест сучаснай пачатковай прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі.
7. **Рылюўскі Г.У.** Экалага-сацыяльна-эканамічныя праблемы Магілёўскай вобласці

Рашэннем Вучонага савета БГТ і прыказам дэкана І.І.Пірожніка ад 14.09.99 г. сакратаром таварыства прызначана Палюх Галіна Анатольеўна замест Антоненкі Людмілы Ісаеўны.

За актыўны ўдзел у студэнцкіх навукова-даследчых работах Прэзідыум БГТ узнагародзіў Граматай БГТ студэнтаў А.М.Жалевіча, А.Д.Шкарубу.

VI з’езда БГТ распачаў сваю работу 27 верасня 1999 г. а 10-ай-гадзіне ў актавай зале Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Адкрыў з’езд Ганаровы член БГТ П.А.Лярскі. З прывітальным словам выступіў першы прарэктар

МДУ А.М.Радзькоў. З віншаваннямі да ўдзельнікаў з'езда звярнуліся А.А.Брынкін (РГТ), які зачытаў прывітальнае пасланне ад Прэзідэнта РГТ. В.С.Аношка ўручыў Граматы БГТ Я.М.Мяшэчку і Л.А.Лісоўскаму. З'езд зацвердзіў рэгламент работы, праект пастановы аб узнагародах, выбраў рабочыя органы. У склад рэдакцыйнай камісіі абралі: А.М.Вітчанку (старшыня), В.Л.Белую, У.Я.Пашука, К.К.Красоўскага, Г.І.Рыдзеўскага, В.С.Хоміча; у склад падліковай камісіі: Г.С.Смалякова (старшыня), А.М.Болатава, А.В.Грыбко, Т.А.Клімаву, В.С.Мітраховіча, І.І.Пірожніка.

Справаздачу аб выніках работы Вучонага савета БГТ за 1994-1999 г. зрабіў В.С.Аношка. У спрэчках выступілі В.П.Якушка, А.У. Грыбко, Л.В.Казлоўская, І.І.Пірожнік.

Справаздачу аб рабоце Рэвізійнай камісіі зрабіла В.У.Кадацкая, аб рабоце абласных аддзелаў У.Я.Пашук (Гомель), К.К.Красоўскі (Брэст), С.П.Докіш (Віцебск), П.С.Лопух (Мінск), Г.У.Рыдзеўскі (Магілёў), Л.А.Лісоўскі (Мазыр). У абмяркаванні справаздач прынялі ўдзел Л.В.Казлоўская, Г.І.Марцынкевіч, В.Л.Белая.

Па прапанове І.І. Пірожніка ў спіс для тайнага галасавання па выбарах Вучонага савета БГТ унесены наступныя кандыдатуры: В.С.Аношка, Г.К.Хурсевіч, В.С. Хоміч, А.У. Багдановіч, Ф.Ф. Бурак, К.К. Красоўскі, Г.У. Рыдзеўскі П.С. Лопух, В.М. Яцухна, В.Л. Белая, Г.С. Смалякоў, А.М. Вітчанка, В.П. Казакевіч, А.А Макарэвіч, Л.А.Лісоўскі; па выбарах Прэзідэнта БГТ:В.С. Аношка, А.М. Вітчанка, В.М. Яцухна.

У выніку тайнага галасавання абраны ўсе кандыдаты прапанаваныя ў склад Вучонага савета БГТ.

Прэзідэнтам БГТ абраны В.С.Аношка.

У склад Рэвізійнай камісіі абраны В.А. Гаўрусеў, В.У.Кадацкая, Г.І. Марцынкевіч, В.П. Сідарэнка, М.Л. Страха, А.І. Тарасёнак.

Па прапанове Вучонага савета БГТ з'езд абраў Ганаровымі членамі БГТ Т.А.Раманаву і Л.В.Казлоўскую.

Пры падвядзенні вынікаў справаздачна-выбарчай часткі з'езда выступілі: В.С.Аношка, П.А.Лярскі, Т.А.Раманава, І.І.Пірожнік, А.А.Малахаў.

29-30 верасня 1999 г. выконвалася навуковая частка Праграмы VI з'езда БГТ. Яна ўключала пленарныя даклады (старшыня пленарнага пасяджэння В.П. Якушка) і работу 4-х секцый: 1. Экалагічныя, сацыяльна-эканамічныя, дэмаграфічныя і геапалітычныя асновы ўстойлівага развіцця (куратары Л.В. Казлоўская, Г.У. Рыдзеўскі); 2. Рэгіянальныя аспекты ўстойлівага развіцця (Г.І. Марцынкевіч, А.А. Малахаў); 3. Праблемы аптымізацыі прыродакарыстання (А.М. Вітчанка, Б.М. Нешатаеў); 4. Геаграфічныя праблемы Магілёўскага Падняпроўя (Я.К. Яловічава, І.М. Шаруха).

Асобна працавала навукова-практычная канферэнцыя "Стан і шляхі ўдасканалення геаграфічнай адукацыі ў Беларусі (куратары: І.П.Галай, Б.М. Крайко, І.М. Пракаповіч), у якой удзельнічалі настаўнікі – прадстаўнікі ўсіх абласцей Беларусі і г.Мінска. Зроблена больш за 30 дакладаў.

30 верасня 1999 г. з 9 да 12 гадзін працавалі тры круглыя сталы:

1. Агульнагеаграфічныя асновы і праблемы ўстойлівага развіцця РБ (вядучы: Г.С. Смалякоў). 2. Рэгіянальныя асаблівасці ўстойлівага развіцця РБ (вядучы: П.С. Лопух). 3. Праблема аптымізацыі прыродакарыстання (вядучы: В.М. Яцухна Выступілі больш за 60 удзельнікаў з'езда.

30 верасня 1999 г. а 14 гадзіне пад кіраўніцтвам В.С.Аношкі адбылося заключнае пленарнае паседжанне з'езда ГА БГТ. Выступілі са справаздачамі кіраўнікі секцый і круглых сталоў. Адбылася агульная дыскусія, на якіх выступілі больш за 10 удзельнікаў. Па прапанове А.М.Вітчанкі і У.Я.Пашука была абмяркавана і аднагалосна прынята Пастанова VI з'езда ГА БГТ.

## VI З'ЕЗД ГРАМАДСКАГА АБ'ЯДНАННЯ "БЕЛАРУСКАЕ ГЕАГРАФІЧНАЕ ТАВАРЫСТВА" ПАСТАНАЎЛЯЕ

- Дзейнасць Савета ГА БГТ прызнаць здавальняючай. Адзначыць добрую працу Брэстскага і Магілёўскага аддзелаў.
- Зацвердзіць справаздачу рэвізійнай камісіі ГА БГТ.
- Актывізаваць дзейнасць ГА БГТ, усіх географаў па павышэнню ролі геаграфічных навук у рашэнні актуальных навуковых задач, ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Прапанаваць Ураду Беларусі пашырыць даследаванні маніторынгавага характара за станам навакольнага асяроддзя і па стварэнню кадастраў прыродных рэсурсаў краіны.
- Узмацніць сувязі ГА БГТ з вытворчымі, навуковымі, праектнымі ўстановамі і ведамствамі для сумеснага рашэння праблем рацыянальнага прыродакарыстання. Выступіць з ініцыятывай утварэння беларускай асацыяцыі рэгіянальных даследаванняў.
- Аказваць навукова-метадычную дапамогу грамадскім арганізацыям, дзейнасць якіх накіравана на вырашэнне геаэкалагічных задач рэспубліканскага, рэгіянальнага і лакальнага ўзроўняў. Садзейнічаць паглыбленню экалагічнай адукацыі насельніцтва, вучняў сярэдняй школы і ВНУ.
- Узмацніць работу рэгіянальных аддзелаў ГА БГТ. Дабіцца павелічэння колькаснага складу ГА БГТ. Адкрыць Гродненскі і Мазырскі аддзелы ГА БГТ. Рэгіянальным аддзелам ГА БГТ сканцэнтраваць увагу на праблемах тэрытарыяльнай арганізацыі сваіх рэгіёнаў, на падрыхтоўцы і выданні падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў па геаграфіі адміністрацыйных абласцей і раёнаў Беларусі.
- Удзельнічаць у распрацоўцы навуковых геаграфічных экспертыз буйных сацыяльна-гаспадарчых праектаў, праграм і г.д.
- Паглыбляць даследаванні функцыянавання, дынамікі і развіцця прыродных і прыродна-антрапагенных геасістэм з мэтай аптымізацыі геаэкалагічнага становішча Беларусі.
- Актывізаваць работу па вывучэнню дэмаграфічных працэсаў у краіне.

- Прыняць удзел у падрыхтоўцы і выданні Атласа РБ.
- Больш увагі ўдзяляць падрыхтоўцы геаграфічных кадраў, выданню падручнікаў, вучэбна-метадычных дапаможнікаў, правядзенню школьных геаграфічных алімпіяд, навуковых семінараў для настаўнікаў. Праводзіць абмеркаванне і конкурсы новых падручнікаў і дапаможнікаў па геаграфіі.
- Прыняць удзел у распрацоўцы праграм геаграфічных дысцыплін у адпаведнасці з адукацыйнымі стандартамі РБ. Правесці навуковую канферэнцыю па праблемах выкладання геаграфічных дысцыплін у ВНУ Беларусі.
- Больш увагі ўдзяляць праблемам выкладання геаграфіі ў сярэдняй школе. Прасіць Міністэрства адукацыі павялічыць колькасць гадзін выкладання геаграфіі ў сярэдняй школе і ўвесці яе выкладанне ў выпускным класе. Арганізаваць пры ГА БГТ аддзел школьнай геаграфіі.
- Прасіць Нацыянальны інстытут адукацыі і Міністэрства адукацыі РБ направіць на рэцэнзію ў ГА БГТ праграму школьнага курса “Чалавек і сусвет”.
- Пад эгідай ГА БГТ сумесна з Міністэрствам адукацыі правесці акцыю сярод школьнікаў краіны “Мая радзіма Беларусь”.
- Актывізаваць работу рэдакцыйна-выдавецкага аддзела. Хадайнічаць перад Міністэрствам адукацыі і кіраўніцтвам БДУ аб дапамозе ў арганізацыі геаграфічных выданняў. Прасіць Мінпрыроды РБ павялічыць тыраж экалагічнага бюлетэня “Стан прыроднага асяроддзя Беларусі”. Савету ГА БГТ, пачынаючы з 2000 года, арганізаваць выданне штогодніка ГА БГТ “Геаграфічныя весткі”.
- Аддзелам ГА БГТ арганізаваць работу па збору і сістэматызацыі матэрыялаў аб вядомых вучоных географах свайго краю з мэтай выдання біяграфічнай серыі.
- Праводзіць прапаганду геаграфічных ведаў сярод насельніцтва. Актыўна выкарыстоўваць для гэтай мэты перыядычны друк, асабліва мясцовы.
- Працягваць работу па арганізацыі навуковых чытанняяў, прысвечаных вядомым беларускім географам і значным геаграфічным падзеям. Правесці чытанні з нагоды 65-годдзя С.І.Сідора.
- Узмацніць сувязі з геаграфічнымі таварыствамі СНД і іншых краін. Устанавіць кантакт з эканоміка-геаграфічнай секцыей навуковага савета РАН па праблемах эканомікі рэгіёнаў і міжрэгіянальных адносін.
- Правесці рэспубліканскія навуковыя канферэнцыі па актуальных праблемах геаграфіі на базе Брэсцкага, Гомельскага, Магілёўскага аддзелаў ГА БГТ.
- Правесці мІжнародную канферэнцыю “Тэрытарыяльная арганізацыя жыццядзейнасці грамадства: тэорыя і практыка”.
- Зацвердзіць гадавыя і ўступныя членскія ўзносы ў памеры – 0,5 мінімальнай зарплаты, для студэнтаў – 0,1 мінімальнай зарплаты. Збіраць узносы 2 разы ў год у памеры 50% гадавога ўзноса ў тэрмін да 30 чэрвеня і 31 снежня бягучага года. Дазволіць у асобных выпадках, збшраць

узносы адзін раз у год у тэрмін да 31 снежня бягучага года. Непрацуючыя пенсіянеры, інваліды, беспрацоўныя грамадзяне і жанчыны, якія знаходзяцца ў адпачынку па ўходу за дзецьмі, узносы не плацяць.

- Даручыць Савету ГА БГТ зрабіць заказ на выраб значкоў, членскіх білетаў і іншай атрыбутыкі ГА БГТ.
- Прасіць кіраўніцтва геаграфічнага факультэта БДУ выдзяліць пакой для бібліятэкі і навуковага архіва ГА БГТ.

21 кастрычніка 1999 г. адбылося пасяджэнне Вучонага Савета БГТ, на якім адбылося размяркаванне абавязкаў паміж членамі Савета. З прапановай выступілі А.М. Вітчанка, П.С.Лопух, Г.С. Смалякоў, В.М. Яцухна. Абавязкі размеркаваліся наступным чынам: Аношка В.С. – Прэзідэнт ГА БГТ; А.М.Вітчанка – віцэ-прэзідэнт па інфармацыйна-выдавецкіх пытаннях; В.Л.Белая – віцэ-прэзідэнт па пытаннях школьнай геаграфіі; В.М.Яцухна – віцэ-прэзідэнт па міжнародных сувязях; А.А.Макарэвіч – вучоны сакратар; Ф.Ф.Бурак – старшыня Гомельскага аддзела; К.К.Красоўскі – старшыня Брэсцкага аддзела; Л.А.Лісоўскі – старшыня Мазырскага аддзела; Г.У.Рыдзеўскі – старшыня Магілёўскага аддзела; Г.І. Пілавец – старшыня Віцебскага аддзела, Г.С.Смалякоў – страшыня аддзялення эканамічнай геаграфіі; П.С.Лопух – старшыня аддзялення фізічнай геаграфіі; В.С.Хоміч – старшыня аддзялення геаэкалогіі; В.П.Казакевіч – старшыня аддялення ГІС і картаграфіі; Г.К.Хурсевіч – старшыня аддзялення па сувязях з НАН Беларусі.

Разгледжана пытанне, якое датычыцца членскіх узносаў. Выступілі П.С.Лопух, Г.С.Смалякоў, Г.У.Рыдзеўскі, А.У.Грыбко, А.М.Вітчанка. Пастанавілі: штогадавы і ўступны ўзносы зацвердзіць у памеры 0,5 мінімальнай зарплаты. Узносы збіраць 2 разы ў год (50% - да 30 чэрвеня, 50% - да 31 снежня). У асобных выпадках узносы можна збіраць 1 раз у год да 31 снежня.

Пасяджэнне Вучонага савета 28 снежня 1999 г. было прысвечана пытанням планавання работы Савета і Прэзідыума. Выступілі В.С.Аношка, А.М.Вітчанка, В.М.Яцухна, В.П.Казакевіч, П.С.Лопух, Г.С.Смалякоў, В.У.Кадацкая, В.Л.Белая. Вырашылі ў далейшым гадавыя планы складаць толькі на буйныя мерапрыемствы (канферэнцыі, сходы членаў БГТ, юбілейныя даты і т.п.), астатнія праводзіць па ініцыятыве членаў БГТ па парадку паступлення прапаноў.

За актыўную работу ў Геаграфічным таварыстве А.А.Малахаў, узнагароджаны Ганаровай граматай ГА БГТ.

На студзенскім пасяджэнні 2000 г. Прэзідыума Вучонага савета ГА БГТ абмеркаваны асноўныя юбілейныя даты ў 2000 г., да якіх павінны быць прымеркаваны мерапрыемствы БГТ. Гэта юбілеі І.І.Хоцькі, І.С.Лупіновіча, Г.І. Гарэцкага, Я.Д.Чэрскага, В.М.Шырокава. Вырашылі да 1 сакавіка 2000 г. скласці планы мерапрыемстваў, прысвечаных гэтым датам.

16 сакавіка 2000 г. адбыўся сход членаў аддзялення геаэкалогіі, на якім выступіў А.М.Вітчанка з дакладам: “Геаэкалогія як навука”. Прысутнічала

больш за 40 чалавек. Зацверджаны план мерапрыемстваў, якія будуць праведзены ў 2000 г. і прысвечаныя юбілейным датам.

21 сакавіка 2000 г. на пасяджэнні Вучонага савета разгледжаны стан і магчымасці развіцця інфармацыйна – выдавецкай работы БГТ. Выступілі В.С.Аношка, П.С.Лопух, В.С.Хоміч, В.М.Губін, В.П.Казакевіч, А.М.Вітчанка, Г.С.Смалякоў. Вырашылі: актывізаваць інфармацыйна-выдавецкую работу; абавязкі па прапагандзе і інфармацыі ўскласці на В.М.Яцухна, па выдавецкай рабоце – на П.С.Лопуха, вызваліўшы ад іх А.М.Вітчанку па яго просьбе; падрыхтаваць эскізы значкоў Ганаровых дыпломаў, медалёў і пахвальных лістоў для ўзнагароджання імі членаў БГТ (адказны П.С.Лопух).

10 красавіка 2000 г. у памяшканні НАН Беларусі адбылася навуковая канферэнцыя, прысвечаная 100-годдзю Ганаровага члена ГТ СССР акадэміка Г.І.Гарэцкага. У ліку арганізатараў было БГТ, а адным з асноўных дакладчыкаў В.С.Аношка.

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Інстытут геалагічных навук
ВЫТВОРЧАЕ АБ'ЯДНАННЕ "БЕЛГЕАЛОГІЯ"
БЕЛАРУСКАЕ ГЕАЛАГІЧНАЕ ТАВАРЫСТВА
БЕЛАРУСКАЕ ГЕАГРАФІЧНАЕ ТАВАРЫСТВА
БЕЛАРУСКАЯ КАМІСІЯ ПА ВЫВУЧЭННІ ЧАЦВЯРЦІЧНАГА ПЕРЫЯДУ І ГЕАМАРФАЛОГІІ
РЭСПУБЛІКАНСКІ ФОНД БРАТОЎ ГАРЭЦКІХ

Міжнародная навуковая канферэнцыя
"Жыццё і дзейнасць акадэміка Гаўрылы Іванавіча Гарэцкага"
*(Да 100-годдзя з дня нараджэння)*
10 – 12 красавіка 2000 г.

**ЗАПРАШЭННЕ І ПРАГРАМА**

*Мінск*

**ПРАГРАМА**

**10 красавіка**

*(пр. Ф.Скарыны, 66)*

$9^{00}$ – $10^{00}$ рэгістрацыя ўдзельнікаў канферэнцыі

$10^{00}$ адкрыццё канферэнцыі

**Уступнае слова.** Прэзідэнт НАН Беларусі акадэмік ***А.П.Вайтовіч***

**Жыццё і дзейнасць Гаўрылы Іванавіча Гарэцкага:**

Перыяд 1900 – 1931 гг. Прэзідэнт Беларускага геаграфічнага таварыства доктар геаграфічных навук, прафесар ***В.С.Аношка***;

Перыяд 1931 – 1988 гг. Прэзідэнт Беларускага геалагічнага таварыства член-карэспандэнт ***А.А.Махнач***

**Выступленні прадстаўнікоў навуковых і грамадскіх арганізацый Беларусі і іншых краін. Успаміны.**

***Акадэмік-сакратар*** Аддзялення хімічных навук і навук аб Зямлі НАН Беларусі акадэмік ***І.І.Ліштван***

***Акадэмік-сакратар*** Аддзялення гуманітарных навук НАН Беларусі акадэмік ***А.І.Падлужны***

***Віцэ-прэзідэнт*** Міжнароднай асацыяцыі па вывучэнні чацвярцічнага перыяду (INQUA) прафесар ***Л.Маркс*** (Польшча)

23 красавіка 2000 г. прайшла студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная 100-годдзю першага Прэзідэнта БГТ акадэміка І.С.Лупіновіча. Удзел прымалі студэнты не толькі БДУ, а і другіх навучальных устаноў г.Мінска. На геафаку БДУ былі аформлены стэнды, распавядаючыя пра жыццё і навуковую дзейнасць вучонага.

27 красавіка 2000 г. адбыўся сумесны сход членаў аддзялення фізічнай геаграфіі і геаэкалогіі, на якім былі заслуханы даклады: Г.С.Гігевіч

“Вышэйшыя водныя расліны Беларусі, іх выкарыстанне і ахова”; І.І.Кірвель “Сажалкі – як геасістэмы”. Прысутнічала 26 чалавек.

Пасяджэнне Вучонага савета БГТ 15 мая 2000 г. было прысвечана абмеркаванню праекта экспедыцыі “Палярнае кола”. Аб праграме і праекце маршрута “Палярнае кола” расказаў кіраўнік экспедыцыі член БГТ В.Н.Драбо. Выступілі В.М.Яцухна, П.С.Лопух, В.С.Аношка. Вырашылі аказваць неабходную дапамогу В.Н.Драбо пры падрыхтоўцы экспедыцыі; прапанаваць уключыць у праграму экспедыцыі пытанні ўдзелу выхадцаў з Беларусі ў асваенні поўначы Расіі.

Зацверджаны эскізы значкоў і Грамат ГА БГТ і рэкамендаваны для вырабу (адказныя П.С.Лопух, А.А.Макарэвіч).

22 мая 2000 г. адбылася сустрэча студэнтаў і супрацоўнікаў геаграфічнага факультэта БДУ з кіраўнікам беларускай экспедыцыі ў Антарктыду (1999 г.) і рыхтуемай экспедыцыі на паўночны полюс (кіраўнік Драбо В.Н.). Даклад В.Н.Драбо дапоўніўся праглядам відэафільмаў і другімі матэрыяламі з месцаў падарожжаў.

У чэрвені 2000 г. адбыліся мерапрыемствы, прысвечаныя 100-годдзю І.С.Лупіновіча. БГТ сумесна з Беларускім глебазнаўчым таварыствам і Аграрнай акадэміяй навук Беларусі ў актавай зале НДІ глебазнаўства і аграхіміі праведзена навуковая канферэнцыя, у якой прынялі ўдзел больш за 100 чалавек. Адбылося выязное пасяджэнне на радзіме І.С.Лупіновіча – в.Шацк Пухавіцкага раёна. У мітынгу, які адбыўся ў Шацкай сярэдняй школе, прымалі ўдзел мясцовыя жыхары, вучні, настаўнікі, прадстаўнікі раённай і мясцовай улад. На будынку школы ўсталявалі мемарыяльную дошку. У раённым музеі адкрылася выстава навуковых прац, прысвечаная І.С.Лупіновічу, музею перададзены некаторыя дакументы і кнігі, якія датычацца жыцця і дзейнасці І.С.Лупіновіча.

2-4 чэрвеня 2000 г. Вучоны савет ГА БГТ сумесна з Верхнядзвінскім райвыканкамам Віцебскай вобл. арганізавалі Міжнародны навуковы семінар, прысвечаны 155-годдзю з дня нараджэння І.Д.Чэрскага. Семінар праходзіў у краязнаўчым музеі І.Д.Чэрскага (в. Валынцы, Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл.). У арганізацыйны камітэт уваходзілі: І.І.Пірожнік, В.С.Аношка, М.М.Брылеўскі, Б.Ф. Шымук, В.Я. Якаўлеў.



**АРГАНІЗАЦЫЙНЫ КАМІТЭТ**

1. **ПІРОЖНІК І.І.** - дэкан геаграфічнага факультэта. (старшыня)
2. **АНОШКА В.С.** - загадчык кафедры глебазнаўства і геалогіі
3. **БРЫЛЕЎСКІ М.М.** - нам.дэкана геаграфічнага факультэта па навуковай рабоце
4. **ШЫМУК Б.Ф.** - дырэктар Валынецкага краязнаўчага музея І. Д Чэрскага
5. **ЯКАЎЛЕЎ В.Е.** - нам. старшыні Верхнядзвінскага райвыканкама

**Рэгламент работы семінара**

2.06.2000 г. - заезд удзельнікаў, размяшчэнне
3.06.2000 г. - навуковыя даклады
4.06.2000 г. - навукова-пазнавальныя экскурсіі, ад'езд удзельнікаў

Навуковыя даклады – 20 хвілін.

Рабочая мова семінару - беларуская, руская

**Аргкамітэт**

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ**

**БЕЛАРУСКАЕ ГЕАГРАФІЧНАЕ ТАВАРЫСТВА**

**ВЕРХНЯДЗВІНСКІ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ**

**ЗАПРАШЭННЕ**
**І**
**ПРАГРАМА**

**МІЖНАРОДНАГА НАВУКОВАГА СЕМІНАРА**

**ПРЫСВЕЧАНАГА 155-годдзю з ДНЯ НАРАДЖЭННЯ І.Д. ЧЭРСКАГА**

**2-4 чэрвеня 2000 г.**

**МІНСК**
**2000 г.**

У рабоце семінара прынялі ўдзел настаўнікі, работнікі райвыканкама, мясцовыя жыхары. У заключэнні семінара адбыўся мітынг і ўскладанне кветак да мемарыяльнага помніка – каменя І.Д.Чэрскага.

На зваротным шляху ўдзельнікі семінара наведалі нацыянальны парк “Браслаўскія азёры” і мелі сустрэчу з кіраўніцтвам парка. Дасягнута дамоўленнасць адносна супрацоўніцтва географаў і навуковых работнікаў нацыянальнага парка.

У чэрвені-ліпені 2000 г. на базе ГА БГТ праходзіла падрыхтоўка каманды школьнікаў да ўдзелу ў Міжнароднай алімпіядзе па геаграфіі, якая праходзіла ў г.Сеуле 14-16 жніўня. Алімпіяда была прымеркавана да 29 Кангрэса Міжнароднага геаграфічнага саюза. Каманду беларускіх школьнікаў рыхтаваў і ўзначальваў В.С.Аношка. Каманда заняла шостае месца.

12 кастрычніка 2000 г. на пасяджэнні Прэзідыума Вучонага савета БГТ былі разгледжаны вынікі работы 29 Кангрэса Міжнароднага геаграфічнага саюза (даклад В.С.Аношка) і вызначаны шляхі падрыхтоўкі да наступнага кангрэса (2004 г. г.Глазго, Вялікабрітанія).

Разгледжаны вынікі ўдзелу членаў БГТ у іншых навуковых міжнародных мерапрыемствах (дакладчыкі А.М.Вітчанка, Л.А.Лісоўскі, В.Л.Белая).

Азнаёміліся і зацвердзілі праграму рэспубліканскага семінара “Стан і шляхі ўдасканалення адукацыі ў перыяд рэфармавання”.

31 кастрычніка – 3 лістапада 2000 г. праходзіла Міжнародная навуковая канферэнцыя “Навуковыя і прыкладныя аспекты ацэнкі змяненняў клімата і выкарыстання кліматычных рэсурсаў”, прысвечаная 90-годдзю з дня нараджэння А.Х.Шкляра.



БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНИВЕРСИТЕТ

ПРИГЛАСИТЕЛЬНЫЙ БИЛЕТ
И ПРОГРАММА

Международной научной конференции

"НАУЧНЫЕ И ПРИКЛАДНЫЕ АСПЕКТЫ ОЦЕНКИ ИЗМЕНЕНИЙ КЛИМАТА И ИСПОЛЬЗОВАНИЯ КЛИМАТИЧЕСКИХ РЕСУРСОВ"

31 октября - 3 ноября 2000 г., Минск

Минск
2000

У канферэнцыі прынялі ўдзел больш за 100 чалавек , зроблена 46 дакладаў навукоўцаў Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы, Польшчы. 3 лістапада 2000 г. адбылася выязная навуковая сесія на радзіму А.Х.Шкляра (в. Магільнае Узденскага раёна). У краязнаўчым музеі г.Узды арганізавана экспазіцыя, прысвечаная жыццю і дзейнасці А.Х.Шкляра. Вышлі з друку матэрыялы канферэнцыі пад рэдакцыяй У.Ф.Логінава, П.А.Каўрыгі.

21 снежня 2000 г. прайшла навуковая канферэнцыя “Жыццё і дзейнасць вучонага, геадэзіста і географа генерал-лейтэнанта І.І.Ходзькі (1800 –1881 гг.)”.

Зроблена больш за 20 тэматычных дакладаў. Надрукаваны матэрыялы канферэнцыі. Арганізавана выстава геадэзічных прыбораў і электроннай карты г.Мінска і Рэспублікі Беларусь.

ТОПОГРАФИЧЕСКАЯ СЛУЖБА
ВООРУЖЕННЫХ СИЛ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

НАЦИОНАЛЬНАЯ АКАДЕМИЯ НАУК БЕЛАРУСИ

ГОСУДАРСТВЕННЫЙ КОМИТЕТ ПО ЗЕМЕЛЬНЫМ РЕСУРСАМ,
ГЕОДЕЗИИ И КАРТОГРАФИИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ

БЕЛОРУССКОЕ ГЕОГРАФИЧЕСКОЕ ОБЩЕСТВО

**ПРОГРАММА**

**НАУЧНОЙ КОНФЕРЕНЦИИ**

**"Жизнь и деятельность ученого, геодезиста
и географа генерал-лейтенанта
Иосифа Ивановича Ходзько
(1800 – 1881)"**



МИНСК-2000

Вырашана прадоўжыць правядзенне мерапрыемстваў, прысвечаных 200-годдзю І.І.Ходзькі, на яго радзіме ў Вілейскім раёне Мінскай вобл. (адказны І.А.Захаранка).

Вышаў з друку зборнік “Прыкладная лімналогія” вып.2, пад рэд. П.С.Лопуха.

На пасяджэнні Вучонага савета БГТ 11 студзеня 2001 г. абмеркаваны і адобраны вынікі работы савета ў 2000 г. Зацверджаны план мерапрыемстваў на 2001г. З прапановамі выступілі В.М.Яцухна, В.П.Казакевіч, П.С.Лопух, В.Л.Белая і інш. Савет узнагародзіў М.В.Лаўрыновіч і Н.К.Кліцунову Граматай БГТ за вялікі ўклад у развіццё геаграфічнай адукацыі ў сувязі з 65-годдзем з дня нараджэння.

Савет разгледзеў прапанову У.Н.Драбо прыняць у члены БГТ членаў экспедыцыі “Палярнае кола”. Пастанавілі: прыняць у члены БГТ Ю.І.Судака, В.В.Мазуркевіча, Н.П.Тукана, А.М.Барысава, М.М.Дубовіка, А.Э.Шэіна, В.В.Радкевіча, У.Н.Драбо, вызваліўшы іх ад уступных і членскіх узносаў.

У Палацы Рэспублікі адбыліся ўрачыстыя провады ўдзельнікаў першага этапа экспедыцыі “Палярнае кола”. На мітынгу выступілі М.І.Дзямчук, Ф.К.Салянік, В.С.Аношка, прадстаўнікі арганізацый-спонсараў, члены экспедыцыі. Усім удзельнікам экспедацыі В.С.Аношка ўручыў членскія білеты БГТ.

Вучоны савет пастанавіў стварыць інфармацыйны бюлетэнь “Геаграфічны веснік” БГТ. Зацверджана рэдакцыйная калегія, якой даручана распрацаваць правілы для аўтараў.

На сакавіцкім 2001 г. пасяджэнні аддзялення геаэкалогіі заслуханы навуковы даклад А.П.Раманкевіча “Трансфармацыя рэльефа меліяраваных ландшафтаў Беларускага Палесся”. Прысутнічала больш за 30 чалавек.

20 сакавіка 2001 г. на пашыраным пасяджэнні аддзялення эканамічнай геаграфіі выступіў Г.У.Рыдзеўскі з дакладам “Эканоміка-геаграфічная ацэнка ўстойлівасці развіцця рэгіёна (на прыкладзе Магілёўскай вобл.). Прысутнічала больш за 40 чалавек.

14 сакавіка 2001 г. адбыўся агульны сход географаў Беларусі, адміністрацыі БДУ, прадстаўнікоў іншых устаноў, прысвечаны 80-годдзю В.П.Якушкі. Вучоны савет БГТ узнагародзіў В.П.Якушку Ганаровай граматай.

На пасяджэнні Вучонага савета БГТ 26 красавіка 2001 г. вырашана правесці навуковыя чытанні К.І.Лукашова ў маі 2001 г. Адказным за чытанні назначыць А.В.Лукашова. Савет узнагародзіў І.П.Галая Ганаровай граматай БГТ за вялікі ўклад у развіцці геаграфічнай адукацыі.

26-28 верасня 2001 г. праведзена Міжнародная навуковая канферэнцыя “Тэарэтычныя і прыкладныя праблемы геаэкалогіі”, прысвечаная 80-годдзю БДУ і 110- годдзю з дня нараджэння А.А.Смоліча. Канферэнцыя адначасова праходзіла ў БДУ і Магілёўскім дзяржаўным універсітэце. Магілёўскую канферэнцыю вырашана лічыць Першым Смолічаўскім семінарам. У пастанове, прынятай канферэнцыяй, прапанавана рэкамендаваць правядзенне

навуковых канферэнцый і палявых семінараў па геаэкалогіі кожныя 2-3 гада. Выйшлі з друку тэзісы дакладаў канферэнцыі “Тэарэтычныя и прыкладныя праблемы геаэкалогіі”пад рэд. А.М.Вітчанкі і матэрыялы канферэнцыі “Смоліч і яго час” (Магілёў, 2001 г., пад рэдакцыяй І.М.Шарухі).

На пасяджэнні Вучонага савета БГТ 16 кастрычніка 2001 г. разглядалася пытанне падрыхтоўкі да 30 Кангрэса Міжнароднага Геаграфічнага Саюза (г.Глазго, жнівень, 2004). Вырашылі захаваць традыцыю, якая склалася ў Беларусі, калі Беларускае Геаграфічнае таварыства прадстаўляе адначасова і Нацыянальны камітэт географаў, а члены Вучонага савета БГТ складаюць Бюро Нацыянальнага камітэта.

Заслухана справаздача Магілёўскага і Брэсцкага аддзелаў БГТ.

Вучоны савет БГТ вырашыў стварыць секцыю ўсходазнаўства (кіраўнік І.А.Захаранка). Свае намаганні секцыя павінна накіроўваць на высвятленне адносін Беларусі з усходнімі краінамі, якія вывучаліся беларускімі даследчыкамі.

27-30 лістапада 2001 г. праведзена Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя “Сучасныя праблемы геаграфічнай адукацыі школ і ВНУ і тапанімічных даследаванняў”, прысвечаная Прэзідэнту БГТ (1974-1983гг.) В.А.Жучкевічу. Адкрыў канферэнцыю старшыня аргкамітэту І.І.Пірожнік. На пленарным пасяджэнні з дакладам выступілі В.П.Якушка, А.В.Ефрэменка (Жучкевіч), З.Я.Андрыеўская, В.С.Аношка, І.І.Пірожнік, В.Н.Кісялёў. Працавала тры секцыі: 1. Вышэйшая геаграфічная адукацыя на сучасным этапе; 2. Сярэдняя геаграфічная адукацыя на сучасным этапе; 3. Тапанімічня даследаванні. На секцыях з дакладамі выступілі больш за 40 чалавек. Выйшаў з друку зборнік тэзісаў дакладаў канферэнцыі пад рэдакцыяй В.Н.Кісялёва “Современные проблемы школьного и вузовского географического образования и топонимических исследований”.

На пачатку 2002 г. выйшаў з друку пазачарговы зборнік “Прыкладная лімналогія”, прысвечаны 80-годдзю В.П.Якушкі пад рэд. П.С.Лопуха.

На пасяджэнні Вучонага савета БГТ 12 студзеня 2002 г. зацверджаны план асноўных мерапрыемстваў БГТ на 2002 г. Заслухана інфармацыя В.С.Аношкі аб падрыхтоўцы да рэгіянальнай канферэнцыі Міжнароднага Геаграфічнага саюза (жнівень, 2002, г.Дурбан, ЮАР).

За вялікі ўклад у развіццё геаграфічнай навукі і адукацыі Вучоны савет БГТ узнагародзіў Ганаровымі граматамі БГТ – А.Е.Агаханянца , В.Я.Навуменку; граматамі В.Г.Хамякова , М.А.Верзуна.

15 лютага 2002 г. адбылося пашыранае пасяджэнне аддзялення геаэкалогіі БГТ, на якім разгледжана дысертацыйная работа С.А.Хоміч “Геаэкалагічныя асновы воднагаспадарчай рэкультывацыі кар’ерных прыродных комплексаў Беларусі” на званне доктара геаграфічных навук (спецыяльнасць 25.00.36 – геаэкалогія). Выступілі: В.С.Аношка, А.М.Вітчанка, Г.І.Марцынкевіч, В.М.Губін, В.П.Якушка, М.Г.Ясавееў. Вырашана рэкамендаваць дысертацыю С.А.Хоміч для абароны на Вучоным савеце БДУ.

На пашыраным пасяджэнні аддзялення фізічнай геаграфіі 19 сакавіка 2002 г. і членаў Вучонага савета БГТ заслуханы навуковы даклад К.В.Кісялёвай “Дэндраіндыкацыя прыродных працэсаў па дадзеных прасторавай і часовай зменлівасці па дадзеных прыросту елкі еўрапейскай “. Вырашана прапанаваць работу К.В.Кісялёвай да абароны на Савеце БДУ.

Пасяджэнне Вучонага савета БГТ 18 красавіка было прысвечана абмеркаванню мерапрыемстваў, звязаных з 200-годдзем з дня нараджэння І.Дамейкі. Святкаванне будзе праходзіць на радзіме І.Дамейкі і месцах связаных з яго імем. Мерапрыемствы плануюцца сумесна з НАН Беларусі і мясцовымі органамі кіравання. Пастанавілі прыняць актыўны ўдзел у мерапрыемствах. Выступіць з інфармацыяй аб жыцці і дзейнасці І.Дамейкі перад студэнтамі і школьнікамі.

18 красавіка 2002 г. адбыўся агульны сход членаў БГТ, прысвечаны вынікам экспедыцыі “Палярнае кола”. З вялікім дакладам выступіў кіраўнік экспедыцыі У.Н.Драбо. Паказаны відэа- і слайдфільмы, якія потым прэзентаваны БГТ. У сходзе ўдзельнічалі больш за 40 чалавек.



Национальная белорусская экспедиция «Полярное кольцо»

Белорусское географическое общество

Благодаря Вашей поддержке успешно завершен первый этап национальной белорусской экспедиции «Полярное кольцо», во время проведения которой были продемонстрированы мировой общественности промышленный и спортивный потенциал Республики Беларусь.

В настоящее время готовятся к изданию альбом-книга и видео-сериал по материалам экспедиции, в которых ваша организация найдет достойное место.

Выражаем признательность за оказанную помощь и надеемся на дальнейшее взаимозаинтересованное сотрудничество.

Заместитель Премьер-министра Республики Беларусь, председатель оргкомитета экспедиции

М.И.Демчук

Президент белорусского фонда поддержки экстремальных экспедиций «Полюс», руководитель экспедиции

В.Н.Драбо

Пасяджэнне майскага 2002 г. Вучонага савета БГТ было прысвечана пытанням арганізацыі даследчых работ па тэме: "Гісторыя геаграфічнага вывучэння Далёкага Усходу (XVI – XX ст.)". З дакладам выступіў І.А.Захаранка. Пастанавілі аказаць садзеянне І.А.Захаранку і яго супрацоўнікам у рабоце з матэрыяламі Дзяржархіваў, музеяў, аддзелаў РГТ, навукова-даследчых інстытутаў і іншых устаноў Сібіры і Далёкага Усходу.

Прапанавана паслаць віншаванне А.Р.Ісачанку ў сувязі з яго 80-годдзем.

Рашэннем Вучонага савета БГТ частка бібліятэчнага фонда (20 кніжак і 28 часопісаў) перададзенаМагілёўскаму абласному аддзелу. Акрамя таго, аддзелу перададзены значкі і памятны медаль П.П.Сямёнава-Цянь-Шанскага.

15 кастрычніка 2002 г. прайшоў агульны сход географаў БДУ і БДПУ, арганізаваны Вучоным саветам БГТ і прысвечаны 120-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа. Адбылася прэзентацыя кнігі "Новая зямля". На прэзентацыі выступілі У.Гілеп (старшыня Беларускага фонда культуры), В.Шаранговіч (народны мастак Беларусі), М.Мушынскі (член-кар.НАН Беларусі), студэнты і супрацоўнікі БДУ.

19 кастрычніка 2002 г. раптоўна памёр член Вучонага Савета БГТ, Ганаровы член ГТ СССР прафесар Акмір Егішавіч Агаханянц.

2 лістапада 2002 г. рашэннем Вучонага Савета БГТ прынята рашэнне аб перадачы асабістых бібліятэк В.А.Дзяменцева (781 кніга) і В.А.Кавалёва (304 кнігі), якія былі падараваны БГТ, у чытальную залу геаграфічнага факультэта БДУ. Савет атрымаў падзяку ад дырэктара фундаментальнай бібліятэкі БДУ П.М.Лапы.

3 снежня 2002 г. на агульным сходзе членаў БГТ выступіў з навуковым дакладам прафесар К.С.Лосеў (г.Масква). Тэма даклада: "Эколага-геаграфічныя аспекты ўстойлівага развіцця". У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел: А.А.Макарэвіч, П.А.Каўрыга, В.С.Хоміч М.М.Брылеўскі, В.М.Яцухна, В.С.Аношка. Прысутнічала больш за 40 чалавек.

27 снежня 2002 г. адбыўся агульны сход членаў БГТ, прысвечаны прэзентацыі кнігі І.Дамейкі "Мае падарожжы". У прэзентацыі ўдзельнічалі А.Пашкевіч (старшыня СП Беларусі), М. Скобла (паэт), Э.Акулін (бард, паэт), К.Цвірка (пісьменнік), А.Мальдзіс (гісторык, пісьменнік), супрацоўнікі культурна-асветніцкага цэнтра імя Ф.Скарыны. Прысутнічала больш за 50 чалавек. Акрамя гасцей выступілі І.І.Піражнік і В.С.Аношка.

На студзеньскім пасяджэнні Вучонага савета БГТ падведзены вынікі працы за 2002 год і зацверджаны мерапрыемствы на 2003 г.

24 студзеня на пашыраным сходзе членаў аддзялення фізічнай геаграфіі БГТ заслуханы навуковы даклад С.Кузьміна "Геамарфалагічная ацэнка тэрытарыяльнай арганізацыі аграрнага прыродакарыстання Беларусі". Выступілі: В.М.Яцухна, В.С.Аношка, П.С.Лопух і інш. У пасяджэнні ўдзельнічала больш за 20 чалавек.

25 лютага 2003 г. на пашыраным паседжанні аддзялення "Эканамічнай геаграфіі" БГТ адбылося абмеркаванне кандыдацкай дысертацыі А.І.Тарасёнка "Эканоміка-геаграфічная аптымізацыя турысцкага выкарыстання прыродаахоўваемых тэрыторый". Выступілі: Г.С.Смалякоў,

Л.В.Казлоўская, І.І.Пірожнік і інш. Вырашана рэкамендаваць дысертацыйную работу А.І.Тарасёнка да абароны на Вучоным савеце БДУ.

Пасяджэнне Вучонага савета БГТ 26 лютага 2003 г. была прысвечана абмеркаванню мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да 50-годдзя БГТ, якое згодна маючыхся афіцыйных дакументаў, прыходзіцца на 19 сакавіка 2004 г. З прапановамі выступілі ўсе члены Вучонага савета БГТ. Яны прапанавалі: 1. Аношка В.С.- надрукаваць кожнаму члену Савета па аднаму артыкулу, прысвечанаму 50-годдзю БГТ; прасіць дэканат геафака БДУ сумясціць юбілейныя мерапрыемствы БГТ з мерапрыемствамі з нагоды 70-годдзя геафака БДУ; падрыхтаваць і выпусціць брашуру “Летапіс Беларускага геаграфічнага таварыства”. 2. Лопух П.С. – выдаць зборнік артыкулаў аб БГТ; выпусціць значкі і пасведчанні членаў БГТ. 3. Губін В.М. – выступіць у геалагічных выданнях і асабліва ў часопісе “Прыродныя рэсурсы”; зрабіць выставу матэрыялаў па метадах апрацоўкі інфармацыі геаэкалагічных даследаванняў. 4. Вітчанка А.М. – правесці канферэнцыю маладых вучоных і студэнтаў, прысвечаную юбілеям. 5. Хоміч В.С. – выдзеліць адзін дзень у агульным пасяджэнні, які прысвяціць БГТ. 6. Белая В.Л. – правесці злёт – семінар настаўнікаў геаграфіі, прысвечаны юбілейным датам. 7. Пракаповіч І.М. – правесці летні семінар настаўнікаў геаграфіі па юбілейнай тэматыцы. 8. Яцухна В.М. – даць інфармацыю ў часопіс “Геаграфія: праблемы выкладання”. 9. А.А.Макарэвіч – зрабіць агляд артыкулаў у навуковых часопісах па геаграфіі. 10. Шаруха І.М. – выпусціць інфармацыйны бюлетэнь: “Асобы, гісторыя Магілёўскага аддзела”, правесці круглы стол па тэме.

Вучоны савет прапанаваў: 1). В.С.Аношку, А.А.Макарэвічу, Г.А.Палюх, абагульніць усе прапановы і распрацаваць план мерапрыемстваў. 2).Аношку В.С. і Палюх Г.А. работу па складанню летапісу БГТ закончыць да лютага 2004 г.

2 сакавіка 2003 г. Прэзідыум Вучонага савета БГТ разгледзеў стан спраў у Магілёўскім аддзеле БГТ. І.М.Шаруха прадставіў пісьмо на імя Вучонага савета і выпіску з пратакола пасяджэння Вучонага савета Магілёўскага аддзела БГТ ад 18 лютага 2003 г. “Аб надзяленні Шарухі І.М. правамі прадстаўніка Магілёўскага аддзела ў Прэзідыуме Вучонага савета БГТ”. У абмеркаванні прынялі ўдзел: Г.С.Смалякоў, А.М.Вітчанка, П.С.Лопух, В.М.Яцухна, В.С.Аношка. Пастанавілі: інфармацыю прыняць да ўвагі, лічыць І.М.Шаруху прадстаўніком Магілёўскага аддзела БГТ у Прэзідыуме і Вучоным савеце БГТ.

20 сакавіка 2003 г. Вучоны савет БГТ зацвердзіў План мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні 50-годдзя БГТ. Вырашана да з’езда БГТ у абласных аддзелах правесці юбілейныя мерапрыемствы па планам аддзелаў. Савет разгледзеў прапанову дэканата геафака БДУ і ўзнагародзіў студэнтаў-выдатнікаў: Д.М.Курловіча – Граматай БГТ і кнігай “За даляглядамі Айкумены”; В.А.Кірэева, С.Г.Мышлякова, В.А.Кухарчыка, А.С.Махакеева, Я.А.Васільчанку – памятнымі сувенірамі.

7 красавіка 2003 г. адбыўся агульны сход членаў БГТ, прысвечаны 95-годдзю з дня нараджэння А.В.Дзяменцева. У парадку дня даклады: 1. В.С.Аношка “Дзейнасць прафесара В.А.Дзяменцьева на пасадзе Старшыні БГТ (1962-1974 гг.); 2. Г.І.Марцынкевіч, Н.К.Кліцунова “Беларуская навуковая школа В.А.Дзяменцева па ландшафтазнаўству”; 3. М.А.Фалалеева “Тыпалагічны падыход да вывучэння гарадскіх ландшафтаў”. Выступілі: В.П.Якушка, дзеці і ўнукі В.А.Дзяменцева. Арганізавана выстава навуковых прац В.А.Дзяменцева. Прысутнічала 77 чалавек.

На гэтым жа сходзе членаў БГТ было разгледжана пытанне:”Аб рэарганізацыі школьнай адукацыі і аб месцы геаграфіі ў праекце новых вучэбных планаў”. Паведамленні зрабілі: Т.А.Кажамякіна, В.Л.Белая, І.П.Галай. Выступілі: В.С.Аношка, І.І.Піржнік, В.П.Якушка, П.С.Лопух, І.П.Галай, В.Л.Белая, І.І.Кірвель, А.А.Лепешаў, П.А.Каўрыга, М.М.Брылеўскі і інш. Сход вырашыў: 1. Накіраваць на імя Міністра адукацыі РБ П.І.Брыгадзіна і дырэктара Нацыянальнага інстытута праблем адукацыі зварот геаграфічнага грамадства. 2. Зацвердзіць тэкст зварота.

**Обращение**
**географической общественности к**
**Министерству образования**

Мы, белорусские ученые-географы, методисты, преподаватели и учителя, выражаем свою обеспокоенность тем, что в процессе реформирования школы географическому образованию уделяется недостаточно внимания.

География - классический общеобразовательный предмет, который дает представление об окружающем мире, позволяет изучить всю систему взаимодействия общества и природы.

География формирует у молодого человека мировоззрение и миропонимание, а также представление о месте Беларуси в современном сложном мире. Национальная идея в значительной степени формируется на географических знаниях. Знание родного края формирует чувства патриотизма у молодых граждан Республики Беларусь.

Развитие и укрепление международных связей потребует от следующих поколений граждан Беларуси глубоких знаний о географических особенностях каждого конкретного государства. Географии принадлежит важная роль в стратегии устойчивого развития государства, в интеграционных процессах и в решении возникающих сложнейших проблем взаимодействия природы и общества.

Современная школьная география в целом обеспечивает формирование географической культуры как составной части общей культуры человека. География наряду с языком, историей, математикой является классической, традиционной учебной дисциплиной. Географические знания нужны каждому культурному образованному человеку и эти знания не дает никакой другой учебный предмет.

Географические знания позволяют объяснить с научной точки зрения многие природные и общественные явления, ориентироваться в окружающем мире, содействуют расширению кругозора.

В школьной географии содержится много сведений из других наук, которые не изучаются в школе (геология, демография, социология, экономика и др.). Школьная география обеспечивает экономическую подготовку учащихся, дает целостное представление о хозяйстве, его отраслях, формах организации и размещении хозяйственной деятельности в различных природных и социально-экономических условиях Она имеет важное значение и в политехническом образовании, когда природные ресурсы рассматриваются с точки зрения возможности их использования в жизни и хозяйственной деятельности человека. Школьная география занимает ключевую роль в экологическом образовании; через ее содержание во всех классах проходит идея рационального природопользования и охраны природы. География как учебный предмет обеспечивает картографическую подготовку. Понимать, читать, знать карту – эти задачи решаются только на уроках географии. Умение пользоваться картой и картографической информацией равнозначно умению, читать, писать, считать и т.д.

География изучает чрезвычайно широкий круг вопросов (природную среду в глобальном, региональном и локальном аспектах), социальную среду, производственную и непроизводственную сферы, взаимодействие человека и природы. Другие школьные предметы  изучают лишь отдельные объекты качества (биология – органический мир Земли, физика – физические явления, химия – химические преобразования, обществоведение – общество). Лишь география, как учебный предмет, отличается комплексным подходом к изучаемым объектам, явлениям, процессам. Комплексность, территориальный подход – суть географического мышления. Такой подход необходим каждому образованному человеку.

По возможности развития межпредметных связей география превосходит другие школьные предметы. География как учебный предмет тесно связана с биологией, физикой, химией, историей, математикой, черчением, литературой. Изучение большинства школьных предметов опирается на географические знания учащихся, а зачастую география дает даже более полное представление об изучаемых другими предметами объектах (например, многообразие растительного и животного мира нашей планеты в связи с разнообразием  природных условий более полно раскрывает не  биология, а география). Незаменима география в организации внеклассной работы со школьниками, которая включает работы на школьной географической площадке, наблюдения за погодой, фенологические наблюдения, краеведческую работу и т.д.

Специалист, невладеющий  глубокими знаниями о родном крае, не являясь всесторонне развитой личностью, не может достойно представлять Беларусь за рубежом.

География - одна из фундаментальных наук, на которых держится познание окружающего мира. Географические специальности востребованы

современным обществом и получение их на географических факультетах вузов страны по-прежнему является желаемым и престижным для многих школьников, о чем свидетельствует традиционно высокий конкурс при поступлении на географические факультеты университетов (4-5 человек на место).

Белорусские школьники в последние годы успешно участвуют в международных олимпиадах по географии. Свой высокий уровень географических знаний и умений они подтвердили в 2003 г. на Международной олимпиаде в ЮАР, заняв 3-е командное место.

В школьном географическом образовании, бесспорно, есть проблемы, которые решаются в ходе реформирования школы. Предмет подвергается существенному совершенствованию, которое затрагивает структуру, содержание и методы его преподавания. Уже 5 лет в экспериментальных школах страны апробируются новые программы и учебно-методические комплекты по географии для 12-летней школы. Апробацию прошли УМК по начальному курсу географии (I и II части -6-7классы) и географии материков и стран (8-9 классы).

В советское время на изучение географии отводилось 12 часов в неделю, 68 часов на каждый курс, 340 часов за весь период обучения, в отдельные годы до 400 часов. Такая ситуация сохранялась и в Беларуси до 2000-2001 уч. года. Однако в прошлом учебном году положение школьной географии резко ухудшилось, так как в учебном плане время на изучение географии сократилось на 3,5 часа в неделю. Дальнейшее сокращение учебного времени до 1 часа в неделю фактически ведет к ликвидации географии как учебного предмета.

Под прежнее количество часов создавались новые учебники, дидактические и методические материалы по географии, которые прошли и продолжают проходить экспериментальную проверку. На создание учебно-методических комплексов затрачиваются значительные интеллектуальные и материальные ресурсы. Напомним, что учебник по начальному курсу географии для 5 класса (авторы И.П.Галай, Б.Н.Крайко) 2002 г. издания признан лучшим в нашей стране. Содержание учебника рассчитано на 2/1 час в неделю, отводимых на изучение предмета. Продолжается работа над созданием учебников по географии для 12-летней школы для других классов, которая будет завершена в срок.

В новом варианте проекта типового учебного плана базовой общеобразовательной школы географии отводится 7 часов (6 кл. – 1 час, 7 кл. -1час, 8 кл. – 2 часа, 9 кл. – 1час,10 кл.-2 часа). Количество часов, отведенное на изучение географии, не позволит реализовать ее потенциальные возможности как общеобразовательной дисциплины.

Мы поддерживаем обновление, которому должно подвергнуться школьное образование на новом этапе развития современного общества и с учетом новых требований к личности XXI века. Считаем, что в базовой школе должны изучаться систематические курсы географии, тогда как в начальной и средней школе, то есть на I и III ступенях обучения, возможны

и интегрированные курсы географии и других естественных и общественных предметов.

В числе первоочередных необходимо рассмотреть решение следующих вопросов:

1. Не допустить сокращения школьной географии как самостоятельной учебной дисциплины в общеобразовательной школе, которая играет важную роль в формировании мировоззрения.
2. Сохранить в каждом классе базовой общеобразовательной школы (с 6 по 12 класс) географию как самостоятельную учебную дисциплину с еженедельным объемом 2 часа в неделю.
3. В профильной средней школе гуманитарного и естественно-научного цикла предусмотреть в обязательном порядке учебные дисциплины географического профиля (конструктивная, социальная география, география туризма, экологическая география и др.) в объеме не менее 3,5-4,0 часов в неделю. Аналогичные дисциплины предусмотреть в учебных планах гимназий, колледжей, лицеев в зависимости от их профиля.
4. Учебные программы, другие нормативные документы направлять на первоочередное обсуждение в секцию «География» НМС Министерства образования Республики Беларусь.
5. Ввести в структуре Министерства образования должность инспектора по географическому образованию, передав в его ведение организационно- методические вопросы.

Обращение принято на общем собрании членов Белорусского географического общества (протокол № 3 от 07.04. 2003 г.)

Президент Белорусского географического общества,
д.г.н., профессор В.С.Аношко

Декан географического факультета БГУ,
д.г.н., профессор И.И.Пирожник

Декан естественного факультета МГПУ им. М.Танка,
доцент А.А.Лепешев

Лауреат Государственной Премии БССР,
Заслуженный деятель науки,
д.г.н., профессор
географического факультета БГУ Ф.Якушко

Заведующий кафедрой геодезии и картографии
географического факультета БГУ,
Заслуженный работник народного образования
Республики Беларусь, профессор Р.А.Жмойдяк

Заведующий кафедрой физической географии
материков и океанов и методики преподавания географии,
географического факультета БГУ
д.г.н., профессор В.Н.Киселев

Заведующий кафедрой общего землеведения
географического факультета БГУ, д.г.н. П.С.Лопух

Заведующий кафедрой физической географии
естественного факультета МГПУ им. М.Танка,
доцент И.И.Кирвель

Д.э.н., профессор кафедры экономической географии
Республики Беларусь и Государств Содружества, Л.В.Козловская

Методист высшей категории Учреждения образования
«Академия последипломного образования» В.Л.Белая

Начальник отдела экспериментальной работы
Центра общего среднего образования
научно-методического учреждения
«Национальный институт образования» Т.И.Кожемякина

25 мая 2003 г. на пасяджэнні Прэзідыума Вучонага савета БГТ разгледжаны два пытанні: 1. Аб мерапрыемствах па падрыхтоўцы да 50-годдзя БГТ і 70-годдзя геафака БДУ. 2. Падрыхтоўка навукова-практычнай канферэнцыі «Тэарэтычныя і прыкладныя пытанні вывучэння і выкарыстання глебава-земельных рэсурсаў». Па першаму пытанню зацверджаны пералік мерапрыемстваў, адказных за іх выкананне і тэрміны. Вырашана да з’езда БГТ правесці ў абласных аддзелах юбілейныя мерапрыемствы. Па другому пытанню заслухана інфармацыя арганізацыйнага камітэта аб падрыхтоўцы канферэнцыі. Зацверджаны склад рэдакцыйнай камісіі ў складзе: Аношка В.С., Чарныш А.Ф., Чартко М.К. Зацверджаны склад арганізацыйнага камітэта канферэнцыі ў складзе: І.І.Пірожнік (старшыня), В.С.Аношка, М.І.Смеян, Н.А.Гецэвіч, М.В.Клебановіч, А.А.Лепешаў, Р.С.Чалаў, А.Ф.Чарныш, М.К.Чартко Створана рабочая група: Л.В.Гур’янава, П.В.Жумар, А.В.Карпічэнка, Г.А.Палюх, В.А.Пульманоўская, Н.А.Чумакова. Вырашана падрыхтаваць праграму канферэнцыі да 4 чэрвеня.

20 чэрвеня 2003 г. Прэзідыум БГТ разгледзеў пісьмо Віцэ-прэзідэнта Міжнароднага геаграфічнага саюза М.Ф. Глазоўскага па імя Прэзідэнта НАН Беларусі М.В.Мясніковіча. Пісьмо тычылася ўдзелу Беларусі ў рабоце Міжнароднага геаграфічнага саюза. Пастанавілі звярнуцца з просьбай да Прэзідэнта НАН Беларусі М.В.Мясніковіча аб сустрэчы з дэканам геафака БДУ І.І.Пірожнікам, Прэзідэнтам БГТ В.С.Аношкам і акадэмікам

У.Ф.Логінавым (адказны У.Ф.Логінаў). Да гэтай сустрэчы падрыхтаваць матэрыялы аб стане геаграфічнай навукі ў Беларусі і праект Статута Нацыянальнага камітэта географаў Беларусі.

Вучоны савет БГТ абмеркаваў праект Палажэння аб Вышэйшай Атэстацыйнай камісіі (інфармацыя В.С.Аношкі). Выступілі П.С.Лопух, І.І.Пірожнік, М.М.Брылеўскі, В.М.Яцухна, В.С.Хоміч і інш. Вырашылі ўсе заўвагі абагульніць і ў выглядзе пісьма направіць на імя старшыні ВАК. Гэта было зроблена 26 чэрвеня 2003 г.

На пасяджэнні Прэзідыума БГТ 26 чэрвеня 2003 г. была зацверджана даведка аб удзеле беларускіх географаў у рабоце Міжнароднага саюза наступнага зместу:

**Справка**

об участии белорусских географов в работе
Международного Географического Союза

Международный географический Союз (МГС) был организован в 1922 г. в Бельгии представителями географических обществ, преимущественно европейских государств. Работа осуществляется посредством трех основных органов: Генеральная ассамблея, состоящая из представителей национальных географических комитетов: исполнительный комитет, избираемый на Международных географических конгрессах каждые четыре года; тематические комиссии и исследовательские группы. Между конгрессами проводятся Международные географические конференции, посвященные актуальным проблемам современности и географические олимпиады учащихся. В настоящее время в МГС входят более 90 стран.

Впервые Беларусь (БССР) была принята в МГС в 1957 году в составе СССР, когда АН СССР организовала Национальный комитет Советских государств, объединивший географов всех союзных республик. Материально-техническое обеспечение Национального комитета возлагалось на Институт географии АН СССР, для чего были выделены средства и штатные единицы. Представительские функции в Национальном комитете выполняли председатели и члены географических обществ. В этот период в работе конгрессов МГС приняли участие ведущие ученые-географы БССР (проф. В.А.Дементьев, акад. И.С.Лупинович, проф. И.И.Трухан (дважды), проф.Малышев и др.).

После распада СССР правопреемником Национального комитета советских географов стал Национальный комитет географов России, созданный РАН в 1992 г.

Беларусь вступила в МГС в 1994 г. Функции национального комитета выполняет Совет Белорусского географического общества, включающего представителей всех географических учреждений и организаций Беларуси. Такая практика не вызывает возражений у исполкома МГС и применяется государствами, где отсутствуют институты географии, а численный состав ученых-географов высшей квалификации (докторов наук) небольшой. Единственная проблема, которая решается с большим трудом – уплата ежегодного взноса (375 долл. США), так как географическое общество не располагает та-

кими средствами и приходится искать спонсоров. Белорусское географическое общество имеет всю необходимую для международной деятельности атрибутику: юридическую регистрацию, адрес, банковский счет, печать, зарегистрированную символику. Белорусские ученые приняли участие в 28 (Гаага, 1996) и 29 (Сеул, 2000) конгрессах МГС, идет подготовка к 30-му Конгрессу (Дублин, 2004), где они будут полноправными участниками при условии уплаты членских годовых взносов.

Начиная с 2000 года, в работе конгрессных и межконгрессных географических олимпиад, участвуют белорусские школьники. В 2002 году в Дурбане (ЮАР) на такой олимпиаде белорусы заняли третье место в мире.

Предпринимаемые попытки организации Национального комитета географов Беларуси показали, что основные трудности возникают на стадии регистрации в Минюсте и при этом требуются значительные материальные затраты.

Более активное участие НАН Беларуси в работе МГС способствовало бы повышению авторитета географической науки в самой академии и других научных учреждениях.

Задачи Национального комитета белорусских географов определяются как:

- представительство белорусских географов в Международных географических организациях;
- постоянный деловой контакт с Национальными комитетами других стран;
- информирование научной общественности о работе МГС и национальных комитетов других стран;
- подготовка и проведение международных мероприятий;
- развитие научных связей с иностранными географическими учреждениями, выполнение совместных научных тем.

В сложившейся ситуации просим рассмотреть возможность уплаты ежегодного взноса в МГС из фонда средств, выделяемых НАН на международную деятельность. В существующей системе управления наукой НАН является единственной организацией, на которую возложена общая координация академической, вузовской и отраслевой науки в Беларуси, их Международное представительство.

Директор Института проблем
использования природных ресурсов
и экологии, академик В.Ф.Логинов

Декан географического факультета
профессор И.И.Пирожник

Президент географического общества

Республики Беларусь, профессор В.С.Аношко
г.Минск,
26 июня 2003 г.

Савет зацвердзіў і рэкамендаваў да выдання Праграму і макет тэзісаў канферэнцыі «Тэарэтычныя і прыкладныя пытанні вывучэння і выкарыстання глебава-зямельных рэсурсаў».

9 ліпеня 2003 г. Вучоны савет БГТ абмеркаваў пісьмо начальніка Упраўлення грамадскіх аб'яднанняў Мінюста РБ М.М. Сухініна «Аб прадстаўленні інфармацыі і ўнясенні зменаў у Статут» (02.07.2003 г., №06-10/00236). У пісьме, акрамя пераліку неабходнай інфармацыі аб дзейнасці БГТ, сказана: «…у сувязі з прыняццем Пастановы Савета Міністраў РБ ад 16 мая 2003 г. №643 «Аб некаторых мерах па ўдасканаленню назваў пасад кіраўнікоў арганізацый і скарочаных назваў юрыдычных асоб прасілі б да 25 ліпеня разгледзіць пытанне аб змене назвы пасады кіраўніка аб'яднання, прадугледзеўшы ў якасці магчымых варыянтаў наступныя: генеральны дырэктар, загадчык, начальнік, старшыня, кіраўнік і інш…». Вучоны савет БГТ вымушаны быў пагадзіцца з просьбай Мінюста і прыняў пастанову аб перайменаванні пасады «Прэзідэнт ГА БГТ» у «Старшыня ГА БГТ».

16-20 верасня 2003 г. адбылася навукова-практычная канферэнцыя «Тэарэтычныя і прыкладныя пытанні вывучэння і выкарыстання глебава-земельных рэсурсаў». Усяго ў канферэнцыі прынялі ўдзел больш за 120 чалавек, у тым ліку замежных вучоных 47 чалавек. Адбылася навукова-тэматычная экскурсія ўдзельнікаў у Валожынскі раён Мінскай вобл. і на геастанцыю «Заходняя Бярэзіна».

23 кастрычніка 2003 г. на пасяджэнні Прэзідыума Вучонага савета БГТ прысутнічалі студэнты з Галандыі – члены Міжнароднай Еўрапейскай асацыяцыі студэнтаў-географаў (7), а таксама студэнты БДУ-члены БГТ. Пастанавілі: 1. Стварыць Беларускі аддзел Еўрапейскай асацыяцыі студэнтаў. 2. Прадстаўнікам ад Беларусі ў Еўрапейскай асацыяцыі адобрыць кандыдатуру М.Мандрык (ст.IV курса геафака БДУ); 3. М.Мандрык прыняць удзел у пасяджэнні Еўрапейскай асацыяцыі студэнтаў у Польшчы; 4. Распрацаваць Палажэнне беларускага аддзела Еўрапейскай асацыяцыі студэнтаў-географаў (адказныя М.Мандрык, В.Парамонаў).

Вучоны савет БГТ стварыў камісію па разгляду разыходжанняў у назвах населеных пунктаў, прапанаваных у якасці нарматыўных у даведніку «Назвы населеных пунктаў Рэспублікі». У склад камісіі ўвайшлі: В.С.Аношка, Л.В.Казлоўская,М.Л.Страха, Г.С.Смалякоў, В.М.Яцухна. Камісія правяла аналіз назваў Гродзенскай вобл. Савет накіраваў заключэнне камісіі ў Дзяржкартгеацэнтр.

20-24 кастрычніка 2003 г. праведзена Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Тэарэтычныя і прыкладныя праблемы сучаснай лімналоніі». У канферэнцыі прынялі ўдзел 120 чалавек, у тым ліку 27 замежных гасцей (Масква – 7, Навасібірск – 2, Іркуцк – 3, Краснадар – 1, Петразаводск – 1, С.-Пецярбург – 4, Смаленск – 2, Познань – 3, Гданьск – 1).

Пасяджэнне Прэзідыума Вучонага савета БГТ 25 лістапада 2003 г. было прысвечана пытанням: 1. Аб 45-годдзі Магілёўскага аддзела БГТ; 2. Аб стварэнні навукова-папулярнага часопіса «Геаграфія Беларусі». Па першаму пытанню выступіў І.М.Шаруха. Вырашылі прыняць удзел у святкаванні. Узнагародзіць Граматай БГТ І.М.Шаруху за актыўную і плённую працу ў БГТ.

Па пытанню стварэння навукова-папулярнага часопіса «Геаграфія Беларусі» выступіў П.С.Лопух. Па яго прапанове створана ініцыятыўная група: В.С.Аношка, В.Л.Белая, В.М.Губін, П.С.Лопух, А.І.Кліманаў, А.Я.Яротаў, А.В.Ганчароў, П.В.Жумар.

Заслухана інфармацыя І.М.Шарухі аб правядзенні ў сакавіку 2004 г. Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Рэгіянальная геаграфія. Праблемы развіцця і выкладання» (да 90-годдзя М.С.Ратабыльскага, 70-годдзя кафедры геаграфіі, 50-годдзю БГТ).

27-29 кастрычніка 2003 г. адбылася Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Карысныя выкапні Беларусі: геалогія радовішчаў і рацыянальнае недракарыстанне» (да 125-годдзя М.Ф.Бліядухі). Агульная колькасць удзельнікаў перавысіла 100 чалавек, у тым ліку 14 замежных удзельнікаў.

15 лістапада 2003 г. БГТ прыняло ўдзел у мерапрыемствах, прысвечаных 135-годдзю першай жанчыны-геолага Г.Б.Місуны (пас. Ветрына Полацкага района).

14 студзеня 2004 г. адбыліся пасяджэнні Вучонага савета БГТ на парадку дня якога былі наступныя пытанні: 1. Справаздачы аб рабоце Гомельскага аддзела БГТ. 2. Аб плане мерапрыемстваў, прысвечаных 50-годдзю БГТ. 3. Аб праграме 30-га Кангрэса Міжнароднага Геаграфічнага Саюза. 4. Рознае.

У сувязі з цяжкасцямі перырэгістрацыі Гомельскага аддзела і, улічваючы просьбу кіраўніцтва аддзела, вырашана справаздачу перанесці на больш позні час

Зацверджаны наступны план мерапрыемстваў на 2004 г., прысвечаны юбілею БГТ:

1. У абласных аддзелах правесці юбілейныя мерапрыемствы згодна маючых планаў (адказныя старшыні аддзелаў).
2. У аддзяленнях БГТ правесці наступныя мерапрыемствы:

- аддзяленне фізічнай геаграфіі (П.С.Лопух): расшыранае пасяджэнне, прысвечанае 75-годдзю праф. В.М.Шырокава (люты, 2004);
- аддзяленне аэракасмічных даследаванняў прыроды (В.М.Губін): правесці навуковыя чытанні, прымеркаваныя да Дня геолага (красавік, 2004);
- аддзяленне школьнай геаграфіі (В.Л.Белая): правесці летнік з настаўнікамі і школьнікамі (Паставы, чэрвень 2004); правесці семінар настаўнікаў (кастрычнік, 2004).

3. Усім членам Савета БГТ выступіць у друку, на радыё і тэлебачанні (адказныя В.С.Аношка, В.Л.Белая, А.М.Вітчанка, Л.А.Лісоўскі, Г.І.Пілавец).

4. Прыняць удзел у Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Рэгіянальная геаграфія: праблемы развіцця і выкладання» (г.Магілёў).
5. Падрыхтаваць і выдаць Летапіс БГТ (адказныя В.С.Аношка, Г.А.Палюх), правесці работу па вырабу значкоў БГТ (адказны П.С.Лопух).
6. Рэцэнзентамі Летапісу БГТ назначыць старэйшых членаў БГТ праф.В.П.Якушку і дац. Ф.С.Фешчанку.
7. Правесці з'езд БГТ у рамках мерапрыемстваў, прысвечаных 70-годдзю геафака БДУ (4-8 кастрычніка 2004г.).

В.М.Яцухна зрабіў падрабязнае асвятленне Праграмы 30-га Кангрэса Міжнароднага Геаграфічнага Саюза (15-20 жніўня 2004 г., г.Глазго). Дэвіз Кангрэса: «Адна Зямля – шмат міроў». Інфармацыйнае пісьмо і Праграма кангрэса пасланы ва ўсе аддзелы.

Савет БГТ вырашыў яшчэ раз звярнуцца ў Міністэрства адукацыі РБ з пісьмом аб лёсе геаграфіі ў Беларусі.

6 лютага 2004 г. адбылася сустрэча з кіраўніком Нацыянальнай беларускай экспедыцыі «Палярнае кальцо» В.Н.Драбо. Абмяркоўваліся праграма II этапа экспедыцыі (I этап адбыўся ў 2001 г.) і яе тэрмін па маршруту: Якуцк – Верхаянск – Чакурдах – Чэрскі – Певек – Анадыр – Уэлен – Берынгаў праліў – Аляска – Канада. Агульная працягласць маршрута 9240 км. Дэвіз экспедыцыі «Свет пазнае Беларусь – Беларусь пазнае свет». Асноўная задача экспедыцыі – аб'яднаць на мяжы стагоддзяў маршруты і дасягненні першапраходцаў Сібіры і Арктыкі – выхадцоў з Беларусі, пазнаёміць сусветнае грамадства з нашай краінай, яе гісторыяй, культурай, эканамічнымі дасягненнямі.

18 лютага 2004 г. адбылося пашыранае пасяджэнне аддзялення фізічнай геаграфіі і Савета БГТ, прысвечанае 75-годдзю праф. В.М.Шырокава. Выступілі: В.П.Якушка, П.С.Лопух, В.С.Аношка, В.В.Шырокава (дачка прафесара) і інш.

На пасяджэнні Прэзідыума БГТ абмяркоўвалася Праграма навуковай канферэнцыі, прысвечанай 70-годдзю геафака БДУ і 50-годдзю БГТ (далажыў А.М.Вітчанка).

Зацверджаны спіс Арганізацыйнага камітэта VII з'езда БГТ у складзе 18 чалавек (старшыня з'езда В.С.Аношка, вучоны сакратар з'езда – В.М.Яцухна). Зацверджана Інфармацыйнае паведамленне аб VII з'ездзе БГТ, якое разаслана ва ўсе падраздзяленні БГТ.

На пасяджэнні Прэзідыума БГТ 5 мая 2004 г. зацверджаны парадак правядзення VII з'езда і адказныя за яго падрыхтоўку. За падрыхтоўку з'езда адказны П.С.Лопух, за навуковую праграму і выданне тэзісаў дакладаў – А.М.Вітчанка, за запрашэнне ганаровых гасцей з'езда – В.М.Яцухна, за падрыхтоўку справаздачы – В.С.Аношка, Г.А.Палюх, А.А.Макарэвіч. Вырашана выдаць «Летапіс БГТ» да пачатку работы з'езда і рэалізоўваць яго ў час святочных мерапрыемстваў, прысвечаных 70-годдзю геафака БДУ і 50-годдзю БГТ.

27 мая 2004 г. адбылася сустрэча з кіраўніком экспедыцыі «Палярнае кальцо» В.Н.Драбо, абмяркоўваліся вынікі працы II этапа экспедыцыі.


За большой вклад в подготовку и проведение
Национальной арктической экспедиции
«Полярное кольцо»
от имени организационного комитета
выражаем

БЛАГОДАРНОСТЬ

Белорусскому
географическому обществу

*Ваша поддержка экспедиции, которая проходила под девизом «Арктика. По следам соотечественников», позволила успешно осуществить этот уникальный проект. Экспедиция способствовала укреплению дружбы между народами Беларуси и России, еще раз продемонстрировала всему миру, что Республика Беларусь, имеющая многовековую историю, обладает огромным интеллектуальным потенциалом, реальными достижениями в области науки и техники, культуры и спорта.*

*Заместитель Премьер-министра,*
*председатель оргкомитета*
*экспедиции* — *Владимир ДРАЖИН*

Минск, 2004

Вырашана правесці сустрэчу членаў экспедыцыі «Палярнае кальцо» з географамі ў верасні 2004 г. Аказана навукова-кансультацыйная дапамога ў афармленні і выданні вынікаў экспедыцыйных даследаванняў, праведзеных у сакавіку – маі 2004 г. на тэрыторыі паўночнай Сібіры.

7-8 верасня 2004 г. сумесна з Літоўскім Геаграфічным таварыствам і Інстытутам геалагічных навук НАН Беларусі праведзена навуковая канферэнцыя, прысвечаная прафесару Ч.П. Кудаба. Месца правядзення: вёска Рымзюны Астравецкага района Гродзенской вобласці, Культурны літоўскі цэнтр.

Савет БГТ быў саўдзельнікам праведзення навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 500-годдзю п. Ветрына Полацкага района – радзімы Г.Б. Місуны (17-18 верасня 2004 г. п.Ветрына).

2004 г. стаў годам падрыхтоўкі мерапрыемстваў, прысвечаных 70-годдзю геаграфічнага факультэта БДУ і 50-годдзю Беларускага Геаграфічнага таварыства.

На працягу ўсяго перыяду свайго суіснавання геаграфічны факультэт БДУ і БГТ дэманстравалі вялікія магчымасці сумеснага вырашэння задач, накіраваных на развіццё і павышэння аўтарытэта геаграфічнай навукі. І сімвалічна, што факультэт і БГТ адзначаюць свае юбілеі адначасова. Гэта дае магчымасць усебакова ацаніць шматгадовую плённую працу нашых вядомых географаў-членаў БГТ.